Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЖНІЎНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 148
(26261)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



У ПЕКІНЕ ЎРАЧЫСТА АДКРЫЛІСЯ XXIX ЛЕТНІЯ АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ

Шматмільённая армія аматараў спорту ўсёй планеты нарэшце дачакалася галоўнай падзеі спартыўнага чатырохгоддзя — Алімпіяды-2008 у Пекіне.

Час «Ч» настаў — 08.08.08, калі на пекінскім стадыёне «Птушынае гняздо» ў 8 гадзін 8 хвілін 8 секунд вечара па мясцовым часе пачалася ўрачыстая цырымонія адкрыцця XXIX летніх Алімпійскіх гульняў. На цырымоніі прысутнічаў Прэзідэнт Беларусі, кіраўнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта краіны Аляксандр Лукашэнка.

Такая колькасць васьмёрак невыпадковая: гэта лічба лічыцца шчаслівай у жыхароў Паднябеснай, і яны спадзяюцца, што маючая адбыцца Алімпіяда будзе ўдачнай ва ўсіх адносінах.

Спартыўную дэлегацыю Беларусі ў час параду ўзначаліў алімпійскі чэмпіён, а цяпер старшыня Беларускай федэрацыі фехтавання Аляксандр Раманькоў, які пранёс перад трыбунамі Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

На пекінскай Алімпіядзе Беларусь будуць прадстаўляць 182 атлеты, якія выступяць у 26 відах спорту. Усяго ў галоўным спартыўным форуме планеты прымуць удзел больш як 10,5 тыс. спартсменаў з 203 краін свету, яны разыграюць 302 камплекты ўзнагарод. Фаварытамі Алімпійскіх гульняў спецыялісты называюць каманды Кітая, ЗША і Расіі, якія даўно задаюць тон на самых буйных міжнародных спаборніцтвах. Што датычыцца беларусаў, то яны чацвёрты раз будуць удзельнічаць у летняй Алімпіядзе асобнай камандай. На трох папярэдніх беларускія спартсмены заваявалі ўвогуле 47 медалёў: 6 залатых, 15 сярэбраных і 26 бронзавых. Чатыры гады таму ў Афінах (як і ў Атланце-1996) у скарбонцы беларусаў было 15 алімпійскіх узнагарод, а ў Сіднэі-2000 беларуская каманда дабілася найвышэйшага поспеху, заваяваўшы 17 медалёў.

На гэтых Гульнях беларускія спартсмены пастараюцца паўтарыць поспех васьмігадовай даўнасці і ўвайсці ў першую дваццатку ў медальным заліку. Надзеі спецыялісты і балельшчыкі звязваюць, у першую чаргу, з лёгкаатлетамі Надзеяй Астапчук (штурханне ядра), Іванам Ціханам і Вадзімам Дзевятоўскім (кіданне молата), Ірынай Ятчанка (кіданне дыска), маладым дзесяціборцам Андрэем Краўчанкам. Па сілах замахнуцца на медалі штангістам і, вядома, двухразовай алімпійскай чэмпіёнцы па акадэмічным веславанні Кацярыне Карстэн. Дарэчы, у складзе беларускай зборнай у Пекіне выступяць і яшчэ тры алімпійскія чэмпіёнкі: Эліна Зверава, Яніна Праваліпская-Карольчык і Юлія Несцярэнка. Сярод членаў алімпійскай дружыны 26 заслужаных майстроў спорту, якія не раз уздымаліся на вышэйшыя прыступкі п'едэстала гонару на чэмпіянатах свету і Еўропы.

Свята сусветнага спорту прадоўжыцца ў сталіцы Паднябеснай да 24 жніўня. Дзякуючы трансляцыям на Першым канале і тэлеканале «ЛАД» (агульны аб'ём вяшчання складзе 229 гадзін) беларускія аматары спорту змогуць назіраць за спаборніцтвамі і перажываць за нашых спартсменаў.

БЕЛТА.

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Пекіна

«О, МІНСК!»

У міжнародным алімпійскім прэс-цэнтры (МРС), нягледзячы на адносную прахалоду, якую ствараюць дзесяткі кандыцыянераў, вельмі спякотна. З набліжэннем алімпіяды — у вялікай зале, разлічанай на 5 тысяч «папарацы», яблыку няма дзе ўпасці. Адзіная нязручнасць — кошт інтэрнэту. Ён па-ранейшаму застаецца «касмічным».

Эпіцэнтрам актыўнасці лічыцца імправізаваны базар, дзе калекцыянеры з многіх куткоў свету прапануюць тысячы значкоў з алімпійскай атрыбутыкай усіх пяці кантынентаў. Пекінская паліцыя скрозь пальцы глядзіць на наваспечаных «бізнэсменаў» і не імкнецца прыкрыць нелегальны гандаль.

Сталі звычнымі штодзённыя душэўныя ўсмешкі мясцовых валанцёраў-студэнтаў і гучнае «Монін» (добрай раніцы) ці «Па-ай» (пакуль). У адным з жылых карпусоў запрацаваў басейн з мікрасаўнай. Калі парылка пакуль пустуе, то водныя дарожкі на 27-м паверсе ўжо ажылі. Праўда, як ні дзіўна, але асноўныя наведвальнікі «швімінг пула» — рускамоўныя журналісты і кітайцы. Калі са славянамі ўсё зразумела — трэба скарыстаць любыя магчымыя выгоды на алімпіядзе, то з кітайцамі — не вельмі. Тым больш што асабліваў актыўнасці на вадзе яны паказваць не імкнуцца.

Набліжэнне алімпійскага агню да стадыёна «Птушынае гняздо» адчулі на сабе многія журналісты на ранішняй трапезе ў «вясковым» рэстаране. Кампетэнтная камісія з дзесятка чалавек прайшлася між сталоў, зазірнула ў талеркі і кубкі. Посуд, трэба сказаць, зроблены са шчыльнай паперы, а вось сталовыя прыборы — пластмасавыя. Прыход высокіх гасцей зусім не збянтэжыў галодных журналістаў. Нейкую разнастайнасць у гэтую працэсію ўнёс індыйскі аператар, які разам з калегам-каментатарам шукаў ахвотных выказацца наконт кітайскага «фуда», харчавання, значыць. У поле зроку індусаў трапіў і карэспандэнт «Звязды». Праўда, неглыбокія веды англійскай мовы (а па-нямецку азіят нічога не разумее) змянілі фармат размовы з эфірнага на нефармальны. «О, Мінск!» — засвяцціся твар індыйскага журналіста, калі той пачуў пра Беларусь, і выкінуў вялікі палец. Мне прыйшлося таксама адказаць кампліментам. «Над Дзялі я пралятаў, калі накіроўваўся ў Аўстралію, — адказаў я. — Цудоўны горад!» Надзіва, абодва суразмоўцы аказаліся задаволеныя адказамі.

У Пекіне па-ранейшаму спякотна і вялікая вільготнасць. Перамяшчацца пешшу — сабе даражэй. Таму мы па поўнай праграме выкарыстоўваем усе транспартныя паслугі. Ад журналісцкай вёскі да Міжнароднага прэс-цэнтра праз 20—30 хвілін курсіруюць аўтобусы, адтуль — на ўсе алімпійскія аб'екты. Па «вясковай» тэрыторыі бесперапынна раз'язджаюць электрамабілі з насадачнымі месцамі на 8—10 чалавек. Пакуль на тварах усіх без выключэння рэпарцёраў толькі радасныя выразы. А інакш і быць не можа — усе спаборніцтвы яшчэ наперадзе, так што засмучацца не даводзіцца.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

КОЛАЙ раскрытых душ і адзінаўдзяў
КОНКУРС «ЛЕПШАЯ СЯДЗІБА ГОДА»

«...НЕ ЧУВАЦЬ ТАМ ПРА АНГЛІЙСКІ ПАРЛАМЕНТ...»



Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Гаспадар сядзібы Аляксандр КРОЛ ля каменнага крыжа на Рагнедзіным кургане.

Прызнаюся, другі раз бяруся за артыкул пра гэту сядзібу. Першая спроба, тры гады таму, была няўдалай. А таму некаторы страх ахоплівае мяне і на гэты раз. Не падумайце, што сядзіба нецікавая. Наадварот, яна бадай што адна з самых арыгінальных на Беларусі. Проста тры гады таму я не здолела справіцца з валам інфармацыі і ўражанняў, якія прывезла з Расоншчыны. І яшчэ. У сядзібах, якія створаны для адпачынку, надзвычай цяжка працаваць. Там нервы, закручаныя ў Мінску ў тугую вяроўку, раптам расслабляюцца, ліхаманкавыя думкі некуды знікаюць, і хутка ты ловіш сябе на тым, што сядзіш у крэсле перад камінам, неабавязкова запаленым, рукі твае бязвольна ляжаць на падлакотніках, і рухацца зусім не хочацца, бо хо-ра-ша. Чамусьці нават не сорамна перад гаспадаром, якому ты на правах журналіста нічога не заплаціў, напэўна, сумленне таксама адпачывае.

Другі раз, і тры гады таму (дазвольце ўжо хоць часткова аддаць той доўг), і цяпер, да Аляксандра Крола ў Забор'е я выязджаю раніцай пасля начоўкі ў Клясціцах. І еду спачатку ў Расоны — сталіцу «паўночнага і дзікага бока Беларусі», як выказаўся пра гэтыя мясціны пачынальнік новай беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі. А ў Расонах і тады, і цяпер мы абавязкова наведваем сядзібу памешчыка Гласкі, пабудаваную на мяжы XIX—XX стагоддзяў на беразе аднайменнага возера ў акружэнні парку са стаўком. І зноў душа сціскаецца болем, як бачыш, што такі прыгожы і рэдкі для гэтых мясцінаў помнік архітэктуры, гэтая разынка Расоншчыны, пра якую знаўцы кажуць: «Мэта дойліда — стварыць уражальны знешні эфект — была тут дасягнутая», у занядбаным стане. Па-ранейшаму ў будынку месціцца Цэнтр дзіцячай творчасці, можа, гэта і добра, бо інакш, напэўна, засталіся б ад яго толькі рэшткі, як, на жаль, у многіх мясцінах па Беларусі. Аднак, відавочна, што сядзіба пакутуе ад недагляду, ад няўмелага рамонту, танная латання слядоў часу. Яшчэ больш горка робіцца, калі, прывабленыя святлом вялікага возера, ступаеш на масткі, што вядуць да рамантычнай альтанкі пасярод вады. Паміж жоўтых гарлачыкаў і чароту дзікія качаняты клічуць бацькоў, якія аддаліліся на сярэдзіну возера, яшчэ далей красуецца пара белых лебедзяў. Але тут жа, у вадзе ля масткоў, у альтанцы, горы смецця, пустых бутэлек, пакетаў з-пад чыпсаў і кірыешкаў, недакуркі і куча сланечнікавага шалупіння.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Сям'я ЛЮБІМАВЫХ з Масквы. Аляксей і Людміла ў «Кралавай хаце» ў другі раз, а Машачка — упершыню.

Фізічная геаграфія тут выглядае наступным чынам: круглы зямны шар, на адным баку якога знаходзіцца Вестмінстэрскі палац і ўсё, што з ім, а на супрацьлеглым — Расоншчына. Пра гэта пісаў яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя славуты выпускнік Полацкай езуіцкай акадэміі Ян Баршчэўскі, ураджэнец гэтых мясцінаў: *«Калі хто, будучы ў гэтым краі, узышоў на вяршыню Пачаноўскай гары і глядзеў на дзікія ваколіцы, што ляжаць навокал, дык бачыў, як азёры тут і там, нібы люстэркі, адбіваюць дзённы прамень, а над іх берагамі дрэмлюць густыя лясы, як дзе-нідзе на схілах чарнеюць бедныя сялянскія хаты; але не ўбачыш тут нідзе гарадскіх муроў, ні вежаў старога замка. Там чалавек забывае пра спрэчкі французскай палаты ў справе Егіпта і Турцыі, не чуваць там пра англійскі парламент, пра вайну з кітайцамі, не гамоняць там ні пра чыгункі, ні пра дзівосную вынаходку Дагера. І толькі голас пастушка, стрэл паляўнічага ў лесе або вецер, што гойсае ў вершалінах пушчы, парушаюць на хвіліну цішыню ваколіцы...»*

ПЕРШЫ МІЛЬЁН ТОН ХЛЕБА — У ЗАСЕКАХ МІНШЧЫНЫ

Працаўнікі гаспадарак Мінскай вобласці 8 жніўня з 45 працэнтаў пасяўных плошчаў сабралі першы мільён тон хлеба новага ўраджаю. Па ўраджайнасці збожжавых лідзіруе Нясвіжскі раён (65,2 ц/г), другое месца займае Мінскі раён (54,2 ц/г), трэцяе — за Клецкім раёнам (53 ц/г).

— Практычна ўсе сельскагаспадарчыя арганізацыі да ўборкі збожжавых падрыхтаваныя,— **адзначыў намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама Васіль ЕРМАКОВІЧ.** — Стрымліваюць уборку толькі надвор'е, ды недахоп добрых сушылак у некаторых гаспадарках вобласці. У кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі маецца сушылка, але іх прадукцыйнасць ужо значна меншая (бо будаваліся яны яшчэ пры савецкай уладзе), чым сушылак, якія мы зараз уводзім у эксплуатацыю (у гэтым сезоне — 24 сушылкі).

Паводле слоў Васіля Ермаковіча, зараз перад сельскімі гаспадаркамі Міншчыны стаіць задача атрымаць ураджай збожжавых культур не ніжэйшы за мінулагодні, а гэта прыблізна 2 мільёны тон.

— Скончыць уборку збожжавых культур мы плануем арыенціравана да 25 жніўня (камбайнеры з паўднёвых раёнаў выедуць на дапамогу паўночным раёнам), калі спатрэбіцца, будзем аказваць дапамогу і іншым абласцям.

— Сярэдняя зарплата нашага камбайнера на сёння складае ад 80 да 160 тысяч у дзень у залежнасці ад намалоту. Немалую ролю пры налічэнні зарплаты адыгрываюць і такія фактары, як марка камбайна і якасць уборкі.

Надзея ДРЫЛА.

Не курыць, не п'е, спартсмен? Камбайнер!

Камбайнер Аляксандр Жарнасек з Лепельскага раёна, яшчэ калі вучыўся ў пятым класе, разам з бацькам працаваў на камбайне. Аляксандр Рыгоравіч — перадавік. Наогул нейкі «ўнікум» у добрым сэнсе гэтага слова: не курыць, не любіць гарэлку, займаецца спортам. Болей бы такіх мужчын! Не сакрэт, што сярод вяскоўцаў такіх, на жаль, мала, бы і сярод гараджан нямнога. А які ён гумарыст! Да нашай размовы ноч не спаў — рамантаваў камбайн, да гэтага адпрацаваў добра ды без памочніка каля 14 гадзін.

Сустрэўся я з ім на жніве ля поля гаспадаркі «Заазер'е» — філіяла Лепельскага малочнакансервавага камбіната. Ён на сваім магутным «Палессі», вышынёй з двухпавярховы дом, ужо ўбраў адзін участак і ехаў па вясковай дарозе на другі.

— А дзе памочнік ваш?

— Дома ў мяне ў Стаях. Памочнік — сын мой Ілля. Вучыцца яшчэ. Ці будзе хлебаробам? Час пакажа. Ёсць у яго сапраўднае пасведчанне памочніка. Так што ўсё сур'ёзна. На жніве ён першы раз. Сёння без яго абыдуся. На тэхніцы сучаснай, калі яна спраўная, у прынцыпе аднаму не вельмі цяжка. Машына — звер! Хаця, вядома, бывае ўскакае. Вось вечарам прыйшлося раптам пачаць рамонт — транспарцёр «паляцеў». Справіўся адзін. Нічога, калі добра машыну ведаеш. Бацька мой Рыгор Сямёнавіч да 70 гадоў на камбайне працаваў. А чым я горшы? Мне вось ужо за 50 (смяецца), а ніхто не верыць. Молада выглядаю, бо не куру, гарэлку не ўжываю. Зразумела, выпіць магу чарку-другую, але мне гэта не падабаецца. Шчыра! У валейбол гуляю. У спартыўную залу наогул часта хаджу. Добрая ў нас у вёсцы зала, туды сын мой з задавальненнем ходзіць. Зімой на лыжах катацца мне вельмі падабаецца...

Аляксандр Рыгоравіч вельмі добры працаўнік. Адпаведна, і заробкі ў яго вялікія. Вось да ўборкі займаўся нарыхтоўкай кармоў. 2 мільёны зарабіў за месяц!

— На трактары працаваў. Сена вазіў. Калі працуеш, гарэлку не п'еш, ёсць магчымасць добрыя грошы атрымліваць. Праўда, зараз многія лёгкіх шляхоў шукаюць. І ўсе хочуць лёгкага хлеба, а яго не бывае! — разважае камбайнер. — А я стомленасці не адчуваю. Праўда, пагаліцца няма часу...

Паехаў Аляксандр Рыгоравіч далей. Да моманту нашай размовы ён ужо намалаціў каля 500 тон. Кіраўнік гаспадаркі Раман Міснік расказаў пра ўчарашні, сённяшні дзень і перспектывы прадпрыемства.

— Добрыя ў нас камбайнеры. Вось Духовіч быў першым «тысячнікам» за ўсю гісторыю Лепельскага раёна. Гогалеў — другім па чарзе. Агульная ўборачная плошча ў нас 1,5 тысячы гектараў. Ураджайнасць пшаніцы — да 55 цэнтнераў. Працуюць шэсць камбайнаў. Дзве сушылкі, адна з якіх польская (працуе на пячным паліве). Год добры для азімых...

— За два гады ў нас было па 5—7 будаўнічых брыгад. Дзве ў выніку працуюць пастаянна. Бо з астатнімі праблем хапала — мякка кажучы, дысцыпліна ў работнікаў была нізкая, — успамінае Раман Сямёнавіч. — Пабудавалі склад для захоўвання зерня, механізавалі раздачу кармоў. Ужо ў наступным годзе запрацуе новы комплекс на 1000 дойных кароў. Мы нядрэнна зарабляем на малацэ — 9 мільёнаў выручка штодня. Па 5 тысяч літраў малака дае кожная карова ў год. Даяркі зарабляюць па 800—900 тысяч беларускіх рублёў...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Лепельскі раён.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

22.08.2008 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства незавершенного строительством блокированного жилого дома (общ. пл. 3 712, 56 кв.м.) в д. Копище Минского р-на. Начальная цена составляет 6 022 121 580 бел. руб.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

УП «Минский городской центр недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ

В опубликованном в газете «Звязда» от 07.08.2008 г. № 146 на 11 сентября 2008 года извещении о проведении торгов по продаже квартир без отделки в доме № 26 по ул. Бельского в разделе «Размер задатка, руб.» по лоту № 23 **читать вместо суммы 9 450 000 — сумму 18 480 000.**

Телефоны «МАПИД» для справок: **вместо 207 14 77 следует читать 208 58 12.**

УНП 190398583

ГЭТЫЯ ВЫХАДНЫЯ БУДУЦЬ ДАЖДЖЛІВЫЯ

Атмасферны фронт, які перамяшчаецца на тэрыторыю Беларусі з Заходняй Еўропы, у суботу, 9 жніўня, пагоршыць умовы надвор'я ў краіне, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

Паводле слоў спецыяліста, у ноч на 9 жніўня па заходняй палавіне рэспублікі, а ўдзень на большай яе частцы чакаюцца дажджы, месцамі з навальніцамі. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах прагназуюцца моцныя дажджы. Магчымы град. Пры навальніцах чакаецца ўзмацненне ветру да 15—20 метраў у секунду. Пры гэтым тэмпература паветра ў ноч на суботу, 9 жніўня, будзе вагацца ад 11 градусаў цяпла на ўсходзе краіны да 19 градусаў вышэй за нуль на захадзе. Дзённая тэмпература складзе 20—26 градусаў цяпла. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях чакаецца да плюс 29 градусаў.

У ноч на нядзелю, 10 жніўня, у Беларусі будзе яшчэ дажджліва. У асобных раёнах Віцебскай і Мінскай абласцей пройдуць моцныя дажджы, месцамі з навальніцамі. Пры навальніцах моцны вецер.

Днём у нядзелю дажджоў будзе менш. Яны пройдуць толькі месцамі і будуць мець кароткатэрміновы характар. Паводле слоў спецыяліста, дажджы чакаюцца пераважна ва ўсходніх раёнах рэспублікі. Тэмпература паветра ў ноч на нядзелю складзе 12—17 градусаў цяпла. Удзень яна падымецца да 19—25 градусаў.

У далейшым на тэрыторыю Беларусі зноў пачне паступаць больш цёплае паветра з поўдня Еўропы. У панядзелак, 11 жніўня, у рэспубліцы ўсталюецца надвор'е пераважна без ападкаў. Толькі ноччу ў панядзелак у паўночна-заходніх раёнах, а ўдзень на паўднёвым усходзе магчымы невялікія дажджы. У дзённыя гадзіны паветра прагрэецца да 22—27 градусаў.

Да сярэдзіны тыдня будзе горача. Дзённая тэмпература павысіцца да 26—31 градуса цяпла. Чакаецца пераважна без ападкаў.

БЕЛТА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

№ лота	Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток
1	Одноэтажное кирпичное здание (состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, кран-балки)	851,1	г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5	431 085 000	10 %
2	Административное здание (2-этажное кирпичное)	474,9		516 108 000	10 %
3	Бокс гаражный	92,8		45 828 000	10 %
4	Шиферный склад	130,4		60 478 000	10 %
5	Незавершенное строительством законсервированное капитальное строение, 3-этажная кирпичная пристройка к корпусу № 17 «а»	1598,4	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	643 647 060	5 %

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **09 сентября 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08 сентября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ

о приостановлении реализации обращенного в доход государства цеха газорезки (общ. пл. 364 кв.м), расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2008 г.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВАЙНА Ў ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ

У ноч на 8 жніўня грузіна-асецінскае супрацьстаянне перарасло ў поўнамаштабны ваенны канфлікт. Грузінскія ўлады заявілі, што «сепаратысты не выконваюць рэжым спынення агню», і абвясцілі пра пачатак «аперацыі па аднаўленні канстытуцыйнага парадку» ў рэгіёне.

Для ўдараў па паўднёваасецінскіх пазіцыях была задзейнічана грузінская авіяцыя. Да сярэдзіны дня 8 жніўня грузінскія войскі занялі цэнтр Цхінвалі. Саўбез ААН, які сабраўся па патрабаванні Расіі, адмовіўся асудзіць Грузію. Каля 15:00, амаль адначасова з апублікаваннем заявы прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева аб намеры пакараць вінаватых у гібелі расійскіх грамадзян, у Паўднёвую Асецію ўвайшлі каля 150 расійскіх танкаў і бронетранспарцёраў. Расійская авіяцыя пачала бамбіць грузінскія пазіцыі. Грузінскія войскі пакінулі Цхінвалі.

Асада Цхінвалі грузінскімі войскамі працягвалася амаль 12 гадзін. У выніку артабстрэлаў, авіяналётаў і вулічных баёў знішчаны бальніца і іншыя аб'екты інфраструктуры, падарваны газаправод. У Цхінвалі ўвайшла калона расійскіх танкаў, асецінскім апалчэнцам удалося адцісnуць грузінскае войска са сталіцы непрызнанай рэспублікі. Нягледзячы на спыненне агню ў сталіцы Паўднёвай Асеції, дакладных дадзеных аб стратах сярод асецінскіх войскаў, міратворцаў і мірнага насельніцтва пакуль няма. Горад практычна цалкам разбураны, адключана электрычнасць і не хапае вады, не працуе стацыянарная тэлефонная сувязь. Мабільная сувязь таксама хутка спыніць працу, бо заражджаць сотавыя тэлефоны няма дзе.

У ЧЭХІІ ЦЯГНІК УРЭЗАЎСЯ Ў МОСТ, ЯКІ АБРЫНУЎСЯ

Дзесяць чалавек загінулі і не менш за сто пацярпелі ў выніку буйной чыгуначнай катастрофы, якая адбылася 8 жніўня ў Чэхіі.

Паведамляецца, што цягнік, што рухаўся з польскага Кракава ў Прагу, урэзаўся ў мост, які абрынуўся.. Аварыя адбылася каля 10.30 па мясцовым часе. Лакаматыў і тры вагоны ўрэзаліся ў рэшткі моста на хуткасці каля 140 кіламетраў у гадзіну.

Прадстаўнік чэшскай чыгункі ацаніў урон ад катастрофы як вельмі высокі.

Рэканструкцыя моста пачалася ў красавіку і павінна была скончыцца ў кастрычніку 2008 года.

АМЕРЫКАНЕЦ ПРЫЗНАЎСЯ Ў ЗАБОЙСТВЕ Ў АБМЕН НА ПІЦУ

Жыхар Нью-Ёрка прызнаў сябе вінаватым у забойстве ў абмен на сваю любімую ежу. 33-гадовы Трымейн Дзюрэм, арыштаваны ў 2006 годзе, настолькі стаміўся ад турэмнай ежы, што пагадзіўся даць прызнальныя паказанні, калі яму зменяць рацыён.

У выніку гэтай своеасаблівай здзелкі са следствам зняволены атрымаў піцу, марожанае, смажанае кураня, салату з капусты, бульбяное пюрэ і маркоўны пірог.

Як устанавіла следства, у чэрвені 2006 года Дзюрэм застрэліў супрацоўніка кампаніі, якой прадаў аптовую партыю марожанага. Прычынай канфлікту стала тое, што прадавец захацеў адмяніць здзелку, аднак пакупнікі не пагадзіліся вярнуць тавар. Удакладняецца, што Дзюрэм шукаў кіраўніка кампаніі, а супрацоўнік, які загінуў, трапіў яму пад гарачую руку. Суд прысудзіў яго да пажыццёвага зняволення. У той жа дзень Дзюрэм ажаніўся на 48-гадовай жыхарцы Нью-Ёорка. Наяўнасць сям'і дазволіць яму праз 30 гадоў прасіць аб умоўна-датэрміновым вызваленні. Пракурор, які вёў справу Дзюрэма, выказаў задавальненне здзелкай, заключанай з абвінавачваным. На думку юрыста, чыстасардэчнае прызнанне злачынцы пазбавіла суд ад неабходнасці разглядаць магчымыя апеляцыі на прыгавор.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08148

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.08.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 203,34
1 латвійскі лат	4 545,65
1 літоўскі літ	927,69
1 чэшская крона	131,49
1 польскі злоты	981,15
1 расійскі рубель	88,41
1 украінская грыўня	455,82

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,8782
10 UAH	51,3510
1000 BYR	11,2899
EUR	36,2996

Курс у гандлёвых кампаніях (на 8.08.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Беларуская АЭС будзе адпавядаць самым жорсткім крытэрыям бяспекі

Выбар Беларусі — вода-вадзяны тып рэактара трэцяга пакалення, якому аддаюць перавагу ва ўсім свеце (з 439 энергаблокаў, якія зараз эксплуатуюцца, 274 належаць да названага тыпу; 26 з 34, якія будуюцца, — таксама вода-вадзяныя). Як расказаў на прэс-канферэнцыі **намеснік генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута высокаэнергетычных даследаванняў «Сосны» НАН Беларусі Мікалай ГРУША,** атрыманы адказы на запыт беларускага боку аб будаўніцтве, якія ў дадзены час апрацоўваюцца.

У ядзерным рэактары тры бар'еры бяспекі, адзін з якіх вытрымлівае любыя знешнія ўздзеянні, у тым ліку падзенне самалёта. Паводле слоў навукоўца, у звычайных умовах работы энергаблока радыяцыйнае выпрамяненне адсутнічае і выхад радыеактыўных рэчываў у дзесяткі разоў меншы, чым ад вугальных станцый той жа магутнасці. Шматгадовая практыка назіранняў пацвярджае, што апрамяненне насельніцтва, якое пражывае ў зоне размяшчэння АЭС, мізэрнае. Яно складае долі працэнта ад натуральных крыніц радыяцыі, такіх, напрыклад, як касмічнае выпрамяненне ці прыродная радыеактыўнасць. Сусветная статыстыка сведчыць, што за ўсю гісторыю мірнага выкарыстання атамнай энергіі не было выпадкаў небяспечнага апрамянення насельніцтва ад АЭС падчас працы іх у нармальным рэжыме.

Але ў сучасных атамных электрастанцыях прадугледжана бяспека яшчэ і пры ўзнікненні няштатных і аварыйных сітуацый. Сучасныя сістэмы бяспекі кантралююць аварыі і выконваюць спыненне ядзернага рэактара і адвод цеплавой энергіі, абмежаванне распаўсюджвання радыеактыўных рэчываў. Побач з актыўнымі сістэмамі выкарыстоўваюцца і пасіўныя, якія не патрабуюць умяшальніцтва аператара. Адным з элементаў пасіўнай бяспекі з'яўляецца спецыяльная лавушка на выпадак самых цяжкіх і неверагодных катастроф. Калі ўзнікае аварыя з парушэннем усіх трох бар'ераў, лавушка не дасць магчымасці расплаўленым масам выйсці за межы абароннай абалонкі. Праз ролю сістэм бяспекі сведчыць статыстыка нешматлікіх аварый, якія былі ў свеце. У 1979 годзе на амерыканскай атамнай станцыі «Free May Areland» здарылася аварыя з расплаўленнем актыўнага слоя. Паводле характару, яна мала адрознівалася ад аварыі на чацвёртым энергаблоку Чарнобыльскай станцыі, але не была падобнай да наступстваў, бо ўся маса радыеактыўнасці была лакалізаваная ў межах абароннай абалонкі. «Сістэмы бяспекі складаюць прыкладна трэць кошту атамнай станцыі», — падкрэсліў Мікалай Груша.

Як паведаміла **дырэктар Дэпартамента па гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Марыя ГЕРМЯНЧУК,** патэнцыйныя пляцоўкі будаўніцтва АЭС на Беларусі абследаваны. Краснапалянская пляцоўка вывучана на 90 працэнтаў, Куўшынаўская — дзесьці на 60, Астравецкая — на 30—40…

Алена КРАВЕЦ.

«БАРАНКІН», БУДЗЬ ЧАЛАВЕКАМ!

Карэспандэнт «Звязды» разам з інспектарам ДАІ лавілі п'яных вадзіцеляў

...Наша адказная місія пачалася а пятай гадзіне вечара — гэта час, калі на дарогах пачынае віраваць жыццё: людзі вяртаюцца з працы.

Рухаемся ў накірунку Сеніцы (менавіта сюды дастаўляюць нецвярозых вадзіцеляў для правядзення алкатэсту). Як аказалася, у гэты вечар не мы адны «палявалі» на безадказных вадзіцеляў: усе нарады, якія выступілі на службу, былі таксама зарыентаваныя на гэта.

— З чым звязаны такі пільны кантроль за п'янымі вадзіцелямі? — пацікавілася я ў Станіслава Салаўя, інспектара аддзялення агітацыі і прапаганды ўпраўлення ДАІ УУС Мінскага аблвыканкама, які суправаджаў нас з калегамі падчас рэйду.

— Толькі за апошнія выхадныя ліпеня (дарэчы, самыя небяспечныя дні тыдня пад колы аўтамабіля, за рулём якога сядзіць нецвярозы вадзіцель — якраз выхадныя) зафіксавана чатыры ДТЗ па віне нецвярозых вадзіцеляў. У Мінскім і Уздзенскім раёнах пацярпелі двое няпоўнагадовых веласіпедыстаў (адзін атрымаў цялеснае пашкоджанне ў выглядзе закрытай чэрапна-мазгавой траўмы сярэдняй ступені, другі — закрыты пералом галёнкаступнёвага сустава і мноства удараў і сінякоў). Траўмы атрымалі таксама і два пасажыры, якія адважыліся даверыць сваё жыццё нецвярозым вадзіцелям, вінаўнікам ДТЗ. Дарэчы, чацвёртыя ліпеньскія выхадныя сталі самымі нецвярозымі ў Мінскай вобласці за мінулы год: за два дні ў сельскіх населеных пунктах, паблізу вадаёмаў, як месцаў адпачынку былі затрыманы больш як сто п'яных вадзіцеляў, што ў 2-3 разы больш, чым у будныя дні.

— Цікава, а па якіх прыкметах супрацоўнікі міліцыі разумеюць, што за рулём сядзіць менавіта чалавек нападпітку?

— Першапачаткова можна вызначыць, што вадзіцель знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення, па тым, як ён кіруе транспартным сродкам (вельмі павольна едзе, часта не па сваёй паласе, перастройваецца з паласы ў паласу, у цёмны час сутак забываецца ўключыць фары). Пры спыненні непасрэдна чалавеку, які выпіў, сесці за руль. Ну, няхай сабе яны не думаюць пра небяспеку, якой падвяргаецца іх знаёмы. Але ж пад кола гэтай машыны з-за іх абыякавасці можа трапіць чыйсьці, у тым ліку і іх, любімы чалавек...

— Магчыма, трэба павысіць ступень пакарання? Як вядома, МУС выступіла з ініцыятывай увядзення такой меры адказнасці, як канфіскацыя аўтамабіля, за рулём якога знаходзіцца п'яны вадзіцель. Наколькі гэта рэальна?

— Канфіскацыя транспартнага сродку ў вадзіцеля, якога злавілі за рулём у п'яным выглядзе, складанае пытанне, — **адзначыў Аляксандр МЕНДЗЕЛЕЎ.** — Прымяненне такіх нормаў не толькі патрабуе ўнясення змяненняў у заканадаўства, але і залежыць ад гатоўнасці грамадства. Тым не менш гэта пытанне абмяркоўвалася на вельмі сур'ёзным узроўні з прадстаўнікамі судовых органаў, Міністэрства юстыцыі, МУС, пракуратуры. У сувязі з тым, што ў гэтым годзе ў нецвярозым стане было затрымана ўжо больш чым 30 тысяч кіроўцаў (і больш як 2 тысячы паўторна), генеральны пракурор даў распараджэнне судам шырэй прымяняць свае паўнамоцтвы. Гэта рэкамендацыя выклікана тым, што на сёння нават тыя меры, якія прапісаны ў заканадаўстве, пакуль не выкарыстоўваюцца ў поўнай ступені. У прыватнасці, за паўторнае кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане прадугледжана крымінальная адказнасць і штраф, які можа дасягаць 1000 базавых велічынь, а гэта ажно 35 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, калі чалавек не ў стане заплаціць такую вялікую суму, то суд мае поўнае права накласці арышт на аўтамабіль да выплаты штрафу. Але яшчэ ні разу крайняя мера не прымянялася. Таму пакуль што мы паглядзім на вынікі прымянення па максімуме ўжо прадугледжаных санкцый. Калі ж і пасля гэтага не будзе зрухаў у лепшы бок, то, магчыма, давядзецца прымяняць больш жорсткія меры адказнасці ў адносінах да нецвярозых вадзіцеляў.

Надзея ДРЫЛА.

Праект бальнай сістэмы ўліку парушэнняў ПДР гатовы

паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі Ігар Ваніцкі.

Дзяржаўтаінспекцыя прапанавала ўвесці 27-бальную сістэму. Так, перавышэнне скорасці або пакіданне месца ДТЗ прапануецца ацэньваць у 9 балаў, парушэнне правілаў абгону і манеўравання — у 7 балаў, праезд на чырвонае святло — 5 балаў, размову па тэлефоне ў час кіравання аўтамабілем і кіраванне аўтамабілем з непрышпіленымі рамянямі бяспекі — 2 балы. Балы будуць вяртацца вадзіцелям праз год пасля ўчынення парушэння.

БЕЛТА.

За алімпійцаў — на свежым паветры

9 жніўня на спартыўна-аздараўленчай базе ФПБ «Алімпіец» возьме старт свята фізкультуры, спорту і здароўя «Ii свабодныя гульні на свежым паветры». Прычым, як паведаміла прэс-сакратар Федэрацыі прафсаюзаў Вольга Зуёнак, сёлета свята пройдзе пад дэвізам «Падтрымаем беларускіх алімпійцаў. Хварэем за нашых». Чакаецца, што ўдзел у свяце возьмуць каля паўтысячы чалавек. Самі спаборніцтвы пройдуць па такіх відах спорту, як настольны тэніс, дартс, шашкі, падняцце гіры, більярд. Адначасова адбудуцца ўжо традыцыйная сямейная эстафета «Тата, мама і я — спартыўная сям'я» і зноў-такі сямейнае перацягванне каната.

Сяргей ГРЫБ.

Абзац

■ У аператыўным аддзеле Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі адчынена тэлефонная лінія для прыёму SMS-паведамленняў ад глуханямых. Аб гэтым паведаміў галоўны ўрач станцыі Эдуард Козыраў. Па нумары +375 29 443 67 12 (аператар сотавай сувязі «Белсел») людзі з парушэннем слыху і мовы могуць адправіць на «хуткую» паведамленне аб дрэнным самаадчуванні. У пацвярджэнне аб атрыманні SMS-паведамлення яго аўтар атрымае зваротнае з тэкстам «Выклік прыняты».

■ **Прэзідэнт Украіны Віктар Ющчанка падпісаў закон аб павышэнні акцызнага збору на тытунёвыя вырабы. Прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка, каментуючы прынятае парламентам рашэнне, адзначыла, што павышэнне ставак акцызнага збору на тытунёвыя вырабы дадаткова прынясе 1,1 млрд грыўняў (каля $230 млн), якія будуць накіраваныя на перадаленне стыхійнага бедства — разбуральнай паводкі.**

■ У сталіцы Літвы ў адным з гарадскіх раёнаў адкрыўся рынак, на якім будуць прадавацца экалагічна чыстыя прадукты. Кожны чацвер на рынак будуць прыязджаць фермеры, якія гадуюць экалагічна чыстыя прадукты (гародніна, садавіна, ягады, розныя прыправы, лекавая травы), і пакупнікі — прыхільнікі здаровага харчавання.

■ **Кіндар-сюрпрызы ўяўляюць пагрозу для дзяцей. Такое меркаванне выказалі ў камісіі бундэстага па ахове здароўя. Маленькія дзеці не заўсёды адрозніваюць цацку ад прадукту харчавання і могуць праглынуць яе мініяцюрныя часткі. Між тым прадстаўнікі італьянскай кандытарскай фірмы Ferrero, якая пачала выпускаць шакаладныя яйкі яшчэ ў 1974 годзе, так не лічаць. На іх думку, для дзяцей сумяшчэнне цацкі з прадуктам харчавання бяспечнае, бо іх падзяляе пластыкавая капсула.**

■ Больш за чатыры месяцы энтузіясты-веласіпедысты з Парыжа дабіраліся ў Кітай, дзе 8 жніўня пачаліся Алімпійскія гульні. 118 французаў розных прафесій яшчэ 16 сакавіка выехалі са сталіцы. За гэты час яны пераадолелі 12,5 тыс.км, перасеклі тэрыторыі 12 краін свету. І нарэшце 3 жніўня на веласіпедах дасягнулі ўчастка Вялікай кітайскай сцяны.

■ **Гадавалы сабака Гектар з Вялікабрытаніі ўмудрыўся праглынуць драўляную палку даўжынёй 64 сантыметры. Гаспадыня прывяла гадаванца да ветэрынара пасля таго, як той адмовіўся з'есці свой сняданак. Ветэрынары ўстанавілі, што дойгая палка таўшчынёй кала 2,5 сантыметра затрымалася ў сабакі ў страваводзе. Дактары мясцовай ветэрынарнай клінікі не змаглі выцягнуць іншародны прадмет, і Гектара давялося адправіць у Каралеўскі ветэрынарны каледж, дзе палку, якая ўпіралася ў сценку страўніка, выдалілі з дапамогай пінцэта.**

Поўны абзац

■ 61-гадовы мужчынскі цырульнік з брытанскага Пурытона завяшчаў пасля смерці скарміць свой прах рыбам у рацэ Хантспіл, на беразе якой ён любіў паседжваць з вудай. У выкананне апошняй волі нябожчыка яго цела было крэміравана, а попел змяшаны з 30 фунтамі рыбінага корму, якім ён звычайна прываджваў рыбу. Жонка і дачка Ходжа кінулі ў ваду па жмені прынады з праху, адкрыўшы развітальную цырымонію, якая праходзіла ў выглядзе спаборніцтва па рыбнай лоўлі з удзелам блізкіх сяброў нябожчыка.

■ **У Маямі ў жылым доме быў выяўлены вулей, у якім было каля трох мільёнаў пчол. Мяркуецца, вулей знаходзіўся ў хаце больш за год. Насельнікі вырашылі выклікаць пчаляра пасля таго, як пчолы ўджалілі траіх з іх.**

■ Італьянская кампанія Magniflex, якая займаецца вырабам матрацаў, прынялася за выпуск подсцілак для сабак з залатых нітак. Кошт кожнага сабачага матраца складае ад адной да трох тысяч долараў. Раней Magniflex ужо выпускаў матрацы з золата. У свеце знайшлося менш чым сто чалавек, якія пажадалі спаць на матрацы коштам ад 24 да 30 тысяч долараў. Ідэю выпуску элітных подсцілак для сабак італьянцам падказаў нейкі заможны расіянін, які заказаў у Magniflex эксклюзіўны матрац для свайго чатырохногага ўлюбёнца.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПАХ ЧАБАРОВЫ

Песні Уладзіміра Будніка адметныя вытанчанай меладыйнасцю, нацыянальным каларытам. Выхаванец палескага краю, ён ярка ўвасобіў прыродную духоўнасць у вакальных і інструментальных творах. Сімфанічная паэма «Сказ пра Палессе», п'еса «Успаміны», песні «Папараць-кветка», «Палессе», «Белая лілея», «Зялёная пушча», «На мяжы раставанняў і сустрэч», «Шумі, мой лес», «Маці-зямлі» і іншыя перадаюць непаўторнае хараство нашай зямлі, духоўную несупакоенасць яе насельнікаў. Уладзімір Буднік — аўтар шэрагу патрыятычных песняў. Вакальны твор «Янка Купала» меў поспех і на еўрапейскіх фестывалях. Каля паўтара дзесятка песень, створаных кампазітарам сумесна з вядомымі паэтамі, змясціла «Звязда».

Песню «Пах чабаровы» Уладзімір Буднік напісаў для папулярнага ў мінулыя дзесяцігоддзі эстраднага ансамбля «Чараўніцы». Даверлівасць інтанацыі, цеплыня і пачуццёвая непасрэднасць твора прыцягваюць увагу і сучасных выканаўцаў.

Міхась ШАВЫРКІН.

Музыка *Уладзіміра БУДНІКА* ***Верш*** *Кастуся КІРЭЕНКІ*

Не прыдумала сама,
Што са мной здарылася:
З працы сёння йшла дамоў
І з дарогі збілася.
Мне б ісці каля ракі, —
Я ж пайшла дубровай,
Галаву маю кружыў
Пах чабаровы.
Прыпеў:
Я ішла ўсё ды ішла,
Аж пакуль стамілася,
і не ведаю сама,
Як з Ігнасем стрэлася.
А Ігнась жа — ён са мной
Ды такі суровы...
Не кружы мне галавы,
Пах чабаровы!
Хлопец глянуў на мяне —
Я аж здрыганулася.
Але што са мной? Чаму
Да яго схінулася.
І чаму так мілы мне
Прывітання словы?
Кружыць, кружыць галаву
Пах чабаровы!
Прыпеў.
Неба ззяла над зямлёй
Яркай вечарніцаю.
Доўга мы сядзелі з ім,
З любым, над крыніцаю.
Толькі ціхія дубы
Чулі нашы змовы...
Ой, вясна мая, вясна,
Пах чабаровы...
Прыпеў.
Што скажу матулі я,
Як часінай позняю
Я з'яўлюся перад ёй,
Ласкавай і грозную.
Што скажу, схаваю як
Водар той дубровы?
Аж у хату прынясла
Пах чабаровы...
Прыпеў.

Калектыў адкрытага акцыянернага страхавога таварыства «БАГАЧ» выказвае глыбокія спачуванні Генеральнаму дырэктару ААСТ «БАГАЧ» Бабарыку Пятру Андрэевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БРАТА.

Утерянное **удостоверение инвалида II группы № 0029352** на имя **Плужникова Карла Алексеевича** считать **недействительным**.

Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»

25 августа 2008 года состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Белхим», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34.

Собрание пройдет по адресу:
г. Минск, ул. Короля, д. 34, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белхим».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34, с 12 по 22 августа 2008 года (время работы с 9.00 до 16.30) либо 25 августа 2008 года по месту проведения собрания. Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 25 августа 2008 года.

Регистрация участников собрания 25 августа 2008 года с 8.30 до 12.30 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 25 августа 2008 года в 13.00.

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).

УНП 100122846

Дорский сельский исполнительный комитет
Воложинского района Минской области (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для строительства и обслуживания индивидуальных жилых домов:

Лот 1 — земельный участок в д. Доры, ул. Красная, об. пл. участка 0,1500 га, кадастровый номер 622083002101000180, начальная цена 3 500 000 бел. рублей;

Лот 2 — земельный участок в д. Доры, ул. Интернациональная, об. пл. участка 0,2500 га, кадастровый номер 622083002101000181, начальная цена 4 000 000 бел. рублей.

Участки размещены на расстоянии 50 км от г. Минска, имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600614080108 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901, УНП 600037251, Дорский сельский исполнительный комитет.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 13 сентября 2008 года в 10.00 по адресу: д. Доры, ул. Советская, 5, здание сельисполкома.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 12.09.2008 г. до 17.00 по адресу: д. Доры, ул. Советская, 5, кабинет секретаря.

Контактный телефон: 8 01772 33636.

«...НЕ ЧУВАЦЬ ТАМ ПРА АНГЛІЙСКІ ПАРЛАМЕНТ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З сядзібай гэтай звязана цікавая рамантычная легенда, магчыма, што і быль. Быццам бы гаспадар яе пан Гласка ўпадабаў у Нямеччыне прыгожую дзяўчыну і прапанаваў ёй свае руку і сэрца. Але немка паставіла расонскаму кавалеру ўмову: маўляў, дасць згоду, калі ён пабудуе для яе дом, у якім столькі вокнаў, колькі дзён у годзе, і каб з аднаго боку дома было возера, а з другога — парк з сажалкай. Гласка выканаў жаданне сваёй каханай, пабудаваў сядзібу, якая нагадвала мініяцюрны сярэдневяковы палац з мноствам гранёных вежачак, эркераў, выступаў, патаемных лесвічак, разнастайных залаў і інтымных пакойчыкаў. Упрыгожыў яго спічастымі вокнамі рознай велічыні; кажуць, іх сапраўды было 365, але зараз частка закладзена, паўночная трох'ярусная вежа з шатровым пакрыццём не захавалася ўвогуле, так што і сотню наўрад ці налічыш.

Побач з сядзібай Гласкі міжволі падумалася, што ў многім дзякуючы агратурызму, які імкліва развіваецца на Расоншчыне (каля 30 сядзібаў зарэгістравана, і колькасць гэта павялічваецца ледзь не штодня), сюды едуць людзі не толькі з Беларусі і Расіі, але і з Заходняй Еўропы, Амерыкі, Японіі. Але да сядзібы Гласкі везці іх соромна.

З Расон да вёскі Забор'е, дзе сядзіба «Кролава хата», можна ехаць рэйсавым аўтобусам. Так я рабіла ў першы свой візіт. Але цяпер мы ехалі на мікрааўтобусе «Белаграпрамбанка», бо нас была цэлая каманда: эксперты, журналісты, банкаўскія работнікі. І мы... заблукалі. Ехалі-ехалі нейкімі бязлюднымі лясамі дарогамі, звяраючы маршрут па карце, і ледзь не заехалі ў Расію. Развярнуліся, вадзіцель змрочна пажартаваў наконт падвескі, бо асфальт тут пакідае жадаць лепшага, а прыцяхлыя пасажыры гэтак жа нявесела пажартавалі наконт партызанаў, якія зараз выйдуць насустрач нам з лесу. Паверылася. І ўзгадаліся радкі славутага ўраджэнца гэтых мясцінаў: *«На зямлі ёсць чорныя пушчы, што чарнеюцца каля нашых вёсак. У засень іх нетраў ніколі не заглядвала чалавечае вока; яны цягнуцца бясконца».*

І сапраўды, амаль 70 працэнтаў тэрыторыі Расонскага раёна пакрываюць лясы, у якіх паспяхова хаваюцца ад усюдыіснай чалавечай істоты бурыя мядзведзі, ласі, рысі, ваўкі, бабры, выдры, янотападобныя сабакі і зусім цяпер рэдкія глушцы. З-за забалочанасці лясы дагэтуль застаюцца ў большасці некранутымі. Там гняздзяцца рэліктавыя вадаплаўныя птушкі і захаваліся знікаючыя віды раслін. Самае галоўнае ўпрыгажэнне Расоншчыны — азёры і рэкі, якіх тут больш за 200, некаторыя злучаны ў адзіную складаную сістэму. Унікальныя высокія пагоркі, утворныя апошнім ледавіком, робяць мясцовасць надзвычай маляўнічай і ні на што не падобнай. Нездарма тут створаны два ландшафтныя заказнікі рэспубліканскага значэння. І нездарма адна з першых фантастычных кніг у беларускай літаратуры была навеяная гэтым таямнічым, напоўненым цудамі, паданнямі і легендамі краем. Так і здаецца, што *зараз выйдзе з пушчы лясун, галавою вышэй за хвою, а дзве сям'і, абедзве не першы раз: магіляўчане з двума хлопчыкамі — чацвёрты, а масквічы з немаўляткам — другі. А яшчэ ў Кролаў новы клопат — карова.*

Віталік і Валера ЗАБАЎСКІЯ з Магілёва чацвёртае лета праводзяць у вясковым гатэлі Аляксандра і Веры Кролаў.

— Хочам і свіней трымаць, — дзеліцца планамі Вера, наліваючы нам астуджанае малако пад бліны з чарнічным варэннем, — бо сваё мяса патрэбна для гасцей, але самі не справімся: часу катастрафічна не хапае. Можа, папросім некага з суседзяў.

Кролава хата стаіць наводшыбе, адразу за ёй лес, у якім возера. Аляксандр кожную раніцу, у любое надвор'е і пару года, ідзе на возера плаваць. Ён, былы настаўнік фізкультуры, заўзяты прыхільнік здаровага ладу жыцця, разам з сынам Цімурам распрацаваў 9 маршрутаў па наваколлі: тры водныя, тры пешыя і тры веласіпедныя. Маршруты разлічаны на розную ступень падрыхтаванасці турыстаў, ад 6 да 35 кіламетраў, могуць быць аднадзённымі, двух або трохдзённымі, а таксама камбінаванымі. Напрыклад, адпраўляецца група на байдарках, адзін дзень плыве па сістэме азёраў, другі — па рацэ, а на трэці вяртаецца на веласіпедах. Альбо дзве групы стартуюць розными шляхамі, сустракаюцца і абменьваюцца сродкамі руху.

У Кролаў 4 байдаркі, на якіх можа размясціцца 10—12 чалавек. На такую ж групу разлічана колькасць веласіпедаў, і на ўдвая большую — палаток, спальных мяшкоў і іншага паходнага рыштунку. Водныя шляхамі можна дабрацца да такіх мясцінаў Расоншчыны, куды ўжо няма дарог, і ўбачыць шмат чаго цікавага.

— Як правіла мы спускаемся з надзвычай маляўнічага возера Волаба з мноствам астравоў у возера Сіньшу, — расказаў мне потым па тэлефоне Цімур. — Там кожная мясціна звязана з нейкай гісторыяй. Напрыклад, ёсць Маскоўскія вароты, якія вядуць у Расію, і за імі Маскоўкі плёс; Шлёмкін востраў, па імені яўрэя Шлёмы, які ўхаваўся на ім падчас Вялікай Айчыннай вайны разам са сваёй сям'ёй. Шлёмкін востраў закрывае ўваход у заліў, які быў калісьці пачаткам ракі. Месца гэта называецца Прорва, бо рака сышла адтуль, і з гэтым звязана яшчэ адно паданне. У пана Галынскага стаяў на возеры Дрысы млын, дзякуючы якому ён багацеў. Але па суседстве з ім жыў пан Крашуцкі, які валодаў вераб'ём, які пілаваў лес. Неяк паны пасварыліся, і Крашуцкі загадаў прарыць кароткі перашэек паміж азёрамі, вада хлынула і затапіла млын, пакляўшы канец шчаслівым дням Галынскага.

На верхавых азёрах, якія далучаюцца да Волабы, можна сустрэць занесены ў Чырвоную кнігу Вадзяны арэх, там праходзіць беларуска-расійская мяжа, і гасцей Кролаў прыводзіць у захапленне адсутнасць тут межавых знакаў і патрульных катараў. Адзін бераг беларускі, другі — расійскі, можна выйсці з лодкі і апынуцца ў іншай краіне.

Калі рушыш з Кроламі ў паход, то хутчэй за ўсё пабачыш і самае вузкае месца паміж азёрамі, праз якое да нядаўняга часу быў пракладзены драўляны мост. Месца гэта так і называецца — Узмены, але цікавае яно не толькі сваім рэльефам, але і тым, што аднойчы накарміла малаком цэлую вёску. А было так, што праз гэты мост неяк ехала машына з кантрабандай згушчонкай, мост не вытрымаў, машына трапіла ў ваду, кардонныя каробкі размоклі і мясцовыя жыхары яшчэ доўга пасля вылоўліваліся з дна салодкі ласунак.

— Шмат цікавых мясцінаў на берагах, — расказвае Цімур. — Напрыклад, партызанскі шпіталь і цэлы зямляначны гарадок, казармы, паўвостраў Манашак, на якім доўгі час пасля вайны жылі пустэльнікамі дзве жанчыны. Зямлянка ўжо амаль зарасла лесам, але навокал яшчэ можна сустрэць садовыя кусты.

На паўвостраве Перавоз, паміж вусцем рэчкі Ўшча, якая ўпадае ў возера Дрыса, і колішнім вытокам ракі Дрысы знаходзіцца адзін з самых цікавых полацкіх курганоў — Рагнедзін. Народнае паданне кажа, што тут пахаваны полацкі князь Рагвалод, забіты ўдарам каменнага молата. Падобны молат быў знойдзены ў кургане ў 1864 годзе і перададзены ў Імператарскую археалагічную камісію.

Вось так сівая даўніна, яшчэ нядаўняя гісторыя і сучаснасць цесна пераплецены ў гэтых краях, у якіх, здаецца, час спыняе сваю хаду, каб трошкі адпачыць, палюбавацца разнастайнымі краявідамі і цудоўнымі малюнкамі і даць чалавеку магчымасць узгадаць пра мінулае і падумаць пра будучыню.

Улэўніцца ў гэтым на працягу двух дзён маюць магчымасць штогод і госці «Заборскага фэсту», які тры гады таму прыдумаў і ўпершыню правёў (тады сабе ў страту) Аляксандр Кролл. Цяпер гэта вядомы на ўсю краіну і адзіны пакуль фестываль аграсядзібаў, на які збіраюцца не толькі гаспадары, у тым ліку пэнсіянеры, вясковых міні-гасцініц. Прыязджаюць і тураператары, прадстаўнікі буйных турагенцтваў, мясцовых уладаў, фальклорныя гурты і творчыя калектывы, а таксама майстры, міжнародныя эксперты ў галіне турызму, прэса і ўсе, каму гэта цікава. Фэст праводзяць Расонскі райвыканкам і грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы». І «Кролава хата» па-ранейшаму бярэ на сябе важкую частку арганізацыі — размясціць, накарміць, наладзіць экскурсіі, прэзентацыі.

Мы з жалем развітваемся з гасцінай Верай Крол, з зайздрасцю аглядаемся на яе маскоўскіх і магілёўскіх гасцей, якія застаюцца, і пакідаем вёску Забор'е з жаданнем абавязкова прыехаць сюды ў іншай якасці, а яшчэ прывезці дзяцей, каб убачыць у іх вачах захапленне ад гэтага дома, ад гэтай прыроды, сесці з імі ў байдаркі і...

Праз некаторы час я перарываю летуценнае маўчанне ў аўтобусе і звяртаюся да экспертаў, каб яны падзяліліся сваімі ўражаннямі.

— У «Кролавай хаты», я думаю, вельмі вялікая будучыня, — кажа **доктар архітэктуры Сяргей СЕРГАЧОЎ.** — Што было б з гэтай вясковай бальніцы, якая перастала функцыянаваць? Скуль заўгодна можна пабачыць у вёсках такія будынкі, кінутыя, нікому не патрэбныя. А тут чалавек узяўся, паціху, бачна, што яму нялёгка, але мэтанакіравана і паслядоўна ўвасабляе сваю задуму. І што самае галоўнае: у які б куточак мы ні зазірнулі, упэўнімся, што рэалізуецца цэласнае мастацкае вырашэнне. Аляксандр адчувае мэту і стыль, на якія павінен выйсці. І прытрымліваецца гэтага ва ўсім, пачынаючы ад дзвярной ручкі, падвескі карнізаў да агульнага выгляду, як гэта ўсё ўпісваецца ў навакольную прыроду. У яго вельмі добра атрымліваецца. Бальніца — гэта, зразумела, не вясковы домік, дзе ёсць паўныя параметры, абмежаванні. У гэтым будынку ўяўляецца магчымасць зрабіць шмат пакояў, зацішных куткоў, дзе можна размясціцца сям'ёй альбо адасобіцца аднаму, дзе могуць схавацца дзеці. Гэта вельмі здорава. Выдатна, што ні ў Крола, ні ў іншых гаспадароў сядзібаў няма жадання зрабіць нешта пад еўрамонт. Наадварот, ёсць імкненне арганічна ўвесці гасцей у асяроддзе прыроды.

Вельмі важна, што ўсе аграсядзібы з'яўляюцца сродкам узбагачэння вясковага асяроддзя. Сярод домікаў, у якіх віруе сялянскае жыццё, з'яўляюцца аб'екты, якія выконваюць зусім іншыя функцыі, дзе адбываюцца цалкам іншыя працэсы: сюды прыязджаюць людзі, спыняюцца, адпачываюць. Усе гаспадары сядзібаў стараюцца зрабіць так, каб гэтыя працэсы адбываліся з максімальнай зручнасцю. Пры гэтым кожны робіць свой непаўторны варыянт. Гаспадары разумеюць, наколькі важна выкарыстаць мясцовы элемент, узнавіць легенды, паказаць славутасці, распавесці пра малавядомыя факты гісторыі краю.

— Што тут дадаць? — усміхаецца **дацэнт кафедры этналогіі і фальклярыстыкі БДПУ імя М. Танка Алесь ЛОЗКА.** — У Кролаў будзе цікава ўсім, і ахвотнікам спакойнага адпачынку, і аматарам экстрыму, і збіральнікам мясцовых легендаў і паданняў. Тут знойдзе свой скарб у выглядзе зёлак, варэння з лясных ягад і марынаваных грыбкоў хатняя гаспадыня, заўсёды будуць вяртацца сюды маладыя людзі, а навукоўцы, ці то этнографы, ці то эколагі альбо біёлагі, тут зробяць свае адкрыцці, можа, нават імя. Гэты край настолькі багаты, унікальны і яшчэ малавывучаны, што застаецца проста дзякаваць богу, што такое яшчэ ёсць на зямлі, і не дзе-небудзь, а ў нас, на Беларусі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота
Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Расонскі раён.

Сядзіба ГЛАСКІ ў Расонах.

СЕЕМ СКВАПНА — ЗБІРАЕМ ШЧОДРА,
альбо Як з аднаго зярнятка вырасціць дзесяткі каласкоў

Магілёўскі пенсіянер выпрабоўвае на сваім дачным участку найноўшую агратэхналогію. Замест угнаенняў у ёй выкарыстоўваюцца эфектыўныя мікраарганізмы.

Яўген Міхайлавіч Казлоў мае адукацыю біяхіміка, а цяпер стаў аграномам-практыкам. І нават трапіў са сваім рэкордам у Кнігу рэкордаў Гінеса: з аднаго зерня жыта ён вырасціў 31 каласок, а з зерня ячменю — аж 44!

Калі шчыра, то гэта выглядае цудам: на звычайным агародзе ў Магілёўскім раёне расце ячмень, пшаніца і нават рыс, дзе ў адным каліве абсалютна відавочна з дзесятак і болей сцяблін.

— Гэта робіцца з дапамогай ЕМ-тэхналогіі, у аснове якой ляжыць японская ідэя, — тлумачыць Яўген Міхайлавіч. — Усё расце без угнаенняў — хімічных ці натуральных, а з дапамогай карысных бактэрый. Яны добра ўздзейнічаюць на ўсе жывыя арганізмы — і на расліны, і на чалавека. Я і сам ужываю гэтыя бактэрыі, і паглядзіце: у 71 год энергічны і здаровы чалавек, старэчых зморшчынак няма, а праз сівыя валасы неўзабаве сталі прабівацца цёмныя!

З чаго складаецца і як робіцца бактэрыяльны комплекс — «сакрэт фірмы» магілёўскага пенсіянера. Ён вырабляе яго сам і прапануе выпрабоўваць новую тэхналогію ў сельскай гаспадарцы.

— Ёсць такая прымаўка: хто сквапна сее — той скупа жне, а ў мяне ж наадварот: сею я сапраўды сквапна (кожнае зерне праз 10—15 сантыметраў ад другога), але з дапамогай эфектыўных мікраарганізмаў збіраю надзвычай шчодры ўраджай, — хваліцца Казлоў.

За пяць гадоў эксперыментаў з раслінамі на дачным участку Яўген Міхайлавіч апрабаваў больш за 150 культур, у тым ліку гародніну і кветкі, і ён запэўнівае, што ЕМ-тэхналогія нязменна дае высокі вынік. У доказ пенсіянер прад'явіў капусту — прыгожую і вялізную, прычым ён эканоміў на ўгнаеннях, а глебу і расліны апрацаваў карыснымі мікраарганізмамі.

Сёлета на сваіх палетках Казлоў апрабаваў пшаніцу цвёрдага гатунку, якой, як вядома, не стае ў Беларусі і якую даводзіцца закупляць у замежжы за валюту. Аднак з дапамогай ЕМ-тэхналогіі нават не вельмі перспектыўны гатунак цвёрдай пшаніцы вырас на зайздрасць: у кожным каліве — 7—8 каласкоў, а ў кожным цяжкім і поўным коласе — 60—65 зярнятак.

У адным каліве аўса — больш за дзесятак сцяблінаў, якія выраслі без угнаенняў, але з дапамогай карысных мікраарганізмаў.

Яшчэ не завершаны эксперымент з рысам: так, Яўген Міхайлавіч вырашыў праверыць, ці можна з дапамогай ЕМ-тэхналогіі вырасціць у нашых кліматычных умовах рыс.

— Расце вельмі добра! — запэўнівае аграном-аматар. — Дапамагае пацяпленне клімату і добры паліў. Шмат сцяблін, і на іх дзе-нідзе бачны плады. Так што напрыканцы верасня я планую прыгатаваць плоў з беларускага рысу!

Яўген Казлоў імкнецца пераканаць спецыялістаў у сферы сельскай гаспадаркі, што выкарыстанне ЕМ-тэхналогіі дасць добрыя ўраджаі, і заклікае да правядзення маштабных эксперыментаў. Пенсіянер упэўнены, што на выдатнай перадавой ідэі зможа зарабіць і ён сам, і яго краіна.

Ілона ІВАНОВА.

Выпрабавана на сабе

ПА ВЁСЦЫ КОНЬ ІМЧАЎСЯ...

У гэты дзень было сонечнае зацьменне, але яго ў нас ніхто і не заўважыў — сонца было закрыта толькі на адну чвэрць. І хоць я ні ў якія прыкметы не веру, але менавіта 1 жніўня стала для мяне маркотным.

Зранку прывёз жонку на дачу і паставіў аўтамашыну, як заўсёды, на ўзбочыне — насупраць хаты. Паглядзеў на вінаград, які сёлета не ўдалося ўратаваць ад мільдзью, а затым узяў фотаапарат і сабраўся пайсці за вёску, бо там ужо шумелі камбайны. Думаў зрабіць здымак для газеты.

Выйшаў за веснічкі і ўбачыў калгасны статак, які рухаўся па вёсцы ў мой бок. Вярнуўся назад (кароў шмат) і вырашыў перачакаць.

Першае адступленне.

Эпізоды вясковага жыцця мне добра вядомыя і ўрэзаліся ў памяць назаўсёды. Некалі ў кожнай вёсцы кароў хапала, і калі тыя вярталіся з выгану, то, як правіла, карціна была адна і тая ж. Каровы павольна ідуць па вуліцы з круглымі жыватамі і ляніва жуюць жвачку ды яшчэ ўсю вуліцу заляпаюць. Здараліся і выключэнні, але кожны, адбываючы «калейку», пасвіў не толькі чужых кароў, але і сваю. У прынцыпе, наеліся каровы ці не, залежала ад канкрэтнага чалавека — які гаспадар, такі і пастух.

З грамадскім статкам сітуацыя зусім іншая. Калгасныя каровы не ўмеюць ісці павольна, а ўсё бягом. Аднойчы на тэрыторыі аднаго калгаса, цяпер ужо сельгаскааператыва, давялося ўбачыць, як статак гналі на дойку. Пастухі на конях, дзве аўчаркі і каровы галопам. Адназначна, ніводзін старшыня не дасць на такое каманды, але ж у пастухі ідуць не самыя лепшыя кадры, хоць зарплата часта ў іх вышэйшая, чым у дыпламаванага спецыяліста. Выбіраць няма з каго, ды і карова з фермы не чакае, што яе нехта пагладзіць ці дасць акраец хлеба — усё пастаўлена на паток.

Статак, які гналі вуліцай, таксама рухаўся нервова і прайшоў бы міма машыны і на гэты раз, як рабіў гэта сем гадоў. Але ў сярэдзіну статку ўбіўся конь з возам і... ашалеў — каровы не давалі яму бегчы.

Конь наляцеў на машыну, рвануў убок, паламаў аглоблі, пакінуў каля брамы воз і панёсся, а палову статка пагналі ўжо загуменнем. Прыбег пастух, які за гэтага каня адказваў, але што ўжо было рабіць.

Убачыўшы, што стала з машынай, я ўзяўся за тэлефон. Першым прыехаў старшыня мясцовага сельгаскааператыва з намеснікам па жывёлагадоўлі і загадчыкам фермы. Усе размовы, ці меў я права на вуліцы машыну ставіць, як і нічога выпадковага не бывае, былі неістотныміі, а вось прапанову разабрацца ў сітуацыі самім я да галавы не ўзяў, бо было ўжо позна — выклікаў інспектараў ДАІ.

Неўзабаве прыехалі і яны. Першае пытанне было, ці ўладзілі мы праблему, але я зноў палічыў, што ўсё павінна быць афармлена паводле закону, а калі так, то пры здарэнні неабходна, каб усё засталася на месцы — нічога нельга чапаць да прыбыцця супрацоўнікаў ДАІ. Так і пайшло сваёй калеяй: усё зафіксавалі, а мне выдалі даведку, з якой я павінен пайсці ў страхавую кампанію, што я і зрабіў. Была ўпэўненасць у сваёй правоце, і думалася, што далей усё пойдзе гладка і лёгка: страхавая кампанія вырашыць усе мае праблемы, бо на працягу сямі годоў я плацію грошы.

Калі ты ў чарговы раз робіш узнос, то жанчына ў акенцы сустракае цябе ветліва, з усмешкай, а тут узяла даведку і ў адказ: «А на гэты выпадак страхавы паліс не падыдзе — вам трэба ў суд». На шум выйшаў дырэктар Юрый Гарошкаў і запрасіў у кабінет, дастаў са сталы брашурку і зачытаў, што ***пры абавязковым страхаванні страхавым выпадкам не лічыцца, калі ваш аўтамабіль пашкодзілі: сельскагаспадарчыя і будаўнічыя машыны, ваенны транспарт, меліярацыйныя машыны, мотаблокі, мапеды, гужавы транспарт...*** І ўсяго гэтага я не ведаў, хоць свой подпіс на страхавым пасведчанні і ставіў, што азнаёмлены з палажэннем аб страхаванні.

Другое адступленне.

Я вырашыў зрабіць сярод улад-

альнікаў легкавікоў апытанне, і амаль ніхто з іх не ведаў, якія выпадкі не лічацца страхавымі, і толькі адзін кіроўца, якому давялося сутыкнуцца з праблемай, быў у курсе. «Ні фіга сабе! О-о, блін!» — давялося пачуць ад тых, хто з году ў год плаціць страхоўку.

І тут прад'явіць нейкія абвінавачванні страхавой кампаніі немагчыма, бо самі ставім подпіс і думаем, што тэкст, які надрукаваны мікраскапічнымі літарамі на адваротным баку выпісанага нам страхавога пасведчання, з'яўляецца тым самым палажэннем. І хоць у нас няма выбару, бо страхаванне абавязковае і палажэнне адно для ўсіх кампаній, але ж што там напісана, трэба ведаць.

За савецкім часам у сталовых вельмі быў распаўсюджаны комплексны абед. У чалавека не было выбару, акрамя таго, як з'есці тую катлету (каб не быць галодным), але прачытаць меню ён мог.

Калі чалавек заключае дагавор на абавязковае страхаванне, то супрацоўнік кампаніі павінен растлумачыць, што палажэнне аб абавязковым страхаванні: «за вашай спіной вісіць на сцяне», «вось ляжыць перад вамі», «а на адваротным баку выдадзенага вам пасведчання толькі вытрымкі з палажэння».

Хоць і сярод тых цытатаў ёсць: 174. Страхавальнік абавязаны:

— азнаёміць страхоўшчыка з умовамі абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў.

Так, у вадзіцеля няма выбару — абавязковае страхаванне не абмінеш, але ад нейкіх выпадкаў ён мог бы пайсці на добраахвотнае страхаванне.

Адным словам, усе закрытыя акцыянерныя страхавыя таварыствы ведаюць, што ад іх ніводзін уладальнік машыны не ўцячэ, то чаго асабліва і хвалявацца — канкурэнтаў няма. А вадзіцелі ставяць аўтаматычна подпіс, бо думаюць, што за іх нехта ўсё прадумаў, а інакш, за што грошы плаціш?

Адносна майго выпадку, то праз 15 дзён міліцыя напіша пратакол, які запатрабаваць можа толькі суд, а гэта будзе цягнуцца з месяц. Судовы разгляд — валакіта непрыемная, і тут сапраўды думаецца, што, можа, за лепшае было б пра ўсё дагаварыцца на месцы, без ДАІ.

І рамонт машыны ў прыватніка абыдзецца ў некалькі разоў танней, чым на станцыі абслугоўванні. У часе і грашах усе бакі прайграюць, але ёсць гарантыя для пацярпелага, што яго не падвядуць.

* * *

Вяртаючыся да кароў, якіх гоняць праз вёску, то тут неабходна сказаць наступнае. Калі па населеным пункце імчацца сотні кароў, то патрэбна асцярожнасць. Вось у маіх суседзяў ёсць малыя дзеці, якія выбягаюць на вуліцу, і можна ўявіць, што будзе, калі трохгадовае дзіця трапіць пад капыты кароў? Суседка тэлефанавала ў райвыканкам, але праходзіў тыдзень — і ўсё пачыналася занава. Калі можна гнаць кароў па загуменні, то навошта праз вёску? Вядома ж, па вуліцы, як па тунэлі, — прасцей. Усё вырашаюць канкрэтныя людзі, і над кожным пастухом наглядальніка не паставіш...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫЦЬ — НЕ ЛЮЛЬКУ РАСКУРЫЦЬ?

У хвіліны стомы і нервовай напружанасці вядомы маладзечанскі майстар па дрэве Валянцін Сысун адкладае ўбок усе свае заняткі і набівае тытунём драўляную люльку. Плаўна ўздымаецца ў паветра духмяны дымок, плаўна цякуць думкі Валянціна Мацвеевіча. І ён, сам таго не заўважаючы, вяртаецца ўспамінамі ў дваццаты год свайго жыцця...

Тады моладзь узахлёб чытала Джэка Лондана і Хемінгуэя. Для таго, каб стаць хоць крышачку падобнымі на герояў гэтых кніжак і надаць сабе знешняй мужнасці, юнакі ішлі на самыя смелыя эксперыменты: адны перакройвалі адзенне, другія адпускалі валасы. Валянцін вырашыў спыніцца на люльцы і барадзе. У тыя часы, калі бараду насілі толькі прафесары, трэба было мець смеласць, каб выйсці на вуліцу ў такім выглядзе. «Гэта было ўсё роўна, што прагульвацца голым,» — усміхаецца мой субяседнік. Але заўвагі партыйных работнікаў і зацікаўленыя позіркі прахожых не прымусілі яго расстацца з часткай свайго іміджу. А здымак эпатажнага юнака доўга выстаўляўся ў мясцовым фотаатэлье.

І люльку Валянцін зрабіў сам. Нездарма ж ён сын вядомага ў наваколлі цясляра, які хоць і не вучыў яго свайму майстэрству, але і не забараняў сачыць за работай з печы, ля якой якраз і стаяў варштат. Знаходзячыся ў кампаніі, Валянцін вымаў сваю першую люльку з кішэні і глыбакадумна курыў, хаця ў адзіноце не рабіў гэтага ніколі. Другую ён зрабіў па просьбе сябра, трэцюю — у падарунак... Словам, малады чалавек так адтачыў сваё майстэрства, што ў гады перабудовы нават заключыў дагавор з маладзечанскім універмагам і кожны тыдзень рабіў 20 штук на продаж. За гэта атрымліваў 50 рублёў, на якія можна было тады набыць веласіпед.

Калі забраць усе люлькі, зробленыя майстрам, у адну калекцыю, атрымаецца каля пяцісот. І што самае дзіўнае — ніводная з іх не падобная на папярэднія: на адных выразаны арнамент, іншыя маюць выгляд жанчыны, галавы, кракадзіла. Адзінае, што ёсць у іх агульнага, — гэта фільтр, які ачышчае нікацін, — таксама прыдумка Валянціна Мацвеевіча.

«Ад люлькі менш шкоды, чым ад цыгарэт, — разважае майстар. — Па-першае, яе не будзеш курыць так часта: наўрад ці чалавек стане спыняцца сярод вуліцы, каб набіць яе тытунём. Па-другое, яна дазваляе эканоміць: не трэба кожны дзень траціць тры тысячы на якасныя цыгарэты».

Лепшыя люлькі атрымліваюцца з чаротку — рэдкага для Беларусі віду бярозы, якая не гарыць і мае вельмі моцную драўніну, падобную навобмацак на мармур.

Валянцін Мацвеевіч, які ў свой час скончыў Полацкі лясны тэхнікум, добра ведае, для чаго можна скарыстаць кожны від дрэва. Самую лепшую мэблю, безумоўна, робяць з дуба. За жыццё майстар зрабіў на заказ нямала ажурных палічак, столікаў, дзвярэй, міжпакаёвых арак, але, як прызнаецца сам, куды больш ахвотна працуе над мініяцюрнымі вырабамі. З бярозавых наростаў, у якіх ён умее разгледзець і балерыну, і чыйсьці твар, атрымліваюцца адмысловыя статуэткі, з дошчачак — карункавыя шкатулкі і нават упрыгажэнні, якія з задавальненнем носіць яго жонка Ларыса Іванаўна.

А верхам майстэрства стала самаробная гітара з елкі, клёну і бярозы. Напэўна, любоў да музычных інструментаў перадалася майму субяседніку разам з цяслярскім талентам ад бацькі, які меў немалую калекцыю самаробных гітар, скрыпак, цымбалаў. Валянцін Мацвеевіч успамінае, як тата браў у рукі скрыпку, на якой навучыўся іграць аж у семдзесят гадоў, а ён падыгрываў яму на цымбалах, дзе замест струн былі ніці ад трактарнага каната высокага ціску. Дарэчы, спецыялісты не раз адзначалі, што гучанне ў гэтых інструментаў вельмі добрае, нашмат лепшае, чым у фабрычных.

Сваю апошнюю скрыпку бацька Валянціна Мацвеевіча зрабіў, калі яму было ўжо каля васьмідзесяці і ён амаль нічога не бачыў. Нягледзячы на гэта, інструмент атрымаўся моцным: ён і зараз займае сваё пачэснае месца ў кватэры Сысуноў. Мой субяседнік часта здымае скрыпку са сцяны, прыціскае да падбародка, і адразу ўспліваюць вобразы бацькі (які ніколі не павышаў голасу, але калі пачынаў гаварыць — усе ў хаце змаўкалі), сястры Гені... Геню — дачку цесляра Мацея ад першага шлюбу — яму так і не давялося пабачыць.

Валянцін Мацвеевіч і па сёння не можа без хвалявання ўспамінаць гісторыю васямнаццацігадовай прыгажуні, параненай у плячо з аўтамата, які адзін з начных гасцей — партызанаў — кінуў на стол, забыўшыся паставіць на засцерагальнік. Вясковыя паліцаі жыва зацікавіліся Геніным раненнем. Дакладнасць унесла суседка, побач з якой Сысуны пражылі не адзін дзесятак гадоў: «Дык гэта партызаны яе «зачапілі»! Яны ж з маткай ездзяць паводле іх загаду ў горад і мяняюць харчы на лекі!» На наступны дзень, калі Мацей сышоў з двара, яго дачку і першую жонку расстралялі. Вярнуўшыся ў хату і дазнаўшыся пра страшную навіну, ён адразу скіраваўся ў майстэрню — рабіць дубовы крыж на агульную магілу для бацькі, маці і дачкі: у тым, што прыйдуць і па яго, ён не сумняваўся. І прыйшлі. Але калі Мацея ўжо вялі на расстрэл, адзін з ахоўнікаў схіліўся да яго і шапнуў: «Бяжы, дзядзька!», а потым быццам бы не заўважыў уцекача. А моцны, па-майстэрску зроблены крыж і сёння стаіць над пагостам...

Так уюцца думкі Валянціна Мацвеевіча, пераскокваючы з мараў на ўспаміны, з цяперашняга на мінулае. Праз пару хвілін майстар зноў падыдзе да станка і працягне чараваць над новымі вокнамі ў школу-інтэрнат для дзетак са скаліёзам, дзе ён працуе сталяром. А можа — над рамамі для карцін, якіх ён багата падараў мясцовым мастакам, а яны яму за гэта — свае творы. Пакуль выраб не будзе гатовы, майстар не можа займацца нічым іншым.

«Мне так хочацца хутчэй пабачыць, што атрымаецца, — прызнаецца ён сам, — што не магу цярпець, пакуль не закончу».

Гэтак жа Валянцін Мацвеевіч не можа цярпець абыякавасці людзей да гістарычнай спадчыны, да роднай мовы. На маё пытанне аб тым, ці не лепш было б жыць клопатамі сваёй сям'і і не забіваць галаву грамадскімі праблемамі, майстар коратка адказаў: «Мужчына павінен думаць за ўвесь свет».

І патушыўшы люльку, зноў прыняўся за работу.

Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.
Фота аўтара.

На здымках: майстар Валянцін Сысун і яго люлькі.

Ну і ну!

УСІМ КРАДЗЯЖАМ КРАДЗЕЖ?

Ён быў зафіксаваны ў Гомелі 7 жніўня, калі ў міліцыю звярнуўся дырэктар філіяла № 1 адкрытага акцыянернага таварыства «Банк Залаты талер». Ён паведаміў, што з 14 да 14.30 нехта, падабраўшы ключ ад абменнага пункта філіяла банка, што знаходзіцца на вуліцы Каменшчыкава (быў абедзенны перапынак), прабраўся туды і забраў 8725 долараў, 1195 еўра, 70210 расійскіх і 9317 тысяч беларускіх рублёў, а таксама 300 украінскіх грыўняў.

Неверагодна, але факт, сказаў нам работнік прэс-цэнтра УУС Гомельскага аблвыканкама Андрэй Кітаеў, абменны пункт не быў абсталяваны ні ахоўнай сігналізацыяй, ні сістэмай відэаназірання.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАСТУХ СТРАЛЯЎ НОЧЧУ

Ноччу нехта страляў з ружжа. Пра гэта паведаміў у Верхнядзвінскі РАУС мясцовы жыхар. Высветлілася, што страляў з незарэгістраванага паляўнічага ружжа 16-га калібру 38-гадовы пастух, які такім чынам хуліганіў між вёскамі Сянькова і Урагава. У адносінах да хулігана ўзбуджана крымінальная справа. Ружжо, безумоўна, канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПОЎНЫ НАБОР ЗЛАЧЫНСТВАЎ

У в. Гошчава Івацэвіцкага раёна ў сваім доме быў знойдзены мёртвым пенсіянер.

Судмедэкспертыза выявіла, што ў пенсіянера пераламаны рэбры з двух бакоў і яго задушылі.

Следства ўстанавіла, што расправіўся з загінулым яго 26-гадовы сын, які ўжо сядзеў у турме за крадзеж, разбой, гвалтаванне і нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў.

Забойцу затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У СВК «Аграфірма Малеч» тэмпы збору ўраджаю задаюць супрацоўнікі Дэпартамента аховы

Усяго на палях нашай рэспублікі працуюць 17 супрацоўнікаў Дэпартамента аховы, якія, знаходзячыся ў водпуску, дапамагаюць гаспадаркам збіраць ураджай.

Так, напрыклад, два супрацоўнікі Бярозаўскага аддзела аховы — міліцыянер узвода міліцыі прапаршчык Сяргей Гэта Стасевіч і яго таварыш, міліцыянер-вадзіцель, прапаршчык Юрый Барушка — працуюць адпаведна камбайнерам і памочнікам камбайнера ў СВК «Аграфірма Малеч». Экіпаж па выніках збору ўраджаю ўваходзіць у склад перадавікоў у гаспадарцы.

— Нам пашчасціла сам працэс жніва. Гэта відовішча, якое зачароўвае, — апавядаюць яны свае ўражанні Сяргей і Юрый.

Экіпаж Сяргея Стасевіча і Юрыя Барушкі ўпэўнена займае трэцяе месца ў гаспадарцы (а гэта шэсць вёсак, пяць тысяч гектараў палёў).

Працаві міліцыянераў вельмі задаволены старшыня СВК «Аграфірма Малеч» Іван Данілевіч:

— Экіпаж Сяргея Стасевіча і Юрыя Барушкі адзначаецца выдатнай дысцыплінай, з'яўляецца добрым прыкладам у адносінах да працы і тэхнікі.

Андрэй ГАЎРОН.
Юлія АКСЮЧЫЦ.

Простыя рэчы

У маладосці я быў досыць актыўным камсамольцам. Некалькі разоў выбіраўся членам бюро райкама камсамола. А гэта ўжо мела пэўнае значэнне. Меў магчымасць прысутнічаць на камсамольскіх выездах на прыроду. Не абыходзілася там без чаркі. І вось калі абцяхала бяседа, мы з тагачасным першым сакратаром райкама камсамола Генадзем Кулажанкам (ён загінуў у Афганістане, будучы там дарадчыкам) абавязкова прасілі загадчыцу арганізацыйнага аддзела заспяваць нашу любімую:

Чырвоная вішня з-пад кораня выйшла,
Аддала мяне маці, дзе я не прывычна.
Як выйду на гору ды гляну да дому:
Вары, маці, вячэру і на маю долю.

Мы былі ўжо дастаткова дасведчаныя ў паэзіі, ведалі на той час найноўшыя яе плыні, самі пісалі. Але чамусьці менавіта гэта меладычная песня кранала душу, вымушала слухаць і слухаць яе.

Цяпер мне зразумелы цьмяны раней выраз «з-пад кораня выйшла». Гэта калі вішня вырастае не з костачкі, кінутай ці выпадкова занесенай у зямлю, не са спецыяльна вырашчанага саджанца, а ідзе атожылкам ад другога, ужо дарослага дрэва. Так і дзяўчына ў той песні пайшла атожылкам ад бацькоўскага кораня, але была аддадзеная ў іншую старану, магчыма, за нелюбімага мужа.

У нашым садзе чатыры вішнёвыя дрэўцы, яшчэ нестарыя. І адно, між іншым, не пасаджанае спецыяльна, а выйшла менавіта «з-пад кораня», ад вішні суседа, якая расце цераз плот.

Сёлета вішня ўрадзіла і ў нашых паўночных краях Беларусі, на Віцебшчыне. Са сваіх невысокіх яшчэ дрэўцаў мы сабралі больш за трыцаць літраў ягад. У свой час мне даводзілася збіраць вішні з дрэў, якія былі вышэйшыя за страху дома. Тут ужо даводзілася выкарыстоўваць высокія драбіны, ды і ўвогуле вешацца па дрэвах, імітуючы рухі нашых папяроднікаў, калі верыць Дарвіну. Столькі, колькі мы сабралі сёлета, зразумела, не патрэбна. Раздалі знаёмым. Дачка ад ягад адмовілася — сваю б, што наспела, упарадкаваць. Пазваніў сябру па ўніверсітэце Сцяпану Нефідовічу на Палессе. Там таксама багаты ўраджай. Даймалі толькі шпакі, якіх вельмі вабілі спелыя ягады. Хапала птушачак і ў нас. Цікава было суцішыцца на лавачцы і назіраць, як шпак, а то і вераб'ечык, прылятае на вішню, садзіцца ціхенька на галінку. І пачынае дзяўбсці ягадзіну. Вельмі часта яна, спелая, абрываецца, падае на зямлю. Прычым гук ад гэтага падзення даволі адчувальны. Тут птушачка палохаецца, замірае, а то і пырсне з галінкі. Толькі праз некалькі хвілін абавязкова вяртаецца.

Вішнёвы сад здаўна стаіць ля беларускай вясковай ды і шляхецкай хаты. У Аркадзя Смоліча ёсць апісанне беларускіх прысад пачатку XX стагоддзя. Там абавязкова прысутнічае і вішня. А вось з народнага:

А ў майго татульскі
тры сады зялёных,
Чацвёрты вішнёвы.
У адным садочку зязюля кукуе,
У другім садочку салавей шчабечыць,
У трэцім садочку канёчак капчыць,
У чацвёртым садочку маланачка плачыць.

Існаваў карагод, танец «Вішанька». Асноўным элементам яго было адначасовае кружэнне дзяўчат пад рукамі хлопцаў і вакол іх. То «кісць у кісць», то накрыж перад сабой. А на Каляды заводзілі гульню, якая называлася «Ірваць вішаньку». Дзяўчына станавілася на ўслон, два хлапцы ахоўвалі яе, а іншыя імкнуліся прарвацца і вуснамі схапіць даўгую саломінку, якую дзяўчына таксама трымала ў вуснах. Калі гэта ўдавалася — дзяўчына абавязана была пацалаваць шчасліўца.

У ранняга Пімена Панчанкі ёсць верш «Вішня». Цнатлівы і вельмі народны па сваёй сутнасці:

Пра нашу далёкую ростань
Стрывожаны вецер пяе...
Я вішню у гонар сяброўства
Саджу каля хаты твае.
Вясной яна з кветак прыгожых
Накіне вясёлы убор.
Ты ўспомніш пра слаўныя ночы,
Калі мы сядзелі да зор.

Згадаў гэта і тут жа ўспомніў крыху іншае. Таксама ранні Аляксандр Пушкін. Быў, быў і ў яго верш «Вішня». Уключаны ён у толькі поўныя зборы твораў паэта. І там гарэзнік-ліцэіст піша таксама пра дзяўчыну, але ж і пра раструшчаную вішню.

Нехта чытаў, нехта глядзеў у шматлікіх пастаноўках і экранізацыях «Вішнёвы сад» Антона Чэхава. П'еса па ўсёй сваёй сутнасці трагічная. І вішнёвы сад тут не проста дрэвы, якія прадпрымальныя людзі высякаюць, каб паставіць дачныя домікі. Гэта — развітанне для герояў з мінулым, магчыма, не такім і справядлівым, не такім і бездакорным, але адназначна мілым. І заканчваецца п'еса рэмаркай, якую не буду перакладаць, каб не страціць смакаты чэхаўскага слова:

«Слышится отдаленный звук, точно с неба, звук лопнувшей струны, замирающий, печальный. Наступает тишина, и только слышно, как далеко в саду топором стучат по дереву»

У маіх Паставах ёсць свой «Вішнёвы сад». Так назваў сваю фірмовую краму мясцовы кансервавы завод. Тут, акрамя самай разнастайнай прадукцыі прадпрыемства, прадаецца і таннае віно, таксама вытворчасці завода. І сярод мясцовых мужчын карыстаецца гэта крама немалой славай. Усё ў тым, што сюды можна прынесці пустыя бутэлькі і, здаўшы іх, набыць поўную ўжо з вадкасцю, дзе, магчыма, зрэдзь часу сустракаецца і вішнёвы сок. Не ведаю, ці ўспамінаюць наведвальнікі гэтай крамы пра вішнёвы сад Чэхава, пра іншыя вішнёвыя сады, але мясцовае віно ім падабаецца.

Зноў жа, не баючыся папроку ў залішняй прыхільнасці да рускай літаратуры (на якой мы ў многім і выгадаваныя) не магу не ўспомніць Міхаіла Шолахава. Яго «Узнятую цаліну» ставяць значна ніжэй «Ціхага Дона». І тут, на мой погляд, не маюць рацыі. Проста ўдумліва, а можна, і з алоўкам у руках, прачытайце «Цаліну». Гэта зусім не апявання сацыялістычнага пераўтварэння тагачаснай вёскі, данскіх станіц і хутароў. Шолахаў, безумоўна, павінен быў гаварыць «за» калгасную будаўніцтву. Але як ён гэта гаварыў... У яго камуніст Нагульнаў гатовы страляць з кулямёта і дзяцей, і старых толькі дзеля перамогі сусветнай рэвалюцыі. І ў той жа час вораг калгаснага будаўніцтва Астраўноў мае сваю праўду. Не пакладаючы рук, ён і яго сям'я ствараліся свой дабрабыт, апрацоўвалі зямлю — і раптам усё трэба аддаць у агульны кацёл. Ды па сучасных мерках Астраўноў — фермер, які заслугоўвае толькі заахвочвання. Але вернемся да вішні. Пачынаецца раман Шолахава з такога пранізліва-га ўступу, што яго таксама перакладаць нельга.

«В конце января, овеянные первой оттепелью, хорошо пахнут вишневые сады. В полдень где-нибудь в затишке (если пригревает солнце) грустный, чуть внятный запах вишневой коры поднимается с пресной сыростью талого снега, с могучим и древним духом проглянувшей из-под снега, из-под мертвой листвы земли.

Тогда многоцветный аромат устойчиво держится над садами до голубых потемок, до поры, пока не просунется сквозь голызины ветвей крытый прозеленью рог месяца, пока не кинут на снег жирующие зайцы опушенных крапин следов...»

Працытаваў гэта пра данскую вішню і ўспомніў былога сябра, які некалі служыў у ракетнай дывізіі ў нашых Паставах, быў вельмі цікавым паэтам. Ён вярнуўся на свой родны Дон, пад свае багатыя вішнёвыя сады. Сувязі неяк абарваліся, ведаю толькі, што былы маёр Савецкай Арміі, па-казачаму есавул, стаў там станічным атаманам.

Але і ў нас на Беларусі большае вішнёвых садоў. А колькі назваў звязана з гэтым родам дрэўных раслін сямейства ружакветных, што па лаціне Cerasus? Вішневы, Вішні, Вішнеўкі...

Быў у нашай старадаўняй гісторыі слынны і заслужаны род князяў Вішнявецкіх. Іх продак Міхаіл валодаў замкам Вішнявец, адкуль і пайшло прозвішча князяў.

А сярод іх былі:

Дзмітрый Іванавіч — адзін з кіраўнікоў барацьбы ў XVI стагоддзі супраць турак і татараў.

Ірамі Міхал — найбуйнейшы магнат, які валодаў дзесяткамі гарадоў і мястэчак, быў праціўнікам цэнтралізацыі Польскай дзяржавы ў XVII стагоддзі.

Міхал, які нядоўга пабыў каралём Рэчы Паспалітай.

Міхал Серванцы, які ў XVIII стагоддзі быў адным з кіраўнікоў беларускай шляхты супраць Сапегаў, гетман польны, ваявода Віленскі, канцлер.

А да вішні ж ёсць яшчэ і чарэшня. Праўда, у нашых, паўночных мясцінах яна практычна не сустракаецца. Яе смакатой карыстаюцца беларусы, што жывуць значна больш на поўдзень.

Прадчуваю ўсмешку чытача: а Багдановіча так і не ўспомніў. Ну, як жа не ўспомніць радкі нашага непараўнальнага Максіма-кніжніка!

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні яганёк,
Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Алесь КАСЦЕНЬ.
г. Паставы.

Вынік напружанай працы

Міністэрства прамысловасці Рэспублікі Беларусь падтрымлівае вылучэнне на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2008 г. у галіне навукі і тэхнікі работу «Распрацоўка і асваенне вытворчасці сямейства кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці з электрамеханічнай трансмісіяй».

РУВП «Беларускі аўтамабільны завод» уваходзіць у лік вядучых сусветных вытворцаў кар'ернай тэхнікі — такіх, як «Komatsu Ltd» і «Caterpillar Inc». І гэта стала заканамерным этапам далейшага ўдасканалення канструкцыі самазвалаў, павелічэння іх грузападымальнасці, пастаноўкі на вытворчасць новых мадэляў і выпуску сучасных, канкурэнтных з лепшымі сусветнымі аналагамі кар'ерных самазвалаў, павышэння ў свеце іміджу прадпрыемства і рэспублікі ў цэлым, заваёўвання новых рынкаў збыту.

У канструкцыі самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці новага пакалення знайшлі прымяненне прагрэсіўныя тэхнічныя рашэнні па цэлым шэрагу сістэм і вузлоў. Гэта сучасныя дызельныя рухавікі з электроннай сістэмай кіравання і дыягностыкі, электрамеханічная трансмісія з электроннай сістэмай кіравання, пнеўмагідраўлічная падвеска з нізкім каэфіцыентам трэння і высокай плаўнасцю ходу, аб'яднаная гідраўлічная сістэма з высокім узроўнем уніфікацыі.

У працэсе работы спецыялістамі завода сумесна з супрацоўнікамі навуковай сферы рэспублікі вырашаны шэраг навукова-тэхнічных праблем у наступных галінах:

— стварэння арыгінальных алгарытмаў і кіруючага праграмнага забеспячэння для аптымізацыі працэсу кіравання велікагрузнымі кар'ернымі самазваламі па крытэрыях найлепшай эканамічнасці і высокай бяспекі;

— тэорыі прымянення літых элементаў у складзе нясучых канструкцый;

— аптымізацыі канструкцый і тэхналогіі вырабу буйнагабарытных каронных шасцерняў рэдуктараў матор-колаў;

— павышэння зносаўстойлівасці кузаваў.

Усё гэта ўяўляе асабліву значнасць для развіцця беларускага машынабудавання ў цэлым.

Канструкцыя валодае патэнтнай чысцінёй у адносінах да РБ, РФ, Украіны, Швецыі, ЗША, Японіі, што пацвярджаецца параўнальным аналізам канструкцыйных рашэнняў кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці і патэнтуемых тэхнічных рашэнняў вядучых вытворцаў «Komatsu Ltd» і «Caterpillar Inc».

Навізна тэхнічных рашэнняў, выкарыстаных пры стварэнні кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці да 220 тон, з'явілася асновай канцэпцыі стварэння кар'ерных самазвалаў новага шэрагу машын грузападымальнасцю да 320—350 тон.

Дадзены вынік — заканамернасць напружанай працы ўсяго калектыву завода: рабочых, канструктараў, тэхнолагаў, заканамернасць граматнай інавацыйнай і маркетынгавай палітыкі кіраўніцтва прадпрыемства. Надзейная, высокапрадукцыйная работа тэхнікі «БелАЗ» на кар'ерах блізкага і далёкага замежжа — лепшае таму пацвярджэнне, а вылучэнне калектыву аўтараў у складзе генеральнага канструктара начальніка навукова-тэхнічнага цэнтра БелАЗа Аляксандра Мікалаевіча Егорава, галоўнага тэхнолага прадпрыемства Віктара Віктаравіча Рудога і начальніка аддзела электрамеханічных трансмісій, намесніка генеральнага канструктара Мікалая Віктаравіча Бігеля на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2008 года — гэта яшчэ адзін крок на шляху прызнання поспехаў БелАЗа ва ўмацаванні пазіцый беларускай кар'ернай тэхнікі на сусветным рынку.

Кар'ерны самазвал БелАЗ-75306 грузападымальнасцю 220 тон, за распрацоўку якога прадстаўнікі прадпрыемства вылучаюцца на Дзяржаўную прэмію.

Кароткі змест работы, якая вылучаецца на Дзяржаўную прэмію

Назва работы: «Распрацоўка і асваенне вытворчасці сямейства кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці з электрамеханічнай трансмісіяй».

У канструкцыі самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці новага пакалення (самазвалаў сямейства БелАЗ-7513 грузападымальнасцю 130—136 тон і сямейства БелАЗ-7530 грузападымальнасцю 200—220 тон) знайшлі прымяненне прагрэсіўныя тэхнічныя рашэнні па цэлым шэрагу сістэм і вузлоў: сучасныя дызельныя рухавікі з электроннай сістэмай кіравання і дыягностыкі, электрамеханічная трансмісія з электроннай сістэмай кіравання на аснове сучаснай мікрапрацэсарнай тэхнікі, пнеўмагідраўлічная падвеска з нізкім каэфіцыентам трэння і высокай плаўнасцю ходу, аб'яднаная інтэграваная гідраўлічная сістэма рулявога кіравання, тармазоў і перакульнага механізма кузава з высокім узроўнем уніфікацыі.

Для скарачэння тэрміну пастаноўкі новай прадукцыі на вытворчасць праведзена рэканструкцыя вытворчай базы на аснове гнуткіх тэхналогій па ўсіх тэхналагічных перадзелах, канструктарскай і даследчай базы з выпрабавальным комплексам і палігонам.

Дзякуючы праведзенаму тэхнічнаму пераўзбраенню праектаванне самазвалаў асабліва высокай грузападымальнасці ажыццяўляецца з дапамогай сучаснай камп'ютарнай тэхнікі і станцый аб'ёмнага праектавання, што дазваляе распрацоўваць канструктарскую дакументацыю на высокім узроўні і скараціць тэрмін асваення новай тэхнікі з мінімальнымі дапрацоўкамі па выніках доследных выпрабаванняў.

Цяпер на БелАЗе створаны ўсе ўмовы для пераходу ў бліжэйшы час да GALS-тэхналогій, або выкарыстання камп'ютарнай падтрымкі вытворчасці вырабаў на ўсіх этапах жыццёвага цыкла прадукцыі — ад яе распрацоўкі, падрыхтоўкі вытворчасці да выпрабаванняў, паставак і эксплуатацыі.

У рабоце выкарыстаны шэраг абароненых патэнтамі вынаходстваў; сааўтарам двух вынаходстваў з'яўляецца А.М. Егораў, аўтарамі яшчэ двух — В.В. Руды і М.В. Бігель.

За кошт арыгінальнай канструкцыі пнеўмагідраўлічнай падвескі з нізкім каэфіцыентам трэння самазвалы БелАЗ асабліва высокай грузападымальнасці значна пераўзыходзяць канкурэнтаў па плаўнасці ходу і манеўранвасці, а па суадносінах іх кошту да якасных паказчыкаў кошт перавезенай тоны грузу з'яўляецца самым нізкім у гэтым класе машын.

У выніку прымянення электронных метадаў дыягностыкі сістэм самазвалаў пры дапамозе бартавых камп'ютараў і экспрэс-метадаў вызначэння стану працаздольнасці нагружаных вузлоў па стане змазачных матэрыялаў своечасова выяўляюцца праблемныя месцы, а за кошт арыгінальнай канструкцыі вузлоў самазвалаў з добрым доступам і рамонтаздольнасцю значна скарачаецца час на іх тэхнічнае абслугоўванне і рамонт.

Плануемы аб'ём продажу ў 2008 годзе самазвалаў грузападымальнасцю 130—136 тон сямейства БелАЗ-7513 — 270 адзінак, грузападымальнасцю 200—220 тон сямейства БелАЗ-7530 — 80 адзінак.

Пры рэалізацыі ўказанай тэхнікі плануецца атрымаць выручку: у выніку паставак самазвалаў сямейства БелАЗ-7513 — у суме 229 311 000 долараў ЗША, самазвалаў сямейства БелАЗ-7530 — у суме 112 224 000 долараў. Прыбытак ад іх рэалізацыі павінен склаці, адпаведна, 27 597 780 і 13 506 257 долараў ЗША.

Сацыяльна-эканамічны эфект ад рэалізацыі праекта для краіны: агульная сума падаткаў з выручкі і прыбытку ад рэалізацыі ўказанай тэхнікі павінна скласці 17 928 790 долараў ЗША.

У цэху зборкі «малых» кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю ад 30 да 55 тон.

СТАТУС СУСВЕТНАГА ЛІДАРА

Так зазначаюць у вытворчым аб'яднанні БелАЗ

Сённяшняя дзейнасць аб'яднання БелАЗ праходзіць пад знакам дзвюх прыемных падзей. Першая з іх: БелАЗу сёлета спаўняецца 60 гадоў. Другая: група аўтараў — супрацоўнікаў БелАЗа вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі ў 2008 годзе. Хто гэтыя аўтары? Гэта Аляксандр Мікалаевіч Егораў, Віктар Віктаравіч Рудзы, Мікалай Віктаравіч Бігель.

Такім чынам, наша сённяшняя публікацыя — пра БелАЗ і прадстаўленую на атрыманне Дзяржаўнай прэміі работу.

Калі мы знаёміліся з дзейнасцю БелАЗа, з яго людзьмі, неаднаразова чулі слова «ўнікальны». Пры гэтым такім азначэннем ганаравалася сама тэхніка, што выпускаецца тут, абсталяванне, задзейнічанае пры гэтым, тэхналогіі, само прадпрыемства. У гэтых словах быў непадробны гонар завадчан за сваю работу і за сваё прадпрыемства.

І ганарыцца ім, насамрэч, ёсць чым. Сапраўды ўнікальныя машыны, сабраныя іх рукамі, за ўсю гісторыю прадпрыемства пастаўляліся больш чым у 70 краін свету (за ўсю гісторыю БелАЗа выпушчана больш за 130 тысяч аўтамабіляў звыш 500 мадэляў і мадыфікацый). БелАЗ, без ніякага перабольшання, крочыць у групе лідараў-вытворцаў кар'ерных самазвалаў, ідзе ўпоравень з такімі прызнанымі сусветнымі грандамі ў гэтай галіне, як амерыканскі «Катэрпілер» і японскі «Камацу»; гэтыя грандыцяпер нават прыязджаюць на БелАЗ «на савет». Сёння БелАЗу, па некаторых дадзеных, належыць не менш чым 30 працэнтаў сусветнага рынку; на ім пастаўлены на канвеер сотні найменняў кар'ернай транспартнай тэхнікі грузападымальнасцю ад 30 да 220 тон. І гэта разнастайнасць асабліва радуе спажыўца. Але вось закавыка: падчас прыёму адной з замежных дэлегацый

Начальнік тэхбюро зваршчага цэха Андрэй ПЯТРОЎ і тэхнік-тэхнолаг Ігар ДВАРАКОЎСКІ.

(а такіх дэлегацый на БелАЗе штогод бывае вельмі шмат) генеральны канструктар Аляксандр Егораў паскардзіўся: практычна няма чаго паказаць. Чаму так здарылася? Белазаўскі складскі двор — амаль абсалютна пусты, белазаўская тэхніка — у кар'ерах, у рабоце, па гэту тэхніку — чарга. Гэта нам пашанцавала, і мы змаглі ўбачыць адну з апошніх навінак прадпрыемства: вялізны, вышынёй пад тры паверхі, БелАЗ-75600 грузападымальнасцю 320 тон — не паспелі адправіць спажыўцу. Такіх машын — па-

І далікатным жаночым рукам падуладнае стварэнне магутных машын. На здымку слесар Юлія ЗАРЭМБА.

куль што тры: яшчэ адна ўжо працуе ў Кузбасе, другая — на выпрабаваннях. А на канвееры ўжо збіраюцца чарговыя 320-тоннікі. Стоячы побач з гэтым гігантам, прыгадалі, як нам паказвалі «маленькія» БелАЗы — гэта былі машыны вышынёй усяго пад два паверхі... Дарэчы, можа, не ўсе цяперашнія завадчане і ведаюць, але на прадпрыемстве некалі, гадоў 10 таму, разбіралі сцяну, каб пашырыць вароты ў цэху і выкаціць з яго новую мадэль машыны.

Папулярнасць белазаўскіх транспартных кар'ерных самазвалаў грунтуецца, зразумела, не на іх знешняй маштабнасці і велічнасці, хоць апошнія і ўражваюць. Папулярнасць белазаўскай тэхнікі заснаваецца ў першую чаргу на яе бездакорнай рабоце, выдатных эксплуатацыйных і тэхнічных якасцях. Ну, вось такі цікавы і красамоўны факт, знойдзены на сайце прадпрыемства. 10 сакавіка гэтага года Беларускі аўтазавод наведала дэлегацыя з Вялікабрытаніі на выкручваюць руль, але яны кіруюць гэтым гігантам быццам легкавым аўтамабілем». Так гаворыць лорд, а вось ужо больш аўтарытэтнае сведчанне генеральнага канструктара прадпрыемства: «Лічым, што наша тэхніка лёгкая ў кіраванні, і цяжкасцяў з навучаннем (кіраванні ёй. — Рэд.) не можа быць, як і пры навучанні, напрыклад, ваджэнню УАЗа, ЗіЛа, ГАЗа і іншых аўтамабіляў».

Папулярнасць БелАЗа заснаваецца і на гэтках трапятках адно-

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, БелАЗ!

чале з брытанскім палітыкам членам палаты лордаў Паркінсонам. Пры гэтым дэлегацыю звазілі на выпрабавальны палігон прадпрыемства і яе членам прапанавалі праехаць на 320-тонніку, які там быў, у якасці пасажыраў. Пасля гэтага лорд з захапленнем сказаў: «Я знаходжуся пад вялікім уражаннем! У такога вялізнага самазвала такі плаўны ход. Быў упэўнены, што ваздзеле гэтых машын з цяжкасцю сінах работнікаў яго калектыву, спецыялістаў да спажыўцоў. Напярэдзе, у іншых матэрыялах, будзе трохі зазначана пра тое, якую ўвагу тут надаюць сэрвіснаму абслугоўванню тэхнікі. Тут жа варта спыніцца на гэтым асобна. Белазаўскі сэрвіс, у прыватнасці, прадугледжвае: увод машын у эксплуатацыю, яе гарантыйнае абслугоўванне, абанентнае тэхнічнае абслугоўванне і рамонт (так званы поўны сэрвіс), мадэрнізацыю і аднаўленне тэхнікі, пастаўку запасных частак і абсталяванняў, удзел у наладцы і рэгуляванні вузлоў і агрэгатаў самазвалаў у месцах іх эксплуатацыі, навучанне (непасрэдна на прадпрыемстве) прадстаўнікоў спажыўца правілам эксплуатацыі самазвалаў і іх тэхнічнага абслугоўвання і шмат чаго іншага. На прадпрыемстве кіруюцца наступным прынцыпам сэрвіснага абслугоўвання: поўная адказнасць за працаздольнасць тэхнікі на працягу ўсяго тэрміну яе эксплуатацыі. Прадпрыемства, быў час, не магло поўнасцю забяспечыць сваіх спажыўцоў запаснымі часткамі. На гэта кіраўніцтва адрэагавала такім чынам: «Наш спажывец не павінен адчуваць дэфіцыту запасных частак, гэта прыводзіць да зніжэння ступені яго задавальнення». Тут жа можна дадаць, што, ідучы па ўсіх пытаннях насустрач спажыўцу, на БелАЗе, пачынаючы з 2006 года, пачалі выпускаць свае машыны ў так званай індывідуальнай камплектацыі. Гэта значыць, у той камплектацыі, камплектацыі тых вытворцаў, якую хоча бачыць спажывец. Шчыра сказаць, пакуль што, напэўна, не так шмат знойдзецца ў нас вытворцаў, якія выказвалі б такую павагу да спажыўца.

БелАЗ развіваецца. Апошнім часам наменклатурная лінейка прадпрыемства пашырана за кошт рас-

«Мы працуем на дабрабыт беларускага народа. І не толькі на яго дабрабыт...»

— Мы працуем на дабрабыт беларускага народа. І не толькі на яго дабрабыт, але і на дабрабыт расійскага народа, народаў іншых краін СНД, — сказаў падчас гутаркі Аляксандр Мікалаевіч. — Менавіта наша тэхніка непасрэдна ўдзельнічае ў працэсе здабычы прыродных багацця ў зямлі. Наша прадпрыемства ў гэтым плане, не пабаюся гэтага сказаць, — унікальнае, яно з'яўляецца адзіным прадпрыемствам на тэрыторыі СНД, на якім вырабляюць такую магутную колавую тэхніку; унікальныя самі машыны. Ну, а наконт таго, якое распаўсюджанне знайшлі нашы БелАЗы, — добра сведчыць статыстыка. Яны працуюць у кар'ерах не толькі дзяржаў СНД, але і іншых краін, у тым ліку — далёкага замежжа. Так, у мінулым годзе БелАЗы экспартаваліся больш чым у 30 краін. Як падлічылі статыстыкі, у свеце парк БелАЗаў сярод усіх кар'ерных самазвалаў складае прыкладна трэцюю частку.

— Аляксандр Мікалаевіч, калі гавораць пра аўтамабілі такога класа, звычайна праводзяць аналогіі з вядомымі амерыканскімі машынамі «Катэрпілер» і японскімі «Камацу». Як на іх фоне глядзяцца нашы БелАЗы, у прыватнасці новыя аўтасамазвалы асабліва вялікай грузападымальнасці?

— Перш за ўсё зазначу, што тэхніка названых і іншых вядучых замежных фірмаў, сапраўды, вызначаецца сваімі немалымі вартасцямі, і нам у гэтых фірмаў давялося нямала чаму павучыцца. Асабліва складанымі як для нас, так і для нашых партнёраў з СНД былі 90-я гады. Тады тыя ж «Катэрпілеры» і «Камацу» ў нямала якіх горназдабыўных кар'ерах на тэрыторыі СНД пачалі яўна выцясняць БелАЗы (так, на ўсёй постсавецкай прасторы працавала каля 600 «Камацу»). Чаму гэта здарылася? У першую чаргу таму, што рынак запатрабаваў больш магутнай тэхнікі, грузападымальнасцю больш за 100 тон, даць якую на той час мы пакуль што не маглі. Разам з тым на прадпрыемстве былі вельмі правільна і своечасова ўлічаны тэндэнцыі сусветнага развіцця ў дадзеным накірунку, і адпаведныя ўзоры з'явіліся і ў нас (размова якраз і ідзе пра аўтасамазвалы асабліва вялікай грузападымальнасці — 130—136 тон і 200—220 тон). Пры гэтым на БелАЗе была праведзена, па сутнасці, беспрэцэдэнтная рэканструкцыя (зразумела, пад новыя аўтасамазвалы), адпаведна — мы рызыкнулі пайсці на маштабныя замежныя крэдыты. Словам, мы ў гэтыя нялёгкія для нас гады змаглі распрацаваць, выпрабаваць і паставіць на серыйную вытворчасць шэраг новых самазвалаў, і ў першую чаргу — менавіта самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці. І гэта тэхніка знайшла свой добры шлях да пакупнікоў. Наприклад, у кар'ерах Расіі (а яе горныя прадпрыемствы з'яўляюцца нашымі асноўнымі партнёрамі) пераход на гэтыя аўтасамазвалы адбыўся мякка і небалюча, без нейкіх там праблем. Гэта тэхніка заваявала сваё прызнанне тым, што яе прадукцыйнасць, эканамічнасць былі калі не на парадак, то ў разы вышэйшыя ў параўнанні з тэхнікай, якая выпускалася ў нас да 90-х гадоў. Прычым дасягнутыя паказчыкі, у тым ліку такі важны, як надзейнасць, аказаліся параўнальнымі з паказчыкамі аналагічнай замежнай тэхнікі, а ў многіх выпадках — і пераўзыходзілі іх. І ўжо цяпер, напрыклад, уся расійская горная прамысловасць выкарыстоўвае толькі БелАЗы, а цяперашнія расійскія вытворцы, варта зазначыць, — вельмі прагматычныя. Словам, усе нашы колішнія разлікі, наша стаўка на стварэнне аўтасамазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці — апраўдаліся...

<u>Неабходнае дапаўненне.</u> Ужо згаданая рэканструкцыя прыўнесла шмат новага і прагрэсіўнага не толькі ў вытворчасць, але і ў само праектаванне машын. Так, увесь гэты працэс практычна поўнасцю камп'ютарызаваны; на камп'ютарных мадэлях праводзяцца разлікі па многіх характарыстыках будучага аўтамабіля, у тым ліку на яго канструкцыйную трываласць; найбольш адказныя вузлы і дэталі «выконваюцца» ў трохмерным, аб'ёмным мадэляванні, што таксама забяспечвае іх будучую трываласць і надзейнасць.

— Які тэрмін можа эксплуатавацца кар'ерная тэхніка БелАЗа?

— Аптымальны тэрмін — 7 гадоў, прычым пры практычна бесперапыннай эксплуатацыі — у тры змены, 360 дзён у годзе; агульны прабег самазвала за год — каля 100 тысяч кіламетраў. Але мы маем нямала прыкладаў, калі нашы самазвалы эксплуатуюцца па 10 і болей гадоў.

— Як цяпер абнаўляецца ваша кар'ерная аўтамабільная тэхніка?

— Мы павінны мець штогадовы паказчык не меншы за 40 працэнтаў (з улікам таго, што ў нас да такой, абноўленай, тэхнікі адносіцца тая, што пастаўлена на вытворчасць не больш за тры гады таму), а фактычна выходзім на 50 і болей. Абнаўленне ідзе ў асноўным за кошт мадыфікацыі і мадэрнізацыі існуючых машын. Прынцыпова новыя класы іх, новыя сямействы ствараюцца не так ужо часта. У цэлым гэта даволі складаны і працаёмкі працэс, які займае да 4 гадоў — з таго моманту, як было прынята рашэнне аб адпаведнай распрацоўцы новай машыны, і да таго часу, калі з'яўляецца доследны ўзор, пры гэтым машына прайшла выпрабаванні на нашым выпрабавальным палігоне.

— Не так даўно ваша прадпрыемства прадставіла новы ўнікальны ўзор — кар'ерны самазвал грузападымальнасцю 320 тон...

— Так, і гэта з'яўляецца чарговым выдатным набыткам калектыву. Першае шасі грузападымальнасцю 320 тон ужо працуе ў Кузбаскім вугальным разрэзе; з нагоды яго пастаўкі ў Кузбас тут былі арганізаваны спецыяльныя ўрачыстасці, на якіх беларускіх распрацоўшчыкаў кар'ернай транспартнай тэхнікі вітаў губернатар края Аман Тулееў. А ўсіх 320-тоннікаў выраблена ўжо тры, два новыя шасі рыхтуем да адгрузкі.

— На прадпрыемстве важная роля надаецца выпрабаванням выраблennай тэхнікі. Што ўвахоодзіць у гэтыя выпрабаванні?

— У нас, як зазначана ўжо вышэй, ёсць спецыяльны палігон, на якім мы можам праводзіць поўны комплекс адпаведных выпрабаванняў (акрамя напрацоўкі аўтасамазвалаў на рэсурс машын — гэта вызначаецца ўжо ў рэальных умовах горнага кар'еру). Увогуле, у тэхнічным заданні, якое папярэднічае праектаванню машыны, даводзіцца шэраг параметраў, якія яна павінна мець: максімальная хуткасць, час разгону да максімальнай хуткасці, радыус павароту, тармазны шлях, эфектыўнасць тармазоў... На нашым выпрабавальным палігоне створаны ўчасткі дарог, якія цалкам імітуюць кар'ерныя ўмовы, а таксама ўзведзены спецыяльныя збудаванні і ўстройствы для паскораных выпрабаванняў, якія даюць каэфіцыент паскарэння, роўны дзевяці...

Да слоў Аляксандра Мікалаевіча варта дадаць: на прадпрыемстве таксама створаны эксперыментальны цэх са спецыяльным участкам для стэндавых выпрабаванняў найбольш адказных вузлоў і дэталяў кар'ерных самазвалаў. Тут устаноўлены набор сілавых цыліндраў, якія ўздзейнічаюць на пэўныя дэталі і вузлы, вызначаючы момант іх разрыву, колькасць максімальных рабочых цыклаў і г.д., і якімі кіруе цэнтральны камп'ютар (на апошнім апрацоўваецца і аналізуецца ўся атрыманая інфармацыя). Выпрабаванні таксама праходзяць пэўныя ўзоры сталі, якая ідзе на выраб найбольш адказных дэталяў і вузлоў. Велічыню нагрузкі, якая ўздзейнічае на дэталі і вузлы, што выпрабоўваюцца, можна абазначыць наступным чынам: у адносінах да гэтай нагрузкі максімальная рабочая нагрузка дэталяў і вузлоў, падчас эксплуатацыі аўтамабіляў, складае каля 80 працэнтаў. Для чаго патрэбны ўсе гэтыя выпрабаванні? «Яны ў асноўным праводзяцца пры стварэнні новай тэхнікі, а таксама пры канструкцыйных змяненнях вузлоў і ў некаторых іншых выпадках. Вынікі выпрабаванняў абавязкова ўлічваюцца канструктарамі падчас іх далейшай работы. Мэта такіх выпрабаванняў — папярэдзіць магчымыя паломкі аўтамабіля, выправіць якія абышлося б намнога даражэй, чым правядзенне саміх выпрабаванняў», — падкрэсліваюць спецыялісты выпрабавальнага ўчастка.

— Аляксандр Мікалаевіч, нават самыя выдатныя дасягненні канструктараў часам можа звесці на нішто дрэнна наладжаная служба тэхнічнага сэрвісу...

— Арганізацыя сістэмы сэрвісу, тэхнічнага абслугоўвання нашай тэхнікі — гэта асобная тэма размовы. Разам з тым зазначу: мы на прадпрыемстве вельмі добра разумеем значэнне гэтага накірунку па пашырэнні і прысутнасці тэхнікі БелАЗа на сусветным рынку, надзейным замацаванні яе там; добра наладжаны сэрвіс — гэта таксама адзін з найважнейшых момантаў яе канкурэнтаздольнасці. Наша сістэма сэрвісу цесна пераплецена з нашай тавараправодзячай сеткай; мы маем на тэрыторыі СНД 22 сэрвісныя цэнтры, каля 10 цэнтраў — у краінах далёкага замежжа. Гарантыйны тэрмін службы нашай тэхнікі — два гады. Вядома, падчас гэтага тэрміну ажыццяўляем яе гарантыйнае абслугоўванне. Разам з тым, добра разумеючы, што для спажыўца гэта тэхніка не такая ўжо простая, не адмаўляемся і ад постгарантыйнага абслугоўвання.

Ухіл — на самыя на

— Кар'ерныя аўтасамазвалы грузападымальнасцю 130—136 тон і 200—220 тон, або самазвалы асабліва высокай грузападымальнасці, з'яўляюцца на сёння адным з найбольш запатрабаваных у горназдабытчыкаў, — зазначыў у размове Віктар Віктаравіч. — Пастаўляем пераважна ў Расію, Казахстан, на Украіну; разам з тым прыйшліся даспадобы гэтыя машыны і ў краінах далёкага замежжа. Так, каля двух гадоў таму першая партыя самазвалаў БелАЗ-75306 (гэта самазвалы грузападымальнасцю 220 тон) была адпраўлена ў Аўстралію. Гэтыя машыны (як «пад 220», так і «пад 130» тон) ужо добра сябе зарэкамендавалі ў спажыўцоў па сваіх вартасцях, сваіх эксплуатацыйных, тэхніка-эканамічных паказчыках і ніколькі не ўступаюць кар'ернай транспартнай тэхніцы, выраблenай такімі сусветна вядомымі замежнымі фірмамі, як «Катэрпілер» і «Камацу».

— Віктар Віктаравіч, належная падрыхтоўка вытворчасці да выпуску пэўных машын — гэта не менш адказны і, можа, нават больш складаны працэс, чым само праектаванне іх. Ці складана было правесці падрыхтоўку вытворчасці да выпуску самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці?

— Безумоўна, гэта было не зусім проста. Ужо па габарытах са-

ПРАДСТАЎЛЯЕМ АЎТАРА: ***Віктар Віктаравіч РУДЫ, першы намеснік галоўнага інжынера ВА «БелАЗ», галоўны тэхнолаг.***

Прыйшоў на «БелАЗ» у 1982 годзе пасля заканчэння Беларускага тэхнічнага ўніверсітэта; факультэт — «Робаты і робататэхнічныя сістэмы». Практычна ўвесь час працаваў у галіне падрыхтоўкі вытворчасці і распрацоўкі тэхналогій, займаў пасады інжынера-тэхнолага, інжынера-праграміста па падрыхтоўцы кіруючых праграм для станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем, намесніка начальніка аддзела. Галоўным тэхнолагам з'яўляецца з 2000 года.

Віктар Віктаравіч Руды ўдзельнічаў у рэалізацыі праекта тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемства, займаўся падборам абсталявання і ўкараненнем прагрэсіўных тэхналогій, якія забяспечылі аўтасамазвалам асабліва вялікай грузападымальнасці высокую якасць і канкурэнтаздольнасць. Пры непасрэдным удзеле і пад кіраўніцтвам Віктара Віктаравіча праводзіліся распрацоўка і выраб прагрэсіўнага інструменту і тэхналагічнай аснасткі для станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ АЎТАРА: ***Віктар Віктаравіч РУДЫ, першы намеснік галоўнага інжынера ВА «БелАЗ», галоўны тэхнолаг.***

Прыйшоў на «БелАЗ» у 1982 годзе пасля заканчэння Беларускага тэхнічнага ўніверсітэта; факультэт — «Робаты і робататэхнічныя сістэмы». Практычна ўвесь час працаваў у галіне падрыхтоўкі вытворчасці і распрацоўкі тэхналогій, займаў пасады інжынера-тэхнолага, інжынера-праграміста па падрыхтоўцы кіруючых праграм для станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем, намесніка начальніка аддзела. Галоўным тэхнолагам з'яўляецца з 2000 года.

Віктар Віктаравіч Руды ўдзельнічаў у рэалізацыі праекта тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемства, займаўся падборам абсталявання і ўкараненнем прагрэсіўных тэхналогій, якія забяспечылі аўтасамазвалам асабліва вялікай грузападымальнасці высокую якасць і канкурэнтаздольнасць. Пры непасрэдным удзеле і пад кіраўніцтвам Віктара Віктаравіча праводзіліся распрацоўка і выраб прагрэсіўнага інструменту і тэхналагічнай аснасткі для станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем.

Начальнік канструктарскага доследнага бюро эксперыментальнага цэха Юрый ПАНОЧЫН на ўчастку, дзе ўстаноўлены комплекс абсталявання для выпрабаванняў вузлоў самазвала на трываласць.



Не трэба гаварыць пра тыя нагрузкі, якія нясуць у нашых самазвалах зварныя канструкцыі — рамы, платформы. Таму гэтыя вузлы павінны вызначацца асаблівай трываласцю... У нашым зварачным цэху дзейнічаюць тры партальныя зварачныя робататэхнічныя комплексы з плошчай абслугоўвання каля 100 квадратных метраў кож-

АБАВЯЗВАЕ НАС НЕ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

Падчас нядаўніх дзён Беларусі ў Краснаярску: заключаецца пагадненне аб супрацоўніцтве паміж РУВП «БелАЗ» і ТАА «ВА КрасЦяжМаш», якое падпісваюць генеральны дырэктар БелАЗа Пётр ПАРХОМЧЫК (злева) і старшыня савета дырэктараў КрасЦяжМаша А.Р. ТУМАСЯН.

працоўкі і пастаноўкі на вытворчасць новых мадыфікацый 130-тоннага і 220-тоннага самазвалаў; выраблены таксама зусім новыя машыны. На прадпрыемстве распрацаваны праект чарговай рэканструкцыі на 2008—2012 гады; нядаўна завершана рэканструкцыя ліцейнай вытворчасці на Магілёўскім аўтамабільным заводзе (гэты завод адносна нядаўна ўключаны ў састаў БелАЗа), што прывядзе да зусім новай якасці адлівак, а таксама да максімальнага выкарыстання ў кампаноўцы белазаўскіх машын літых канструкцый замест зварных і, адпаведна, да далейшага павышэння надзейнасці белазаўскай тэхнікі. На прадпрыемстве прагназуюць перспектыву, калі распрацоўка адкрытых кар'ераў пачне саступаць з падземнымі выпрацоўкамі. А значыць, зноў-такі спажыўцам спатрэбіцца адпаведная тэхніка. Значыць, патрэбна мець пэўныя напрацоўкі па ёй ужо сёння. І яны ўжо з'явіліся.

У 1958 годзе з канвеера завода сышоў першы 25-тонны МАЗ, вытворчасць якога была перададзена з Мінскага аўтамабільнага завода, а 14 верасня 1961 года з заводскіх варотаў выйшаў ужо першы 27-тонны БелАЗ-540. Тады, як прыгадваюць цяпер асобныя работнікі прадпрыемства, многія хваляваліся: ці паедзе?

Паехаў. І вельмі добра паехаў. За той 27-тонны БелАЗ вялікая група работнікаў прадпрыемства ў 1968 годзе атрымала Дзяржаўную прэмію СССР.

Нямала часу прайшло з тых гадоў. Узмужнеў БелАЗ, нямала ў яго з'явілася дасягненняў і рознага кшталту ўзнагарод. Пералічым больш важкія з іх, што атрыманы за некалькі апошніх гадоў: 2005 год — прадпрыемства прызнана «Лепшым экспарцёрам»; 2006 год — стала лаўрэатам прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці і ўладальнікам першай прэміі за якасць Міністэрства прамысловасці; 2007 год — пацверджана званне лаўрэата прэміі ўрада за якасць, адзначаны самазвал БелАЗ-75306 грузападымальнасцю 220 тон, які становіцца лаўрэатам конкурсу «Лепшыя таварыРэспублікі Беларусь на рынках Расіі». Прадпрыемства мае шэраг міжнародных узнагарод. Яго сістэма менеджменту якасці атэставана на адпаведнасць патрабаванням ИСО 9001-2001 і міжнародным стандартам DIN EN ISO 9001:2000.

У сувязі з юбілеем на прадпрыемстве цяпер праходзіць і іншага роду рэканструкцыя: тут наладжана, па сутнасці, маштабнае добраўпарадкаванне заводскай тэрыторыі. Кладзецца новы асфальт, разбіваюцца кветнікі, ствараюцца маляўнічыя кветкава-камянёвыя кампазіцыі; на прадпрыемстве аб'яўлены спецыяльны конкурс сярод цэхаў і заводскіх службаў на лепшае добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі. «Узорная культура вытворчасці, якая з'яўляецца абавязковым элементам ва ўсёй нашай працы, павінна пачынацца ўжо з прахадной», — падкрэсліваюць на прадпрыемстве.

БелАЗу — 60 гадоў, у верасні завадчан чакаюць віншаванні і пэўныя ўрачыстасці. Да гэтых віншаванняў шчыра далучаемся і мы. А разам з тым хочам пажадаць БелАЗу за ўсімі гэтымі ўрачыстасцямі не забывацца і на тыя праблемы, якія ў яго ёсць. Падчас падрыхтоўкі гэтых матэрыялаў мы пацікавіліся на прадпрыемстве «Граніт» у Мікашэвічах, якое мае ў сваім распараджэнні немалы парк БелАЗаў грузападымальнасцю 42 і 45 тон наконт таго, як яны працуюць. Там далі ў цэлым станоўчую ацэнку гэтым машынам, а разам з тым назвалі і іх асобныя праблемныя месцы, з якімі сутыкаюцца падчас эксплуатацыі.

Безумоўна, такога не павінна быць. БелАЗ, яшчэ раз нагадаем, мае добрую і цалкам заслужаную рэпутацыю. І гэту рэпутацыю тут павінны мацаваць яшчэ болей, да чаго абавязвае ўжо сама вельмі знакамітая марка «БелАЗ».

З днём нараджэння, БелАЗ!

З мэтаў прадпрыемства ў галіне якасці на 2008—2010 гады

** Забяспечыць штогадовае абнаўленне прадукцыі з паляпшэннем яе тэхнічных характарыстык і спажывецкіх уласцівасцяў у межах не меней за 30 працэнтаў.*

** Прадугледзець штогадовы выпуск сертыфікаванай прадукцыі ў адносінах да яе агульнага аб'ёму не меней чым на 75 працэнтаў.*

** Забяспечыць укараненне новых тэхналогій і абсталявання для атрымання літых загатовак.*

** За кошт удасканалення тэхнічнага сэрвісу павысіць узровень задавальнення спажыўца белазаўскай тэхнікай, пры гэтым прадугледзець дасягненне каэфіцыента яе тэхнічнай гатоўнасці не меней чым:*

у першы год эксплуатацыі — 0,9;

у другі год — 0,85;

у трэці год — 0,8.

** Дабіцца штогадовага зніжэння каэфіцыента рэкламацый на 0,001.*

...Стратэгічная мэта прадпрыемства: мець па кар'ернай тэхніцы новага пакалення наступны рэсурс прабегу (да яе спісання) — ад 800 тысяч да 1 мільёна кіламетраў, у залежнасці ад грузападымальнасці.

Новы самазвал грузападымальнасцю 320 тон.

Не ўступаюць лепшым замежным узорам

Яўген БЕРАСТАЎ, прарэктар Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (г. Магілёў), доктар тэхнічных навук, прафесар:

— У складаных умовах перабудовы народнай гаспадаркі краіны кіраўніцтва БелАЗа змагло сфарміраваць калектыў высокакваліфікаваных спецыялістаў, стварыць сучасную высокатэхналагічную вытворчасць і накіраваць агульныя намаганні калектыву на распрацоўку машын новага пакалення. У выніку створана і асвоена новае сямейства кар'ерных аўтасамазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці, якое ўключае ў сябе дзве базавыя мадэлі: БелАЗ-7513 грузападымальнасцю 130—136 тон і БелАЗ-7530 грузападымальнасцю 200—220 тон. На аснове гэтых мадэляў распрацавана мноства мадыфікацый, якія ўлічваюць самыя разнастайныя ўмовы эксплуатацыі і могуць задаволіць любыя патрабаванні заказчыкаў.

Распрацоўка канструкцый гэтых машын зроблена на аснове сучасных камп'ютарных тэхналогій з шырокім выкарыстаннем існуючых праграмных прадуктаў, што дазволіла забяспечыць дэталёвы аналіз трываласці ўсіх элементаў канструкцыі і гарантаваць высокую надзейнасць створаных машын. Арганізацыя выпуску новых машын ажыццёўлена на базе абсталявання з праграмным кіраваннем і гнуткіх перапраграмуемых тэхналогій, што прывяло да істотнай эканоміі часу пры пастаноўцы машын на вытворчасць.

Тэхнічны ўзровень і канкурэнтаздольнасць машын у многім вызначаюцца іх эксплуатацыйнымі і спажывецкімі паказчыкамі. У ліку апошніх — цягава-хуткасныя і тармазныя характарыстыкі, паліўная эканамічнасць, кіруемасць машын і іх устойлівасць, камфортнасць рабочага месца вадзіцеля, адносная лёгкасць іх тэхнічнага абслугоўвання і іншыя характарыстыкі. Усё гэта амаль цалкам залежыць ад адпаведных тэхнічных рашэнняў, прынятых падчас распрацоўкі. Выбар распрацоўшчыкамі ва ўказаных кар'ерных самазвалах тыпу дызельнага рухавіка (з электроннай сістэмай кіравання падачы паліва), электрычных машын трансмісіі, апаратуры кіравання электрапрыводам стаў цалкам абгрунтаваным і дазволіў забяспечыць высокі ўзровень усіх асноўных эксплуатацыйных паказчыкаў для дадзенага віду аўтатранспарту. Па ўсіх гэтых паказчыках створаныя кар'ерныя аўтасамазвалы не ўступаюць лепшым замежным узорам, а па многіх параметрах — і перавыходзяць іх. У прыватнасці, у аўтасамазвала БелАЗ-7513 у параўнанні з папярэднікам (БелАЗ-7512/7514) на 13 працэнтаў больш высокая прадукцыйнасць; яго выкарыстанне на 12 працэнтаў зніжае сабекошт работ, на 19 працэнтаў — расход паліва, на 9 працэнтаў — працаёмістасць тэхнічнага абслугоўвання. Створаныя аўтамабілі адпавядаюць міжнародным стандартам па бяспецы іх прымянення і іншых крытэрыях. Так, на аснове гідрапрывода аўтамабіляў вырашаны многія пытанні па аўтаматызацыі іх кіравання і абароне іх механізмаў і сістэм ад аварыйных сітуацый. У прыватнасці, сістэма рулявога кіравання забяспечана пнеўматыдрааккумулятарам, які аўтаматычна падсілкоўвае гідрамагістраль у выпадку дрэннай работы помпы або пры раптоўным спыненні рухавіка; двухконтурная сістэма прыводу рабочых тармазоў забяспечвае аварыйнае тармажэнне пры выхадзе са строю аднаго з контураў; уведзена абарона ад самаадвольнага апускання або падняцця платформы аўтамабіля падчас яго манеўравання. Гэта таксама шэраг іншых устройстваў, якія прадугледжваюць бяспечную работу самазвалаў у кар'ерах. З мэтай зніжэння працаёмістасці падчас іх тэхнічнага абслугоўвання прадугледжана сістэма цэнтралізаванай аўтаматычнай змазкі шарніраў розных механізмаў — рычагоў падвескі, механізма рулявога кіравання і г.д.

Стварэнне ў даволі сцісламу тэрміне сучаснай высокатэхналагічнай вытворчасці па выпуску новых магутных самазвалаў, наладжванне масавага выпуску гэтых машын, якія атрымалі выдатную ацэнку ў спажыўцоў многіх краін, — дастойнае самай высокай пахвалы ў адрас калектыву Беларускага аўтамабільнага завода, выклікае гонар за яго і за нашу краіну.

Госці БелАЗа заўсёды з цікавасцю наведваюць яго музей, дзе іх сустракае спецыяліст па інфармацыйнай рабоце Алена ДВАРНІЧЭНКА.

Варта асобна падкрэсліць важкі ўклад у гэту работу прэтэндэнтаў на атрыманне Дзяржаўнай прэміі.

Дадзеная работа выканана на высокім навукова-тэхнічным узроўні, утрымлівае мноства новых тэхнічных рашэнняў. Створаныя машыны па ўсіх паказчыках адпавядаюць сусветнаму ўзроўню, што забяспечвае іх высокую канкурэнтаздольнасць.

Практычна ўсе аўтасамазвалы «БелАЗ» працуюць у надзвычай складаных умовах эксплуатацыі. З улікам гэтага фактара канструктары прадугледзелі для БелАЗаў магутныя рухавікі, плаўную падвеску, надзейныя тармазы, трывалыя раму і платформу, камфартабельную кабіну. Самазвалы БелАЗ вызначаюцца выдатнымі цягава-дынамічнымі якасцямі, манеўранасцю, высокай удзельнай магутнасцю і нізкімі выдаткамі на тону перавезенага грузу.

Па дыяпазоне грузападымальнасці самазвалы БелАЗ могуць задаволіць патрэбнасці любога заказчыка: ад параўнальна невялікіх прадпрыемстваў да самых буйных з гадавымі аб'ёмамі перавозак па 100 і болей мільёнаў тон.

Сёлета ВА «БелАЗ» спаўняецца 60 гадоў. За ўсю гісторыю прадпрыемства тут распрацавана і асвоена ў вытворчасці звыш 500 мадыфікацый кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю ад 27 да 320 тон, выпушчана больш за 130 тысяч адзінак самазвалаў рознай грузападымальнасці, якія за шэсць дзесяцігоддзяў былі пастаўлены больш чым у 70 краін свету.

Матэрыял выпуску падрыхтаваў Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.

УНП 600038906

СПАЖЫЎЦЫ АБ КАР'ЕРНАЙ ТЭХНІЦЫ АБ'ЯДНАННЯ БелАЗ

«Выбар найбольш аптымальнай мадэлі самазвала залежыць ад многіх фактараў і павінен ажыццяўляцца з улікам тэхніка-эканамічных паказчыкаў, тэрміну службы і бяспекі яго работы. Пры яго выбары неабходна ўлічваць капітальныя і эксплуатацыйныя выдаткі, надзейнасць, бяспеку ў канкрэтных умовах эксплуатацыі, магчымасці рамонтнай базы, асаблівасці кар'еру і маршрутаў транспарціроўкі горнай масы. З улікам накопленага вытворчага вопыту, а таксама тэхніка-эканамічных паказчыкаў работы кар'ернай тэхнікі наша таварыства бачыць найбольш мэтазгодным эксплуатаваць самазвалы ВА «БелАЗ».

У таварыстве сярэдні прабег працуючых самазвалаў «БелАЗ» з пачатку іх эксплуатацыі па даных на 01.09.06 г. складаў 387 тысяч км. Сярэдні прабег спісваемых самазвалаў «БелАЗ» складаў: у 2003 годзе — 576 тысяч км, 2004-м — 582 тысячы, 2005-м — 619 тысяч, у 2006 годзе — 676 тысяч кіламетраў.

У ААТ «Апатыт» у цяперашні час эксплуатуюцца не толькі самазвалы «БелАЗ», але і дапаможная тэхніка на шасі БелАЗ: аўтацыстэрны, зарадныя, цягачы-буксіроўшчыкі, кабелеўкладчыкі, паліваразрэзах «Рэпубліка» і «Тэва» ў г. Перніка. Іх укараненне прывяло да значнага паляпшэння эксплуатацыйных паказчыкаў, у выніку чаго яны атрымалі шырокае распаўсюджанне ў краіне і сталі асноўным відам транспарту на многіх горназдабыўных прадпрыемствах.

Апошнім часам буйныя кар'еры ў краіне абнаўляюць свой тэхналагічны транспарт самазвалаві БелАЗ грузападымальнасцю 130 тон для перавозкі ўскрышных парод і 45 тон — для транспарціроўкі карысных выкапняў. Выдатныя тэхніка-эканамічныя паказчыкі, дасягнутыя пры эксплуатацыі самазвалаў БелАЗ, прывялі да ўніфікацыі аўтапарку рудніка «Асарэл-Медэт», ён поўнасцю абноўлены самазваламі ВА БелАЗ.

Сітуацыя, якая цяпер складаецца з цаной на карысныя выкапні на сусветным рынку, спрыяльная ў Балгарыі тэндэнцыі для адкрытай распрацоўкі выклікаюць цікавасць да самазвалаў БелАЗ грузападымальнасцю 220 тон і болей для вывазу ўскрышных парод і грузападымальнасцю 70—80 тон для транспарціроўкі руды, а таксама да самазвалаў павышанай праходнасці».

З водгуку кіраўніка фірмы «БелАЗ-Сафія» (Балгарыя).

***

«Першыя самазвалы «БелАЗ» грузападымальнасцю 27 тон працавалі ў кар'ерах здабычы медзі і нікеля ў Заходняй Афрыцы. Самазвалы «БелАЗ» — адны з самых надзейных машын, якія ў нас ёсць. Яны ўмеюць працаваць у самых цяжкіх умовах, і ў нас няма ніводнага выпадку, каб самазвал «БелАЗ» не выйшаў на работу з-за паломкі. Самазвалы «БелАЗ» — самыя лепшыя машыны, якія ў нас ёсць».

З водгуку начальніка аўтатранспартнага аддзела ААТ «Апатыт» (Расія) у спецыялізаваным часопісе «Горная промышленность».

***

«Кар'ерныя самазвалы «БелАЗ» карыстаюцца высокім аўтарытэтам на прадпрыемствах Польшчы, а выходзячы з суадносінаў «цана—якасць» з'яўляюцца найбольш канкурэнтаздольным транспартным сродкам на кар'ерах краіны. Каэфіцыент тэхнічнай гатоўнасці самазвалаў «БелАЗ», па даных прадпрыемстваў, дасягае ў сярэднім у першы год эксплуатацыі — 0,96, у другі год — 0,95, трэці — 0,94, чацвёрты — 0,92, пяты — 0,90. Для болей старых машын КТГ складае не менш як 0,82».

З водгуку прадстаўніка фірмы «Польмарк-Кельцэ» (Польшча).

***

«Перашыя самазвалы «БелАЗ» грузападымальнасцю 27 тон працавалі ў кар'ерах здабычы медзі і нікеля ў Заходняй Афрыцы. Самазвалы «БелАЗ» — адны з самых надзейных машын, якія ў нас ёсць. Яны ўмеюць працаваць у самых цяжкіх умовах, і ў нас няма ніводнага выпадку, каб самазвал «БелАЗ» не выйшаў на работу з-за паломкі. Самазвалы «БелАЗ» — самыя лепшыя машыны, якія ў нас ёсць».

З водгуку начальніка аўтатранспартнага аддзела ААТ «Апатыт» (Расія) у спецыялізаваным часопісе «Горная промышленность».

Зваршчык Дзмітрый МАЛАХОЎСКІ.

Найноўшыя тэхналогіі

ны, якія якраз і разлічаны на зварванне буйнагабарытных дэталяў. Робататэхнічныя комплексы таксама працуюць па камп'ютарных праграмах і поўнасцю выцеснілі на гэтых аперацыях ручную зварку. У выніку намнога павысілася якасць зварачных работ і, адпаведна, надзейнасць зварных канструкцый.

На прадпрыемстве прымяняюцца прагрэсіўная тэхналогія іонна-плазменнага азаціравання каронных шасцерняў, прызначаных для трансмісій. Тым самым выключаюцца нават самыя малыя змяненні іх геаметрыі падчас тэрмаапрацоўкі, што нярэдка назіралася раней, пры ранейшай тэхналогіі. А ў выніку мы таксама маем больш высокую якасць вельмі адказных дэталяў і іх большую надзейнасць у рабоце. А значыць, і надзейнасць у цэлым аўтамабіля.

Можна тут яшчэ называць многія прагрэсіўныя тэхналогіі, якія прыйшлі на прадпрыемства ў выніку тэхнічнай рэканструкцыі і падрыхтоўкі нашай вытворчасці да выпуску самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці. Так, для апрацоўкі буйнагабарытных дэталяў былі куплены спецыяльныя кардынатна-расточныя станкі з велічынёй стала 16х2,5 метра... Гэтыя змяненні закранулі практычна ўсё прадпрыемства. На ім цяпер, напрыклад, больш за 80 працэнтаў усіх дэталяў, якія ідуць на зборку БелАЗаў, вырабляецца на станках з лічбавым праграмным кіраваннем і выкарыстаннем гнуткіх вытворчых тэхналогій.

Пры падрыхтоўцы вытворчасці да выпуску новых машын даволі спрэчным было пытанне, якім чынам арганізаваць іх зборку (у прыватнасці зборку самазвалаў грузападымальнасцю 220 тон) — на ленце канвеера ці на спецыяльных стапелях. Правялі разлікі па адпаведных магчымасцях канвеера, выканалі некаторыя страховачныя моманты, і ў выніку паставілі самазвал на канвеер. Цяпер наш завод адзіны ў свеце збірае такія самазвалы на канвеерах, ва ўсіх астатніх стапельная зборка.

— Віктар Віктаравіч, адносна слабым месцам у многіх нашых вытворцаў з'яўляецца гідраўліка...

— У нашых машынах вельмі ўдала спалучаюцца механічная і гідраўлічная часткі, і нараканняў спажыўцоў на гідраўліку практычна няма. Прычым усю камплектацыю да гідраўлікі мы вырабляем менавіта ў сябе. У нас працуюць даволі рэдкія ў вытворцаў станкі для вырабу гідраўлічных труб, якія могуць апрацоўваць трубы дыяметрам да 400 міліметраў і даўжынёй да 4 метраў. Варта адзначыць такую цікавую асаблівасць гідраўлікі ў самазвалах асабліва вялікай грузападымальнасці. У іх гідраўлічныя сістэмы рулявога кіравання, тармазоў, рабочага абсталявання для перакульвання платформы і іншых дапаможных механізмаў аб'яднаны ў адзіны комплекс. Гэта дазволіла спрасціць гідраўлічную сістэму ў цэлым, зменшыць колькасць гідраўлічных помпаў, павысіць ступень уніфікацыі гідраўлічных элементаў.

А ўвогуле, што датычыцца тых або іншых слабых месцаў машыны, мы ў многім выяўляем іх з дапамогай спажыўцоў, з якімі ў нас наладжана трывалая сувязь. Так, на прадпрыемстве ўжо рэгулярныя сталі навукова-практычныя канферэнцыі, якія наладжваюцца на пачатку кожнага года і на якія прыязджаюць спажыўцы з многіх краін (на гэтыя канферэнцыі запрашаем і пастаўшчыкоў камплектуючых). Размова на гэтых форумах ідзе і пра перспектывы выкарыстання кар'ернай тэхнікі, яе надзейнасць, і пра недахопы ў рабоце яе вытворцаў. Усе крытычныя заўвагі ў наш адрас абавязкова ўлічваем, а на наступнай канферэнцыі інфармуем спажыўцоў, што па гэтых заўвагах зроблена.

— Цяперашні «прасунуты» спажывец хоча бачыць у сучасных машынах сістэмы дакладнай камп'ютарнай дыягностыкі ўсіх адказных вузлоў. Такія сістэмы, відаць, асабліва неабходныя для вашых машын, рамантаваць якія з-за буйных габарытаў дэталяў і вузлоў не так проста, і лягчэй папярэдзіць тую або іншую непрыемнасць, што можа здарыцца падчас эксплуатацыі...

— Такія сістэмы сталі абавязковымі для нашых машын. Бартавыя камп'ютарныя комплексы кантралююць аўтаматычную сістэму змазкі адказных вузлоў, ціск у колах, загрузку самазвала ў кар'еры і г.д., што намнога аблягчае эксплуатацыю машын у спажыўца, у цэлым павышае іх надзейнасць і агульны рэсурс прабегу. Дарэчы, гэты рэсурс у нашых «вялікіх» самазвалаў складае цяпер больш за 700 тысяч кіламетраў, ён за апошнія гады істотна павысіўся.

— Віктар Віктаравіч, на прадпрыемстве, можна сказаць, не так даўно зроблена рэканструкцыя, а ўжо складзены праект рэканструкцыі на 2008—2012 гады. Гэта ўжо свайго роду традыцыя?

— Жыццё не стаіць на месцы. І рынак таксама. Ён пастаянна патрабуе новай тэхнікі з новымі магчымасцямі. Да таго ж нас да гэтага абавязвае статус сусветнага лідара, неабходнасць і далей захоўваць канкурэнтаздольнасць нашай кар'ернай транспартнай тэхнікі на самым высокім узроўні. І мы абавязкова захаваем сваю канкурэнтаздольнасць. Але пры той умове, што пастаянна будзем абнаўляцца. Дарэчы, у выніку правядзення гэтай, новай, рэканструкцыі мы павялічым свае цяперашнія аб'ёмы ў 1,8 раза.

Новае абсталяванне па апрацоўцы каронnай шасцерні самазвала БелАЗ-75306 у механазборачным цэху № 1.

Ведаць, чаго жадае спажывец

— Гаворачы пра створаныя на прадпрыемстве мадэлі самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці, якія з'яўляюцца для нас свайго роду топавымі мадэлямі, хачу перш за ўсё падкрэсліць: гэта заслуга не проста канструктараў, а ўсяго нашага калектыву — пачынаючы ад кожнага рабочага і заканчваючы генеральным дырэктарам. Гэта менавіта наша агульная праца, — зазначыў на самым пачатку гутаркі Мікалай Віктаравіч. — І яна атрымалася, што прызнаюць як нашы партнёры, так і канкурэнты.

У сувязі з гэтым зазначу: ствараючы свае машыны, мы, безумоўна, глядзім на сусветнага вытворцу. Але ствараем менавіта сваё. У нас у гэтых адносінах скласліся свае накірункі, свой почырк праектавання. Ну вось, возьмем напрамак работы, якім мне даводзіцца займацца больш за ўсё, — стварэнне электрамеханічных трансмісій для кар'ерных самазвалаў. Цяпер у свеце з распрацоўшчыкаў электратрансмісій, па сутнасці, засталіся толькі мы ды заходнія кампаніі «Джэнерал электрык» і «Сіменс», астатнія загінулі ў канкурэнтнай барацьбе. Словам, адпаведную ідэалогію ў дадзеным напрамку дыктуем толькі мы і адзначаныя заходнія кампаніі.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ АЎТАРА: ***Мікалай Віктаравіч БІГЕЛЬ, намеснік генеральнага канструктара ВА «БелАЗ-РУВП «Беларускі аўтамабільны завод» — начальнік аддзела электрамеханічных трансмісій навукова-тэхнічнага цэнтра.***

Закончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, факультэт — «Робаты і робататэхнічныя сістэмы»; прыйшоў на Беларускі аўтамабільны завод у 1985 годзе.

Мікалай Віктаравіч Бігель непасрэдна займаўся стварэннем электрамеханічных трансмісій для самазвалаў, кіраваў распрацоўкай тэхнічнай дакументацыі на трансмісіі, арганізацыяй адпаведнага аўтарскага кантролю, аптымізацыяй канструкцый і ўніфікацыі вузлоў электрамеханічных трансмісій для самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці.

А ўвогуле, з чаго ў нас пачынаецца стварэнне той ці іншай машыны перш за ўсё? З адпаведнай работы са спажыўцом — без такой работы стварэнне сучасных, добра запатрабаваных машын, па сутнасці, не магчымае. Мы спачатку абавязкова павінны даведацца пра ўсе яго патрабаванні і пажаданні; менавіта з гэтага ўсё пачынаецца. Больш поўна ўлічым усё тое, што ён жадае атрымаць, больш дэталёва ўсвядомім і сваю канкрэтную задачу. А разам з тым забяспечым лепшы рух нашай тэхнікі на іншыя рынкі.

Схема работы са спажыўцом простая. Прыязджаем ён на наша прадпрыемства і гаворыць: у нас вось такога характару кар'ер, і нам патрэбна тэхніка вось такой прадукцыйнасці і грузападымальнасці. Мы ў выніку як бы атрымліваем ад яго свайго роду тэхнічнае заданне, пры гэтым узгадняем патрабаванні спажыўца і нашы магчымасці. Абмеркавалі, далей ідзе стварэнне доследнага ўзору, звычайна ў 2-3 мадэлях. Адгружаем тэхніку спажыўцу, глядзім, аналізуем на працягу дастаткавага часу (тэрмінам — да года) яе работу. Усё добра — пускаем у серыю.

Работа са спажыўцом — шматгранная і далёка не заканчваецца пасля стварэння пэўнай машыны. Абавязкова сочым, як яна паводзіць сябе ў эксплуатацыі, пры неабходнасці ўносім у яе канструкцыю пэўныя змяненні. Генеральны канструктар ужо гаварыў пра тое, што мы маем вялікую колькасць сэрвісных цэнтраў. Задзейнічаем для гэтай мэты іх, збіраем у іх раз у квартал поўную інфармацыю аб рабоце нашай тэхнікі. Далей: кожны, хто выязджае ў камандзіроўку, да свайго асноўнага тэхнічнага задання абавязкова атрымлівае і дадатковае — зрабіць аналіз работы нашай тэхнікі ва ўмовах яе эксплуатацыі, даведацца, якія ў ёй былі няспраўнасці, чаму яны адбыліся. Усё гэта потым таксама аналізуецца, прымаюцца меры, у тым ліку і па ўдасканаленні канструкцыі. Такім чынам, кола «вытворца — спажывец — карэкціроўка вырабу — і зноў спажывец» у нас добра замкнёнае. Гэта няблага працуе як на нас саміх, так і на спажыўца. Увогуле, нашы заказчыкі заўсёды ўпэўненыя, што мы іх не пакінем у цяжкім становішчы, усё зробім для таго, каб наша тэхніка ў іх працавала бездакорна і высокапрадукцыйна.

— Мікалай Віктаравіч, якое з пажаданняў цяперашняга спажыўца вы вылучылі б больш за ўсё?

— Пажаданне зніжэння ў яго выдаткаў і часу на тэхнічнае абслугоўванне самазвалаў. Прычым мы самі ў дадзеным выпадку зноў-такі ідзём насустрач спажыўцу. Ну вось цяпер мы плаўна пераходзім на электрамеханічныя трансмісіі з прынцыпам дзеяння, як мы кажам, «пераменна-пераменны ток» замест «пераменна-пастаяннага току». Варта патлумачыць: генератар самазвала, які прыводзіцца ў дзеянне ад дызельнага рухавіка, вырабляе пераменны ток, які пераўтвараецца ў пастаянны і потым падаецца на электрарухавікі колаў. Так, па сутнасці, у нашых звычайных электратрансмісіях. Яны значна таннейшыя за тыя, якія мы пачалі распрацоўваць цяпер, але разам з тым патрабуюць значна большых выдаткаў і часу на іх тэхнічнае абслугоўванне. А ўсё гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да павелічэння прастояў самазвалаў на рамонтных і прафілактычных работах, хоць, між іншым, кожны спажывец імкнецца задзейнічаць кар'ерную тэхніку максімальна, яна працуе нават у тры змены. Сітуацыя карэнным чынам мяняецца з выкарыстаннем электратрансмісій пераменна-пераменнага току

А не так даўно да нас звярнуліся гарнякі Кузбаса з просьбай разгледзець магчымасць стварэння самазвалаў з тралейнай цягай, г.зн. самазвалаў, якія хадзілі б пад правадамі, як тралейбусы. І тут ужо размова аб замене дызельнага паліва, якое выкарыстоўваецца ў якасці крыніцы сілкавання самазвалаў, на намнога больш танную электраэнергію. А варта зазначыць: велікагрузны самазвал за год яго эксплуатацыі спажывае дызельнага паліва каля мільёна літраў. Паліва для кар'ернага транспарту займае значную долю ў сабекошце горназдабыўных работ. Да слова сказаць, пэўныя напрацоўкі па вытворчасці тралейвозаў у нас ужо ёсць. Мы ўвогуле імкнёмся працаваць на апераджэнне пажаданняў спажыўца, быць гатовымі да выканання любога заказу.

— Мікалай Віктаравіч, на прадпрыемстве, па сутнасці, ужо пастаўлены на канвеер самазвал грузападымальнасцю 320 тон. Да якой мяжы можа расці грузападымальнасць?

— Калі я толькі прыйшоў на прадпрыемства, мой першы дырэктар, маючы на ўвазе праектуемы 75-тонны самазвал, казаў: «Хоціць тут варочаць мегатонамі, трэба рабіць нармальныя самазвалы». А за норму выдаваліся 30-тоннікі... Цяпер маштабы зусім іншыя. У нас сёння праектуецца машына грузападымальнасцю 360 тон; а ў нашым музеі выстаўляецца макет 420-тонніка. І ўжо «праглядваецца» 560-тоннік, які мяркуецца спраектаваць для Чылі, і хутчэй за ўсё ў бліжэйшы час мы зойменся гэтым праектам. А яшчэ ўзгадваецца і пра 700 тон.

— Ці пацягнеце?

— А іншага нам у Беларусі не дадзена. Не зробім мы — зробяць іншыя, калі гэтага, зноў-такі, запатрабуе спажывец. Мы ў нашай краіне не маем вялікіх прыродных багаццяў і можам разлічваць толькі на свае мазгі ды ўменне добра арыентавацца ў сучасным рынку — складаным, нярэдка супярэчлівым, але разам з тым і вельмі цікавым. Сённяшні рынак пастаянна дыктуе працаваць менавіта на апераджэнне, на перспектыву, чуць спазніўся на ім — да пабачэння.

У сувязі з гэтым хачу сказаць трохі пра наш канструктарскі калектыў. Ён сфарміраваўся ў нас у пэўным сэнсе гэтага слова, мы добра захавалі тыя карані і добрыя традыцыі, якія былі закладзены на прадпрыемстве на першым часе. Гэта па-сапраўднаму творчы калектыў, у якім кожны ў сваіх ведах і ўменні выходзіць за межы сваёй вузкай спецыялізацыі, імкнецца ўмець усё. Напрыклад, падчас камандзіроўкі наш работнік, калі да яго звернецца спажывец з пэўным пытаннем, не скажа «гэта не мая спецыялізацыя», а зробіць усё магчымае, каб аказаць спажыўцу патрэбную дапамогу. Высокі прафесіяналізм белазаўскіх канструктараў прызнаюць нашы канкурэнты і партнёры, у нас на прадпрыемстве склалася белазаўская і ўвогуле беларуская школа праектавання. Мы можам смела так казаць.

«МОВА ВЫДАННЯ — БЕЛАРУСКАЯ...»

Яфім ГЕНКІН

Вітольд АШМАРЫН

Вульф НОДЭЛЬ

Уладзімір ВАЛЫНСКІ


Валерый ШАФРАНСКІ

Майсей ШУЛЬМАН


Іван АСЬМОЎ

Вядомы беларускі даследчык, кандыдат гістарычных навук Яўген Бараноўскі ўжо даўно рыхтуе кнігу па гісторыі газеты. Сёння, у дзень нараджэння «Звязды», прапануем яго чарговы матэрыял.

Кожны перыяд гісторыі таму і шануецца, што мае сваіх герояў, свае ацэнкі. Такім часам для «Звязды» сталі 20-я гады мінулага стагоддзя. Гісторыя тых дзён і начэй дзеліцца на часткі, якія ўмоўна можна назваць «хутчэй у нэп (новую эканамічную палітыку)» і «хутчэй з нэпа».

Тады з Мінску на веласіпедзе можна было амаль за суткі трапіць у любы больш-менш буйны горад рэспублікі, і абумоўлена гэта было знаходжаннем значных частак беларускіх зямель у складзе Польшчы (па ўмовах Рыжскага мірнага дагавору), Расіі і Украіны. Беларуская ССР валодала толькі шасцю няпоўнымі паветамі былой Мінскай губерні (52,4 тысячы кв. км., 1 540 868 чал.). Штучнае звужэнне тэрыторыі замаруджвала эканамічнае станаўленне беларускай дзяржавы. У гарадах, мястэчках, вёсках у якасці фінансавага эквіваленту выкарыстоўваліся былыя царскія грошы, штучна ўпрыгожаныя «керанкі», новенькія саўзнакі.

Тагачасны рэдактар «Звязды», адначасова сакратар ЦБ Кампартыі Беларусі В. Кнорын у дзень атрымання заробку прыходзіў у бухгалтэрыю з сумкаю, падобнай на камандзіровачны чамаданчык. Хаваючы туды грошы, казаў бухгалтарцы: «Слова «рубель» у вашай ведамасці трэба замяніць на слова «кілаграм»... Такой была інфляцыя. Па гэтым паказчыку БССР мала чым адрознівалася ад Германіі, пацярпелай ад Версальскага мірнага дагавору. Рухальнай сілай стала ўвядзенне новай эканамічнай палітыкі, вяртанне да прыватнай уласнасці спачатку ў вёсцы, а потым і ў горадзе. Ажыўленне ў эканоміцы было такім хуткім, што ў 1923—1924 гадах на Беларусі і ў іншых савецкіх рэспубліках адзін рубель узору 1923 г. быў роўны 1 млн былых рублёў, або 100 рублям узору 1922 г. На валютным рахунку ўнутры краіны і за мяжой савецкія чырвонцы свабодна абменьваліся на золата і замежныя валюты па курсе даваеннага царскага рубля, па якім 1 долар ЗША каштаваў 1,94 рубля.

«Звязда» прыстасоўвалася да новых умоў існавання. Трэба было перакрыць знікненне прасавецкіх газет: «Мінскі пралетарый», «Бядняк», «Беларуская камуна»... Катастрафічна падаў тыраж. Калі ў студзені 1921 года ён складаў 7680 экзэмпляраў, то ў сакавіку таго ж года — 6000. Да 1500 рублёў вырас кошт аднаго нумара, прыпынілася бясплатная дастаўка «Звязды» ў партячэйкі, хаты-чытальні. Але рэдакцыя, на чале якой стаялі Я. Генкін, В. Ашмарын, В. Кнорын, В. Нодэль, не разгубілася. Многае было запазычана з вопыту «Звязды» ў Смаленску, калі яна мела амаль падобнае становішча.

14 кастрычніка 1922 года галоўны партыйны орган БССР прымае рашэнне аб аб'яднанні газет «Беларуская вёска» і «Звязда» з захаваннем за «Звяздой» ранейшага палітычнага статусу. У працоўных калектывах арганізуюцца вусныя чытанні «Звязды». Уводзяцца аддзелы: «Чырвоныя рэйкі» (орган чыгуначнікаў Мінскага чыгуначнага вузла), «Літаратура і мастацтва», «Па кніжных паліцах», «Увага «дробязям», «Сярод дзяцей», «Замежнае жыццё». У гісторыі «Звязды», усёй перыёдыкі Беларусі сваё месца займае дзень 30 снежня 1921 года — дата з'яўлення ў газеце першай рабкоравускай заметкі «Наш працоўны фронт» аўтара І. Валашука, рабочага мінскага завода «Энэргія» (зараз станкабудаўнічы завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. — **Аўт.**). 15 лютага 1922 года звесткі ў газету пачалі паступаць не толькі днём, але і ноччу, па радыё, прамым провадзе і тэлефоне, з-за мяжы, з Масквы, Петраграда, іншых гарадоў савецкай федэрацыі. 1 мая 1923 года святочны нумар «Звязды» быў дастаўлены ў Бабруйск і Ігумен (сёння Чэрвень. — **Аўт.**). У той дзень газета пачала выходзіць на шасці старонках. Спрыяла гэтаму ўвядзенне ў працу двухбарабаннай друкарскай машыны, адрамантаванай рабочым Каптонам. 5 сакавіка 1924 года «Звязда» ўпершыню выйшла на васьмі старонках. У красавіку 1924 года тыраж перавысіў 15 000 экзэмпляраў. У адным з лістоў з Масквы, з ЦК РКП(б), яна называецца «ўзорам для ўсіх нашых губернскіх газет» (маецца на ўвазе РСФСР. — **Аўт.**).

Доўгі час сімвалам друкарскага майстэрства «Звязды» лічыўся А. Данцыг. У жніўні 1917 года ён быў амаль адзіным мінскім друкаром, які ва ўмовах «керанчыны», не баючыся арышту, за нядрэнны ганарар надрукаваў першы нумар «Звязды». Але не трэба забываць і іншых. Унеслі свой пасільны ўклад у выхад газеты Фёдараў, Лебедзеў, Бернэс, Андрэеў, Бароўскі, Багдановіч, Коган, Левін, Новікаў, Петухоўскі, Рубін, Свірыдаў, Шульбрык, Эйдэльман, Янушкевіч.

Пасля тэрытарыяльнага ўзбуйнення БССР у сярэдзіне 20-х за кошт беларускіх раёнаў, што ўваходзілі ў склад РСФСР і Украінскай ССР тыраж «Звязды» распаўсюджваўся нават авіяцыяй. У жніўні 1927 года «Звязда» пераводзіцца на беларускую мову. У той месяц у яе справаздачы значацца адрас рэдакцыі і канторы: вул. Савецкая, № 3, год выдання — адзінаццаты, колькасць палос — 4 (2 разы на тыдні — 6 палос), выдавец — ЦК КП(б)Б, выходзіць — штодзённа, мова выдання — беларуская (гэта слова ў справаздачы і дакументах газеты ўжываецца ўпершыню. — **Аўт.**). Падпісны кошт у месяц — 90 капеек, рознічны кошт нумара — 5 капеек. Колькасць усіх работнікаў — 58 чалавек, з іх членаў КП(б)Б — 11. Рэдактар — Я. Асьмоў. У матэрыялах справаздачы ёсць сумныя лічбы: насупраць прыбытку стаіць «нуль», а дзе страты — 6906 рублёў 59 капеек. У наступных дакументах паведамляецца аб пакрыцці запазычанасці сродкамі з ЦК ВКП(б).

Баючыся змяншэння тыражу, колькасці падпісчыкаў, ЦК КП(б)Б 15 верасня 1927 г. звяртаецца да членаў КП(б)Б, усёй грамадскасці БССР: «У сувязі з пераходам «Звязды» на беларускую мову значная частка членаў партыі, якія раней выпісвалі «Звязду», зараз перасталі яе выпісваць... Нельга зразумець, як член партыі будзе выконваць партыйныя дырэктывы, калі ён не чытае свайго цэнтральнага органу. Усе члены партыі павінны чытаць «Звязду» — вось лозунг, які акругкамы, райкамы, бюро ячэек павінны папулярызаваць сярод партыйцаў. Актыўная, больш свядомая частка беспартыйных рабочых таксама павінна стаць чытачамі «Звязды». Такую пастанову трэба даць усім ячэйкам КП(б)Б і прафарганізацыям на месцах. ЦК КП(б)Б лічыць гэта ўдарнай задачай і прапануе паўзнаць належныя крокі да пашырэння тыражу «Звязды» ў бліжэйшы час».

Напярэдадні разгледжана напісанне рускага слова «Звязда» па-беларуску. У рашэнні Бюро ЦК КП(б)Б (15.07.1927) зазначаецца: «Пры пераводзе газеты «Звязда» на беларускую мову пакінуць гэту назву газеты, ужываючы беларускую транскрыпцыю («Зьвязда»).

«Звязда» хутка ператваралася ў вернага байца партыі. Але ў новых умовах існавала і шмат новага. Калі ў 1917 годзе яна сама выбірала ворага, то зараз такую ролю выконваў ЦК, і не беларускі, а маскоўскі. Першым выпрабаваннем стала барацьба з Л. Троцкім. Шэраг работнікаў рэдакцыі нядрэнна ведалі яго. Пэўныя адносіны ў свой час ён меў з Р. Пікелем, А. Мясніковым, В. Кнорыным. У адзін з дзён 1924 года рэдактар В. Нодэль атрымаў у ЦК КПБ план «абмеркавання выступлення т. Троцкага», якое тычылася галоўным чынам яго антыленінскіх поглядаў на прафсаюзы, іншыя пытанні пабудовы сацыялістычнага грамадства. «Звяздзе» рэкамендавалася зрабіць наступнае: «У горадзе: а) спачатку пытанне аб ленінізму і трацкізму абмеркаваць сярод актыву партарганізацый праз агітпрапкалектывы; б) ажыццявіць праработкі гэтага пытання ў бліжэйшы час у ленінскіх і марксісцкіх кружках і партшколах па-за іх праграмамі; в) для тых таварышаў, якія не займаюцца ў гуртках і партшколах, арганізаваць асобыя сходы для праработкі гэтага пытання. У вёсцы: а) арганізаваць раённыя і групавыя сходы ячэек, дзе паставіць даклады аб выступленні т. Троцкага з прыняццем рэзалюцыі па даннаму пытанню; б) акругкамы павінны забяспечыць гэтыя сходы лепшымі дакладчыкамі з акругі; в) звярнуць пры гэтым асобую ўвагу на падрабязнае растлумачэнне ўсёй партыйнай масе, як трэба рэагаваць на ўзнятыя сялянствам пытанні па прычыне выступлення т. Троцкага ў духу агульнапартыйнай лініі. На беспартыйных сходах як сялян, так і рабочых, асобных дакладаў па выступленню т. Троцкага не практыкаваць, а абмежавацца растлумачэннем пытанняў, задаваемых беспартыйнай масай».

Чырвоным радком праходзіць роля газеты ў прапагандзе ідэй сацыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі. Выкананне запланаванага азначала адкат ад нэпа. Адзін з актывістаў у вёсцы, наркам земляробства БССР З. Прышчэпаў, 19 верасня 1929 г. выключаецца з партыі, а праз некаторы час арыштоўваецца і асуджаецца да вышэйшай меры пакарання «за насаджэнне ў вёсцы кулачаства, рэстаўрацыю буржуазнага ладу». У культурную сферу таксама прыйшлі хвалі ўціску. За «праявы нацыяналізму, парушэнні лініі партыі ў нацыянальным пытанні» ў 1929 годзе звальняецца з работы наркам асветы А. Баліцкі. Разам з ім пацярпелі вядомыя дзяржаўныя, грамадскія, культурныя дзеячы Беларусі Д. Жылуновіч, А. Адамовіч, С. Некрашэвіч, В. Ластоўскі і іншыя. У гэтых умовах газету наведаў знаменіты ў той час маскоўскі паэт Міхаіл Святлоў, які пакінуў у «Звяздзе» верш «Нэпман». У некаторых артыкулах «Звязды» можна ўбачыць супярэчнасці з яе заклікамі першай паловы 20-х гадоў...

Сваё ні з чым не параўнальнае месца ў гісторыі ўсіх перыядаў беларускамоўнай «Звязды» займаюць асобы яе рэдактараў. Першыя з іх — А. Мяснікоў, М. Фрунзэ, В. Фамін, К. Ландэр — вылучаны самім жыццём, астатнія, пасля ўстанаўлення савецкай улады, зацвярджаліся галоўнымі партыйнымі органамі СССР і БССР. У 20-я гады рэдактарамі газеты з'яўляліся: Вільгельм Кнорын, Вітольд Ашмарын, Яфім Генкін, Вульф Нодэль, Уладзімір Валынскі, Валерый Шафранскі, Майсей Шульман, Іван Асьмоў. Усе яны амаль аднагодкі, самы старэйшы — Ашмарын, самы малады — Валынскі.

Імя В. Кнорына засталося ў назве адной з вуліц Мінска. Ён ураджэнец Латвіі. У Беларусі з 1915 года як радавы адной з часцей Заходняга фронту. З 1935 года — доктар гістарычных навук, аўтар першай манаграфічнай працы па гісторыі ВКП(б). Перабольшваў ролю Заходняга фронту ва ўстанаўленні савецкай улады на Беларусі, у шэрагу выданняў, у тым ліку ў «Звяздзе», адмаўляў беларусам у фарміраванні сваёй нацыянальнай супольнасці, недаацэньваў значэнне нацыянальных і міжнацыянальных адносінаў у пабудове сацыялістычнага грамадства. У канцы 20 — пачатку 30-х гадоў пераглядзеў свае ранейшыя погляды па нацыянальнай праблематыцы.

Выхадцамі з Беларусі з'яўляюцца Нодэль (Віцебская вобласць) і Шульман (Мсціслаўскі павет), Генкін — ураджэнец Смаленшчыны, Шафранскі — Херсонскай губерні, Асьмоў — Уладзімірскай, Валынскі — з Літвы. Месца нараджэння Ашмарына не ўстаноўлена. Да прызначэння на пасаду рэдактара «Звязды» нядрэнна ведалі Беларусь Генкін (наркам працы ва ўрадзе БССР у 1920—1921 гг.), Нодэль (сакратар Віцебскага савета прафсаюзаў), Шульман (намеснік загадчыка аддзела друку ЦК КП(б)Б, Асьмоў (старшыня Камітэта па справах друку пры СНК БССР), Валынскі (на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, сакратар Барысаўскага акругкама КП(б)Б). Значную журналісцкую практыку мелі да прыходу ў «Звязду» Ашмарын (рэдактар газеты «Известия ВЦИК»), Валынскі (член рэдкалегіі газеты «Коммунист»), Шафранскі (адказны рэдактар газеты «Красная звезда»). Да прыходу ў кампартыю членам Бунда з'яўляўся Нодэль, членам Яўрэйскай сацыялістычнай рабочай партыі — Шульман. З дакастрычніцкага часу вялі партыйны стаж Ашмарын (1902), Валынскі (1915), Шафранскі (1911), Асьмоў (1917). Пабываў у царскай турме за рэвалюцыйную дзейнасць Ашмарын. Пасля рэдагавання «Звязды» прадоўжылі прафесійна займацца журналістыкай за межамі Беларусі Ашмарын (намеснік рэдактара прафсаюзнай газеты «Наша газета», Масква), Нодэль (рэдактар газеты «Советская торговля», адначасова рэктар Усесаюзнага камуністычнага інстытута журналістыкі імя «Правды»), Шафранскі (адказны рэдактар краявой газеты «Тихоокенская звезда»), Шульман (галоўны рэдактар выдавецтва Маскоўскага абласканкама), Асьмоў (заг. аддзела рэдакцыі газеты «Правда»). Аб інтэрнацыянальным характары рэдактарскага корпусу сведчыць яго шматнацыянальны склад: Кнорын — латыш, Ашмарын — паляк, Генкін, Нодэль, Шафранскі, Шульман — яўрэі, Валынскі — літовец, Асьмоў — рускі.

У архіве «Звязды» захавалася станоўчая характарыстыка на Асьмова. Але, на наш погляд, добрых слоў заслугоўваюць усе кіраўнікі рэдакцыі. І тым не менш лёс многіх з іх аказаўся трагічным. У 30-я гады былі арыштаваныя па абвінавачванні ў трацкізме, контрэвалюцыйнай дзейнасці і расстраляныя Кнорын, Генкін, Нодэль, Шафранскі. У пасляваенны перыяд усе рэабілітаваныя за адсутнасцю складу злачынства.

Газета сачыла і за лёсам тых, у каго ён абарваўся яшчэ ў 20-я гады. Паводле ўспамінаў, устаноўленых на існаванне ў рэдакцыі спіса ўсіх ранейшых супрацоўнікаў, дзе былі пазначаны іх адрасы, месцы працы, імёны жонак і дзяцей, іншых членаў сям'і, нумары хатніх і рабочых тэлефонаў. У час Вялікай Айчыннай вайны многае з гэтага каштоўнага матэрыялу было страчана. Застаўся толькі няпоўны пералік супрацоўнікаў ад жніўня 1917-га па канец 30-х гадоў.

На старонках газеты ў той час змешчаны шэраг некралогаў. Самы першы з іх прысвечаны А. Мяснікову, які загінуў у красавіку 1925 года ў авіякатастрофе над Тбілісі. У 1917 годзе ён быў рэдактарам «Звязды», сакратаром Паўночна-Заходняга абкама РСДРП(б), камандуючым Заходнім фронтам. У пачатку 1925 года Мяснікоў звязаў цесныя сувязямі Целаўскі павет Грузінскай ССР з Мінскім паветам. У 20-я гады скульптар З. Азгур стварыў скульптурны партрэт Мяснікова. Некралог М. Фрунзэ змяшчаўся двойчы — у дзень пахавання (лістапад 1926 г.) і праз год. Адрэагавала «Звязда» і на смерць прадстаўніка ЦК РКП(б) у Беларусі А. Іофе, які скончыў жыццё самагубствам у час цяжкай хваробы. Рэдакцыя праз сваіх прадстаўнікоў у Маскве выказала шчырыя спачуванні сям'і нябожчыка.

20-я гады заканчваюцца ў маі 1930 года, калі на змену Асьмову прыйшоў А. Мітлін. Але ён прабыў на пасадзе рэдактара каля чатырох месяцаў. Крыху больш за год адпрацаваў і яго пераемнік — С. Будзінскі. Такія змены трывогай адгукнуліся ў душах супрацоўнікаў беларускамоўнай «Звязды»...

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук.

Кватэрнае пытанне

Цягнік пайшоў?

Мой муж (пенсіянер) тры тыдні ляжаў у бальніцы, але пры выпісцы даведку аб гэтым для перараразліку камунальных плацяжоў не ўзяў. Я схадзіла па яе тыдні праз два... У бухгалтэрыі ЖЭСа сказалі, што я спазнілася і плаціць цяпер трэба поўнасцю, у тым ліку і за тое, чым муж не карыстаўся. Чаму так, дзе логіка?

Вера В., *Мінск.*

Парадак перараразліку платы за камунальныя паслугі ўстаноўлены пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 2005 г. № 1466 (з улікам наступных змяненняў і дапаўненняў). Інфармацыя аб гэтым парадку размешчана ў арганізацыях, якія ажыццяўляюць налічэнне платы, у даступным для грамадзян месцы (на інфармацыйных стэндах, табло).

Перараразлік ажыццяўляецца пры адсутнасці ў спажыўцоў прыбораў індывідуальнага ўліку расходу вады і газу, калі грамадзянін выехаў з пастаяннага месца жыхарства на тэрмін звыш 10 сутак запар па пэўных падставах (у тым ліку — для лячэння ў бальніцы, шпіталі, медыка-санітарнай частцы, дыспансэры і іншых лячэбных установах) і папярэдне давёў да ведама ўказанай арганізацыі тэрміны выезду.

Вядома ж, пры выездзе на лячэнне не заўсёды ёсць магчымасць загадзя паведаміць пра тэрмін адсутнасці, таму для перараразліку платы ў гэтым выпадку падаецца заява з прыкладаннем адпаведнай даведкі аб знаходжанні на стацыянарным лячэнні. Гэтыя дакументы прадастаўляюцца не пазней як праз 7 каляндарных дзён з дня вяртання грамадзяніна на пастаяннае месца жыхарства (такі час устаноўлены вышэйпамянёнай пастановай).

На практыцы маюць месца асобныя выпадкі, калі пры перараразліку платы за камунальныя паслугі прымаецца да ўвагі, што ўказаная даведка прадастаўлена пазней за ўстаноўлены тэрмін па ўважлівай прычыне (напрыклад, калі хворы з'яўляецца інвалідам, састарэлым і пражывае адзін у гэтым жылым памяшканні). Вырашэнне дадзенага пытання знаходзіцца ў кампетэнцыі арганізацыі, якая ажыццяўляе налічэнне платы за камунальныя паслугі.

Віктар САВІЦКІ.

Добрыя навіны Беларускай чыгункі

МІНІ-ЦЯГНІКІ ДЛЯ МІНІ-ПАСАЖЫРСКІХ ПАТОКАЎ

У прыгарадных зносінах з малымі пасажырскімі патокамі на некаторых участках чыгункі курсіруюць міні-дызелі. Гаворка ідзе аб накірунках Гродна — мяжа Літвы, Ваўкавыск — Бераставіца, Ваўкавыск — Свіслач, Бронная Гара — Белаазёрск і некаторых іншых.

Паводле слоў намесніка начальніка пасажырскай службы Беларускай чыгункі Юрыя РАДЗЬКО, міні-дызелі пераважна з двума вагонамі дазваляюць не несці дадатковых расходаў. Дарэчы, для цягнікоў выкарыстоўваецца адноўлены, адрамантаваны ў лакаматыўным дэпо Ліды рухомы састаў. Па такіх накірунках, як Гомель — Шчорс і Гомель — Чарнігаў, курсіруюць новыя дызель-цягнікі ў трохвагонным выкананні.

Што тычыцца развіцця чыгуначнага руху ў межах сталіцы, то пакуль гэта аддаленая перспектыва знаходзіцца на стадыі разгляду і абмеркавання.

ПЛАСТЫКАВАЙ КАРТКАЙ — ЗА БІЛЕТЫ

Пасля ўвядзення Беларускай чыгункай больш за год таму новага спосабу набыцця пасажырскіх білетаў — праз інтэрнэт, гэтай паслугай скарысталіся ўжо звыш 18 тысяч чалавек.

Як паведамляюць у прэс-службе Беларускай чыгункі, на сёння заказ білетаў з выкарыстаннем інтэрнэту ажыццяўляецца на вакзалах станцый Гродна, Баранавічы-Палескія, Брэст-Цэнтральны, Орша-Цэнтральная, Гомель, Віцебск, Магілёў. Працягваюцца работы па стварэнні сістэмы рэзервавання месцаў у сістэме «Экспрэс», інфармацыйнага забеспячэння пасажыраў аб раскладзе руху цягнікоў, наяўнасці месцаў у іх, кошце праезду з выкарыстаннем сеткі інтэрнэт і абавязковай аплаты заказу з дапамогай банкаўскай пластыкавай карткі.

Продаж праязных дакументаў па банкаўскіх пластыкавых картках арганізаваны на вакзалах станцый Мінск-Пасажырскі, Баранавічы-Цэнтральныя, Гродна, Брэст-Цэнтральны, Гомель, Магілёў, Бабруйск, Асіповічы, Крычаў, Віцебск, Жлобін, Калінкавічы, Рэчыца, Полацк.

ВАКЗАЛЫ ПРЫГАЖЭЮЦЬ

Чыгуначныя вакзалы працягваюць перажываць рэканструкцыю з заменай інжынерных камунікацый, мадэрнізацыяй пасажырскіх платформаў, прымяненнем новых тэхналогій і абсталявання. Сёння на беларускай магістралі функцыянуе 21 чыгуначны вакзал, звыш 560 пасажырскіх прыпыначных пунктаў і 320 станцый.

Паводле даных Беларускай чыгункі, сёлета праведзена рэканструкцыя вакзальных комплексаў станцый Беларусь, Орша, Полацк, Бабруйск, Ваўкавыск, Слуцк, Рэчыца і некаторых іншых, а таксама транспартных збудаванняў ст. Гомель-Цэнтральны. Працягваецца рэканструкцыя вакзальных комплексаў станцый Маладзечна, Баранавічы-Палескія, Пінск, Віцебск, пасажырскіх платформаў з уладкаваннем навесаў станцый Мінск-Пасажырскі і Гродна. У трэцім квартале гэтага года будзе ўведзены ў эксплуатацыю вакзал станцыі Пінск і першая чарга рэканструкцыі вакзала станцыі Віцебск — пакоі для адпачынку, зала чакання, камеры захоўвання. Пачата рэканструкцыя і вакзальнага комплексу станцыі Брэст-Цэнтральны.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Сардэчна віншуем любую матулю і бабулю **Хрысціну Іванаўну АКУЛІНУ** з в. Ператок Калінкавіцкага раёна з 75-годдзем.

Хай кожны год — як колас жыта —
Заўсёды радасны, багаты.
А кожны дзень табой пражыты,
Каб падарункам быў і святам.

Дачка, зяць, унукі і праўнук.

ГІСТОРЫЯ АДНАГО НУМАРА «ЗВЯЗДЫ»

Гвардыі старшыне Белановічу газету даслалі ў Германію...

9 жніўня 1917 года выйшаў першы нумар газеты «Звязда»

Ёсць выслоўе: газета жыве толькі адзін дзень.

Аднак гісторыя «Звязды» пераканаўча абвяргае гэта сцвярджэнне.

Да Дня вызвалення Беларусі ў сталічнай бібліятэцы імя Л. Талстога адкрылася экспазіцыйная вітрына з нумарам «Звязды» за 3 ліпеня 1945 года. Гэта быў першы каляровы нумар газеты ў гісторыі беларускай журналістыкі.

На сёння іх — лічаныя экзэмпляры.

Вядучы бібліятэкар Галіна Рыгораўна Лагуновіч расказала, што газету прынесла ўдава мастака Іосіфа Белановіча Марыя Фёдараўна.

Гісторыя гэтага нумара «Звязды» надзвычай цікавая: ён пабываў... ажно ў Германіі!

Вось што паведаміла Марыя Фёдараўна:

— Іосіф Белановіч прайшоў усю вайну і быў дэмабілізаваны толькі ў 1946 годзе: яшчэ год пасля Перамогі знаходзіўся ў акупацыйных войсках у Германіі. Хтосьці з родных даслаў яму гэты нумар «Звязды» туды. Вяртаючыся ў Беларусь, прывёз газету з сабой. І захоўваў усё жыццё.

А жыццё гэтага чалавека было няпростым...

* * *

Іосіф Белановіч нарадзіўся ў Мінску ў 1920 годзе — 9 мая.

І так атрымалася, што прайшоў ён вайну — як кажуць, ад званка да званка, — набліжаючы 9 мая 1945 года, Дзень Перамогі.

Пасля заканчэння Пермскага мастацкага вучылішча, у красавіку 1941-га, яго прызвалі ў армію. Вайну сустрэў камандзірам процітанкавай гарматы.

«Ён працаваў у артылерыі ўсю вайну», — сказала Марыя Фёдараўна. І гэта агаворка (не «ваяваў», а «працаваў») досыць красамоўная.

Двойчы быў паранены Белановіч.

Вызваляў Сталінград, Харкаў, Запарожжа, Нікалаеў, Адэсу, Кішынёў, Люблін, Варшаву, Познань. Закончыў вайну ў Берліне... Дэмабілізаваўся ў званні гвардыі старшыны.

Марыя БЕЛАНОВІЧ і Галіна ЛАГУНОВІЧ каля экспазіцыі, прысвечанай «Звяздзе» ў бібліятэцы імя Л. Талстога.

Сярод узнагарод — ордэн Чырвонай Зоркі, два ордэны Айчыннай вайны, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», іншыя.

* * *

— Ён добра фатаграфаваў, — расказвае Марыя Фёдараўна. — І зрабіў шмат унікальных ваенных здымкаў, у тым ліку зруйнаванага Берліна, разбітых нямецкіх танкаў, выяваў аднапалчан у самых розных сітуацыях...

— Іосіф Белановіч быў артылерыстам і «па сумяшчальніцтве» — фатографам?

— У іх палку быў фотаапарат, Іосіф за яго «адказваў»: здымаў і рабіў картачкі. Умеў, у яго добра атрымлівалася.

Невыпадкова ў канцы вайны яму падарылі добры нямецкі фотаапарат. І дакумент адпаведны — што гэта падарунак за баявыя заслугі.

— Той фотаапарат не захаваўся?

— Усё захавалася! І фотаапарат, і «ножкі» да яго — яны раскладваюцца, усё як і паложана...

* * *

У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Марыя Фёдараўна перадала частку ваенных фотаздымкаў Белановіча, яго граматы-падзякі за ўзяцце Берліна, за прарыў абароны на рацэ Одэр, у раёне ракі Віслы.

У час вайны Іосіф Іосіфавіч збіраў паштоўкі з выявамі нямецкіх гарадоў. Упершыню ў жыцці я трымала ў руках паштоўкі 1942—1943 гадоў з маркамі, на якіх — Гітлер і іншыя нацысцкія кіроўцы.

* * *

У час вайны Белановіч вёў дзённік — у маленькім трафейным нямецкім штодзённічку. Кароткія запісы надзвычай дробнымі літаркамі, са скарачэннямі. На адной са старонак жніўня 1944-га намаляваў план мясцовасці: напэўна, была складаная франтавая абстаноўка.

«Ліпень 1943. Выпісаўся са шпіталя».

«6 лістапада 1944. За 4 гады зрабіў адзіны партрэт у цяжкіх умовах».

«14 студзеня 1945. Прарыў абароны на Вісле».

«9 сакавіка 1945. Іду з разведчыкамі на 1 дзень».

«14 сакавіка 1945. 11 гадзін вечара. Дождж».

«31 сакавіка 1945. Одэр. Збіты Ю-88... Прахалодная, туманная раніца. Ранні ўзыход сонца».

«15 красавіка 1945. У 5 гадзін раніцы прарыў абароны немцаў на Одэры».

* * *

Пасля вайны Белановіч працаваў у Брэсцкай крэпасці, напісаў дзесяткі моцных эцюдаў, якія склалі «Брэсцкі цыкл». Мастацтвазнаўцы адзначалі, што тут дакументалізм спалучаецца з глыбокім настроем: здаецца, пісаныя з натуры эцюды пахнуць порахам, водгуллем баёў, што вяліся ў суровых казематах; пераканаўчы малюнак, жывы мазок, бездакорнае адчуванне тону і колеру, настрою...

Менавіта ў Брэсцкай крэпасці і пазнаёміўся Іосіф з Марыяй.

— Ён вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, быў на практыцы. А я была студэнткай Брэсцкага педінстытута. Мы пастаянна бегалі ў крэпасць, было вельмі цікава. Сам Сяргей Смірноў, знакаміты аўтар кнігі «Брэсцкая крэпасць», праводзіў своеасаблівыя экскурсіі.

* * *

Творчая спадчына Іосіфа Белановіча досыць вялікая. Яго творы — у Нацыянальным мастацкім музеі, у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у фондзе Беларускага саюза мастакоў, у музеях Брэста, Пінска, Баранавічаў, іншых гарадоў.

Ён працаваў у жанрах сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта.

— Марыя Фёдараўна, ён пісаў вашы партрэты?

— Не. Гаварыў: станеш крышачку прыгажэйшай — тады...

— Лічыў вас непрыгожай?

— Гэта была адгаворка! *(Смяецца.)* У яго ж заўсёды не было часу: пастаянныя задумы, ідэі... Ледзь угаварыла напісаць аўтапартрэт.

Марыя Фёдараўна ўсё жыццё працавала настаўніцай, выкладала хімію і біялогію.

Мастак Іосіф Белановіч таксама доўгі час займаўся выкладчыцкай працай. Так склаліся абставіны...

У 1981 годзе ён праходзіў конкурс на званне дацэнта, патрэбна была характарыстыка. І яе напісаў ад рукі народны мастак СССР і Беларусі Міхаіл Савіцкі.

«Тав. Белановіча І.І. ведаю больш як 25 гадоў, гэта значыць увесь шлях станаўлення і прафесійнай дзейнасці мастака.

Будучы воінам у гады Вялікай Айчыннай вайны, з першых дзён да ўзяцця Берліна, ён прайшоў вялікую школу мужнасці, гераізму, патрыятызму... Гэта і вызначыла асноўную накіраванасць яго творчасці, яго пазіцыі мастака-гуманіста і патрыёта, які лічыць сваім доўгам унесці ўклад у стварэнне для будучых пакаленняў эпапеі свяшчэннай барацьбы.

Яго карціны «Героі бессмяротныя», «Брэст, 1941 год», «У бессмяротнасць», «Салдаты», «Хлеб партызанам», «Вяртанне», якія ўслаўляюць бяспрыкладны подзвіг, атрымалі грамадскае прызнанне. Жывапіснымі сродкамі, відавочна і даходліва, увасабляе ў творах гераізм і мужнасць не толькі салдата, але і працаўніка, раскрывае яго высокую маральнасць і годнасць. Будучы чалавекам сціплым, добрым, спагадлівым і чулым у радасці і бядзе людзей, заслужыў аўтарытэт і павагу.

Яго чалавечыя якасці вызначылі плённую педагагічную дзейнасць. З вялікай адказнасцю і любоўю ён шчодра перадае свае веды, творча падыходзіць да вучэбнага працэсу, патрыятычнага выхавання моладзі...».

* * *

Мастак Белановіч прайшоў усю вайну, мае ганаровыя ваенныя ўзнагароды...

І раптам чытаю: рэабілітаваны ў 1993 годзе.

Як? Чаму? Столькі заслуг у чалавека — і на табе!..

— А ён і не ўяўляў, што ў нечым вінаваты, — тлумачыць Марыя Фёдараўна. — У пачатку 1990-х напісала пляменніца, што па дакументах ён... лічыцца «ва ўцёках».

Жыццё і сапраўды падносіць сюрпрызы, якія не ў стане прыдумаць ніводны фантаст.

...Пасля смерці бацькоў Іосіф жыў у сям'і сястры Міхаліны. У 1935-м яе мужа — як кулака — усёй сям'ёй выселілі ў Комі АССР. І

15-гадовага Іосіфа разам з імі.

— А там аказалася больш людзей прыстойных, чым злачынцаў. Іосіфу параілі: ты яшчэ малалетка, хутчэй збягай. І падказалі, як гэта зрабіць... Іосіф збег да брата ў Ніжні Тагіл.

І думаць не думаю, што і праз дзесяцігоддзі ў архіўнай даведцы будзе значыцца, што «швагер І. Белановіч з 1936 года знаходзіцца ва ўцёках».

У 1992 годзе, даведаўшыся пра гэту дзіўную метамарфозу лёсу, падаў дакументы на рэабілітацыю...

* * *

Іосіф Белановіч пайшоў з жыцця ў 1998 годзе.

А ў 2006-м Марыю Фёдараўну чакаў яшчэ адзін моцны ўдар: раптоўна памёр адзіны сын Віктар. Было яму 46. «Гэта не прывядзі Госпадзі — пакласці ў труну такога сына...».

Засталіся маленькія ўнучкі, Ганна і Наталля — радасць і надзея бабулі... А яшчэ шматлікія работы мужа, ваенныя фотаздымкі, дакументы — вялікі архіў...

Галіна Рыгораўна Лагуновіч паведаміла, што выстаўка нумара газеты «Звязда» з архіва мастака Іосіфа Белановіча будзе доўжыцца да Дзён беларускага пісьменства.

* * *

Вось так... Гісторыя аднаго нумара газеты «Звязда» ўвасабляе не толькі лёс канкрэтнай сям'і, маленькае чалавечае жыццё, але і вялікую гераічную гісторыю нашай краіны.

Таццяна ПАДАЛЯК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з сямейнага архіва М. БЕЛАНОВІЧА.

Іосіф БЕЛАНОВІЧ у час вайны.

Мастак за работай.



Старонкі ваеннага дзённіка Іосіфа Белановіча.

Рэпарцёр атрымаў заданне..

«АБЯСШКОДЗІЦЬ» КУРЦОЎ...

І АБАРАНІЦЬ ІХ АД САМІХ СЯБЕ

Калі курыльшчыкі думаюць, што курэнне — іх асабісты клопат, яны, мякка кажучы, глыбока памыляюцца. Гаворка ўсё ж такі ідзе не пра сметанковае масла: тут сапраўды — хачу ем, хачу міма праходжу... Таму, шаноўныя аматары тытунёвага атручэння, «будзьце ласкавыя», аслабаніце рабочы кабінет, пасаду, парк, рэстаран, пад'езд, самалёт... Папярэджваю: наступ на курцоў будзе працягвацца. Але ж чарговых змен у жыцці грамадства, свабоднага ад такога наркатычнага рэчыва, як тытунь, многія з цяперашніх залежных ад яго могуць і не пабачыць... За наступнай зацяжкай раю паразважаць над гэтым.

Удар па колькасці

Зараз у нашай краіне з'явіліся сур'ёзныя падставы для таго, каб разлічваць на станоўчыя змены. Літаральна праз два гады актыўнае ўжыванне тытунёвых вырабаў ва ўзроставай групе да 15 гадоў зменшыцца на 20 працэнтаў, 16—20 — на 10, 21—30 — на 7, пасля 30 гадоў — на 5 працэнтаў. На такі вынік разлічваюць спецыялісты, якія ўзялі ўдзел у распрацоўцы Комплекснай праграмы барацьбы супраць тытуню на 2008—2010 гады. Праграма прафілактычнага характару ўжо актыўна рэалізуецца — міністэрствамі аховы здароўя, адукацыі, спорту і турызму, культуры, інфармацыі, а таксама Беларускім дзяржаўным канцэрнам харчовай прамысловасці.

— Акрамя комплекснай праграмы, у рэспубліцы рэалізуюцца Рамачная канвенцыя Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па барацьбе супраць тытуню і Дэкрэт № 28 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, — адзначае Ніна ТКАЧОНАК, загадчыца аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. — Гэта павінна не толькі скараціць ужыванне тытунёвых вырабаў беларусамі, знізіць захворванасць і заўчасную смерць насельніцтва, але і ў цэлым паспрыяць павелічэнню сярэдняй працягласці жыцця, паляпшэнню дэмаграфічнай бяспекі. Напрыканцы гэтага года мы правядзём сацыялагічнае апытанне з тым, каб высветліць, ці дасягнуты першыя канструктыўныя вынікі. Калі ж яны акажуцца малазначнымі, магчыма, будзем весці гаворку аб увядзенні больш жорсткіх мераў...

Прадугледжаныя ўжо зараз меры — досыць сур'ёзныя. Іншая рэч, цудоўная заканадаўчая база на практыцы, як нярэдка бывае, аказваецца «пустым гукам». Так, паводле памянёнага Дэкрэта № 28, жыллёва-камунальныя гаспадаркі абавязаны штрафаваць людзей, якія курыць у пад'ездах, але ж на запыт цэнтра гігіены аб колькасці такіх выпадкаў быў атрыманы дакладны адказ — нуль цэлых нуль дзесятых. Пры тым, што памер штрафу ў такіх выпадках вагаецца ад 10 да 30 базавых велічынь!

Прадстаўнікі органаў унутраных спраў спагналі за паўгода хаця б звыш сотні штрафаў за курэнне ў забароненых для гэтага месцах. Праўда, і «дыяпазон» такіх месцаў тут больш шырокі. У той жа сталіцы свабоднымі ад курэння лічацца, скажам, гарадскія паркі і Батанічны сад (у абласных цэнтрах падобныя свабодныя ад курэння «зоны» вылучаюць мясцовыя ўлады). Катэгарычна забаронена курэнне ва ўстановах аховы здароўя, адукацыі, спорту і турызму, культуры, грамадскага харчавання, у памяшканнях органаў дзяржкіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і арганізацый, на вакзалах, у аэрапортах, падземных пераходах, на станцыях метрапалітэна. Парушэнне «правіла» пагражае адміністрацыйным пакараннем — штрафам ад 0,5 да 5 базавых велічынь. Дарэчы, і самі праваахоўнікі не маюць права курыць на сваім рабочым месцы, у форме. Скажам, той жа супрацоўнік ДАІ, чыё рабочае месца, здавалася б, на свежым паветры, можа далучыцца за перакур... да ліку беспрацоўных.

Пазбавіцца рызыкі развіцця захворванняў, звязаных з курэннем, можна толькі двума шляхамі: не пачынаць курыць або кінуць, калі робіш гэта.

Ва ўсіх установах, дзе курэнне не забаронена, павінны быць спецыяльныя, з добрай вентыляцыяй, памяшканні для гэтага. Аднак ведаю, што яшчэ далёка не ва ўсіх установах існуюць падобныя зручнасці. Хочацца спытаць, чаму, чаму цудоўнае заканадаўства такое далёкае ад рэальнага жыцця? Хоць гэта не адно пытанне, ад якога я пакутую: хто б паклапаціўся аб спагнанні штрафу з бацькоў, чые дзеці адкрыта курыць на перапынках пад сценамі школы? Вось калі пацыент парушыць умовы знаходжання ў медустанове, то яму і адмовіць у далейшых паслугах могуць... Чаму ж у адносінах да дзяцей мы такія лаяльныя?

Ніякай рамантыкі

Зараз цэнтр гігіены разам з Дзяржстандартам працуе над адным цікавым дакументам. У хуткім часе курыльшчыкі не змогуць адрозніць «Кэмел» ад «Мальбара» па знешнім выглядзе, паколькі ўсе цыгарэтныя пачкі будуць аднолькавага, чорна-белага, колеру і без усякіх малюнкаў ды «заманух» — накшталт «лёгкія», «ультралёгкія» і г.д. Акрамя таго, з аднаго боку кожны пачак будзе «ўпрыгожваць» надпіс «Курэнне — прычына развіцця сардэчна-сасудзістых і ракавых захворванняў», а з другога — адзін з наступных пяці надпісаў: «Курэнне спрыяе развіццю імпатэнцыі і жаночай бясплоднасці», «Курэнне — прычына інфаркту і інсульту», «Курэнне — цяжкая залежнасць. Не пачынайце курыць», «Курыльшчыкі паміраюць маладымі», «Засцеражыце дзяцей ад тытунёвага дыму». У Расіі, напрыклад, будзе 12 разнавіднасцяў надпісаў, але сутнасць, зразумела, тая ж.

Паводле слоў Ніны Ткачонак, як толькі ўступіць у сілу Закон «Аб маркіроўцы тытунёвых вырабаў», а здарыцца гэта даволі хутка, вытворцы атрымаюць роўна год, каб перайсці на выраб тытунёвай прадукцыі ў абноўленым выглядзе. Старых цыгарэт мы не ўбачым ужо напрыканцы 2009 — пачатку 2010 года.

Шматаблічны тытунь

У Беларусі кураць 32,3 працэнта насельніцтва. Гэта, праўда, менш, чым у 2001 годзе, на 9,3 працэнта. У свеце ёсць краіны і з большай колькасцю курцоў, але для многіх, у тым ліку і для Беларусі, характэрна адна нядобрая сумесная тэндэнцыя: змяншэнне колькасці курцоў-мужчын на карысць павелічэння залежных ад тытуню жанчын. Між іншым, цікава: да 35-гадовага ўзросту жанчын-курцоў застаецца толькі 3 працэнты. Спецыялісты мяркуюць, што развітанне слабага полу з «моцнай» звычкай абумоўлена ў такіх выпадках пераасэнсаваннем той шкоды, якую нанёс тытунь не толькі ўласнаму здароўю, але і здароўю іх дзяцей.

У развітых краінах, скажам, у Швейцарыі, праблема набыла нечаканы характар: «курцы» ўжо не дымяць у самалётах і рабочых кабінетах. Яны пераарыентаваліся на тытунь... смактальны, у выглядзе жуек. Але ж шкода, нанесеная здароўю, у любым выпадку абсалютна аднолькавая і залежнасць фарміруецца не менш слабая.

Небяскрыўдны ментол

Падлічана, што ў сярэднім 15,5 тысячы беларусаў у год гіне ад прычын, абумоўленых курэннем. Устаноўлена, што кожная цыгарэта скарачае чалавеку жыццё на 14 хвілін.

Паводле пэўных даследаванняў, нікацін з цыгарэтнага дыму можа стымуляваць дзяленне і размнажэнне ракавых клетак у лёгкіх. Актыўнае курэнне павялічвае верагоднасць развіцця раку і іншых лакалізацый. Курэнне наогул шкодна ўздзейнічае на ўсе органы і сістэмы — ад органаў зроку да кішэчніка і ад сардэчна-сасудзістай сістэмы да рэпрадуктыўнай. Праўда, найчасцей гаворыцца аб тым уроне, які наносіць тытунь сасудам, вымушаным рэагаваць на зацяжкі рэзкім звужэннем.

Па меркаванні спецыялістаў, так званыя «лёгкія», з паніжаным утрыманнем нікаціну, цыгарэты могуць нанесці нават большую шкоду, чым традыцыйныя, паколькі такая фармулёўка прымушае быццам бы бяскрыўдна выкурыць большую іх колькасць. Насамрэч аматары любых марак, у тым ліку «лёгкіх», атрымліваюць аднолькавую колькасць канцэрагенных рэчываў. А вось прыхільнікі цыгарэт з ментолам толькі паскараюць развіццё адмоўных працэсаў у арганізме, паколькі ментол добра расшырае бронхі і тым самым «дапамагае» атрутным рэчывам усмоктвацца больш поўна і хутка.

Больш рашучасці!

Курэнне — гэта залежнасць, а, значыць, першае што вы павінны зрабіць непасрэдна зараз, — дакладна ўстанавіць, чаму яна сфарміравалася.

Адзін псіхолаг, які працуе з алкаголікамі і наркаманамі, кажа залежным: дапусцім, ты выпіваеш ці колешся з-за таго, што цябе штосьці-хтосьці не задавальняе ў жыцці — праца, заробак, жонка, цешча... Але ж чым часцей ты будзеш звяртацца да сваёй залежнасці, тым хутчэй у прамым сэнсе развітаешся з імі, а «раздражняльнікі» застануцца. Дзе ж логіка?

Спосабаў развітання з цыгарэтамі — безліч. І нікацінавыя пластыры, і жуйкі, і вылучэнне дзён без курэння, і пакіданне вялікіх акуркаў, але ўсё гэта будзе не больш чым гульнёй, пакуль адноўлены курэц проста не скажа сабе цвёрдае, упэўненае, узважанае «НЕ!». Прычым без усялякіх рэпетыцый і падрыхтовак. Як кажуць псіхолагі, ніколі не сячыце кошцы хвост па частках — не расцягвайце пакуты.

«Ломка» — фізічная нязручнасць без звыклай цырымоніі — працягваецца ўсяго два дні. Далей станоўча лягчэй. **Пасля адмовы ад курэння могуць з'явіцца некаторыя сімптомы, звязаныя з пераадоленнем залежнасці арганізма ад курэння:**

— пагаршэнне настрою,
— пачуццё неспакою, трывогі,
— парушэнне сну,
— зніжэнне канцэнтрацыі ўвагі,
— пачашчанае сэрцабіццё, патлівасць, боль у вобласці сэрца,
— сухасць у роце.

Для зніжэння непрыемных адчуванняў можна выкарыстоўваць і той жа нікацінавы пластыр ці нікацінавую жуйку, а лепей — прымаць полівітаміны, абавязкова вітамін С, настой валяр'яну, сардэчніку.

Каб не прыбавіць у вазе:

● ешце часцей і дробнымі порцыямі, не наядайцеся на ноч;
● абмяжуйце мучныя і тлустыя вырабы;
● не замяняйце цыгарэту цукеркай ці пірожным, лепей — апельсінам, морквай або агурком;
● займіцеся фізкультурай, якая, як вядома, не толькі спрыяе добрай фігуры, але і зняшае стрэс і адцягвае ўвагу ад курэння.

Змяніце свой распарадак дня так, каб курэнне стала надзвычай нязручным. Знайдзіце новае захапленне, пазбягайце сітуацый, у якіх прывыклі курыць.

Большасць зрываў прыпадае на першыя тры месяцы, калі чалавек кінуў курыць. Каб не дапусціць гэтага або паспрабаваць яшчэ раз, не расказвайце ўсім, што задумалі развітацца з цыгарэтай. Давайце сабе слова не курыць штодня, каб пратрымацца, перасіліць сітуацыю толькі на адзін дзень! Гэта асноўны і самы эфектыўны пакуль прынцып, паводле якога спецыялісты раяць пазбаўляцца ад любой залежнасці.

Ажыццяўляйце спробу за спробай, і адносіны ў вас абавязкова атрымаецца. Калі ж не, будзьце гатовыя да самых жорсткіх наступстваў, у тым ліку да выпрабавання інтэрв'ю, якое ў вас возьмуць як у чалавека, які заўчасна памёр.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Казкі для дарослых

ЧОРНАЯ КОШКА Ў ЦЁМНЫМ ПАКОІ

...Шыкоўнае вяселле на сто з лішкам чалавек яны адзначалі ў вялікай банкетнай зале сталічнага рэстарана. Госці, як водзіцца, елі, пілі і танцавалі, сябры раз-пораз цягнулі Віктара «пакурыць» і «пагаварыць за жыццё» — ужо як з жанатым чалавекам... А ён баяўся сысці з месца, баяўся адпусціць руку той, якая сядзела побач, баяўся, што і зараз яна возьме ды перадумае, выскачыць з-за стала, накіне свой лёгкі плашчык — і шукай ветру ў полі... Да вяселля ён разы тры рабіў ёй прапанову — смяялася, раздумвала, аднеквалася... Чакала кагосьці? Прыгожая — дух захоплівае. Цёмныя, амаль чорныя непаслухмяныя завіткі, пранізлівы позірк... Здаецца, і не смяецца, а ў вачах чарцяняты скачуць. Смуглявая — быццам толькі з поўдня вярнулася. І імя такое пяшчотнае — А-лі-на... Аля...

Ён не адзін рабіў ёй прапанову выйсці замуж. Ведаў пра гэта. Але злосці ці рэўнасці не адчуваў. Наадварот — гонар. Хоць і не сам выбіраў, а да яго нібыта прыцэньваліся, параўноўвалі з іншымі, узважвалі «плюсы» і «мінусы»... Ён цярпліва чакаў канчатковага выбару. Не прыспешваў, не настойваў, каб потым не чуць папрокаў. І яна выбрала. Чаму, за што? Наўрад ці за яго празмернае захапленне вандраваннямі і рыбнай лоўляй. Хутчэй, за спалучэнне не надта ўласцівага прадстаўнікам моцнай паловы рамантызму і мужнасці, пяшчоты і рашучасці... (Неяк ён абараніў яе ад двух п'яных нахабнікаў, якія пачалі прыставаць, не звяртаючы ўвагі на хударлявага «батаніка» ў акулярах...)

Потым ужо, калі пачалі разам жыць, весці гаспадарку, калі нараздзялася Танечка, Віктар не стаў, як большасць мужчын, збягаць з любой нагоды ад сямейнай аднастайнасці, шукаючы «паратунку» ў вясёлых халасцяцкіх кампаніях. Ён насіўся па малочных кухнях, аптэках і магазінах, уставаў да Танечкі па начах, мяняў ёй пялёнкі-распашонкі, гушкаў, няньчыў, мыў і карміў з бутэлечкі гэта маленькае «Алініна падабенства»... Сябры не перастаралі зайздросціць яму — Аліна пасля родаў пахудзела, падцягнулася, ледзь прыкметныя зморшчынкі ля вачэй надалі твару выраз лёгкай стомленасці і разам з тым вопытнасці, самаўпэўненасці... «Вось гэта жанчына!» — паўтаралі і адны, і другія, і трэція...

Ужо і Танечка падрасла, пайшла ў садок. І Аліна пасля доўгіх пакут і беганіны знайшла сабе работу... Праз знаёмых Віктар дапамог ёй уладкавацца ў турыстычную фірму. І пры першай магчымасці (якая з'явілася даволі хутка) Аліна адправілася адпачываць у Балгарыю, на славутыя Залатыя Пяскі... Дачка, ужо даволі дарослая і самастойная пяцігадовая дзяўчынка, засталася з татам. Ёй ніколі не было з ім сумна. Разам ездзілі на рыбалку, сядзелі побач на якім-небудзь маленькім возеры, закінуўшы ў ваду дзве вудачкі — вялікую і маленькую, і расказвалі адно аднаму вясёлыя гісторыі. Або дома клаліся побач на канапу ў вялікім пакоі і разглядалі фотаздымкі з сямейных альбомаў. Або варылі на пліце сапраўдную паходную юшку, у прыгатаванні якой тата быў вялікі майстар...

Маму з адпачынку сустракалі таксама разам. Перад ад'ездам у аэрапорт Віктар купіў ружы — самыя прыгожыя, якія толькі змог знайсці...

Калі Аліна ішла ім насустрач па зале чакання, на яе аглядваліся ўсе мужчыны...

«Ну што, пойдзем на таксі?» — спытаў Віктар пасля таго, як сцішыліся першыя эмоцыі і Танечка спаўзла з маміных рук. «Ды не, — адказала Аліна. — Да горада нас падвязуць, я дамовілася». Яна падышла да маладога, даволі мажнага мужчыны ў светлым касцюме — аднаго з іх групы. Мужчына махнуў рукой у бок вуліцы — менавіта там яго чакала машына, і яны накіраваліся да выхаду...

Сям'я зажыла сваім жыццём. Хоць... не зусім. Часам Віктару здавалася, што нехта невядомы і нябачны ўносіў карэктывы ў іх прывычны расклад. З-за дрэннага Алінінага настрою зрываліся сумесныя паходы ў госці і паездкі з сябрамі на пікнікі, з-за яе раптоўнага галаўнога болю Віктар быў вымушаны адзін ехаць з дачкой да бабулі або ісці ў парк... Зноў жа, гэта не складала для яго вялікай цяжкасці. Наадварот. Радаваўся, што пасля таго, як яны з Танечкай вярталіся дадому, Аліна сустракала іх у значна лепшым настроі і адчувала сябе здаровай... Праз два месяцы яна прызналася Віктару, што цяжарная. Не ад яго, а ад мужчыны, з якім збіралася звязаць сваё жыццё пасля разводу...

Віктар нічога не мог сказаць. Яго пакідалі. Чаму? За што? Аліна не хацела тлумачыць. «Я кахаю іншага», — і ўсё. Ён сказаў: «Ну і кахай. Кахай яго, але заставайся са мной. Потым, калі ўсё гэта скончыцца, пачнём спачатку. Дзіця, што народзіцца, буду лічыць сваім». Аліна толькі адмахвалася, як ад надакучлівай мухі, і прыспешвала з разводам. Думалі, што Віктар застанецца ў кватэры, а Аліна з дачкой пераедуць да новага таты. Праўда, ніхто не ведаў, як расказаць Танечцы...

У судзе Аліне прапанавалі яшчэ крыху падумаць, узважыць усе «за» і «супраць», але яна настаяла на сваім. Усю віну ўзяла на сябе, пра Віктара дрэннага слова не вымавіла. Суддзя ў роспачы развяла рукамі: «Навошта ж разыходзіцца? Вы ж кахаеце адно аднаго!» Віктар ні аб чым не прасіў. Мужчынскі гонар не дазваляў навязвацца, перашкаджаць яе шчасцю. Вельмі шкада было Танечку. Але Аліна сказала: «Калі можаш, да нас пакуль не заходзь. Ёй трэба прывыкнуць да іншага бацькі».

...У пустой кватэры ён не мог стрымліваць сябе — плакаў ад болю і адзіноты. Утварыўся вакуум, запоўніць які не маглі ніхто і нішто. Сябры, каб дапамагчы «развеяцца», прыходзілі ў госці і прыводзілі з сабой маладых прыгожых жанчын. Віктар нікога не хацеў бачыць, не рэагаваў ні на якія спакусы. Ён трызніў Алінай, бачыў паўсюль яе вобраз, маліўся ўсім вядомым і невядомым багам... І багі пачулі яго малітвы.

Недзе праз год, калі боль пачаў ужо прытупляцца, Аліна нечакана пазваніла сама. Ён узрадаваўся, але не так, як некалі. Ціха ўзрадаваўся, спакойна. Як старой добрай сяброўцы ці проста прыяцельцы. Яна сказала: «Мне тут дрэнна, я хачу вярнуцца». «Прыходзь, — адказаў Віктар. — Месца хапае». У гэты момант ён зразумеў, што чакае не столькі Аліну, колькі дачку. Жонка нібыта ператварылася для яго ў далёкую зорку — бліскучую, але халодную. Яна ўсё яшчэ прыгожа свяціла, але не сагравала... Даўно ўжо не сагравала... Яе промні рассеяліся і згубіліся ў прасторы і часе...

Так і жылі потым — Віктар у асобным пакоі, Аліна з дзецьмі — у двух іншых. Ён быў уважлівым і ветлівым, дапамагаў няньчыць малога, з задавальненнем хадзіў на прагулку з Танечкай... Але блізка да сябе Аліну не падпускаў. Хоць часта, вельмі часта лавіў на сабе яе позірк, які, здавалася, вымольваў даравальне... Каб дараваць, трэба было кахаць. А ў сваім сэрцы Віктар ужо не знаходзіў нічога падобнага на былое каханне. Ды і сэрца быццам застыла, акамянела...

Ён даваў Аліне грошы на гаспадарку, аднак не дакранаўся да пакінутых на стале сняданку ці вячэры. Заглядваў у іх пакой, каб пажадаць добрай ночы, і зачыняўся ў сваім. Некалькі разоў Аліна рабіла спробы высветліць адносіны — дарэмна. Ён не жадаў нічога ўспамінаць з былога жыцця... Яна ж не хацела з гэтым мірыцца і перахадзіла да папрокаў, патрабаванняў. Патрабавала вярнуць ранейшыя адносіны. У ход пайшлі істэрыкі, скандалы, пагрозы...

Віктар перастаў прыходзіць дадому. Начаваў у знаёмых, на вакзалах, у начных электрычках... Паступова прызвычаіўся да спіртнога. Раней яно заглушала боль, цяпер выратоўвала ад абыякавасці.

Праз некалькі гадоў ён сустрэў іншую жанчыну. (Сышліся, жывуць разам, гадуюць яе дзяцей ад першага шлюбу...) Шчаслівы ці нешчаслівы — вызначыць цяжка. Гэтаксама, як і адказаць на пытанне, ці ўспамінае сваю Аліну... Ды і ці можна ўвогуле вярнуць страчанае каханне? Ці здольны хто-небудзь з нас гэта зрабіць? Ці не дарэмныя намаганні — шукаць чорную кошку ў цёмным пакоі, тым больш калі яе там няма?

Калі вы былі шчаслівыя — успамінайце пра гэта з удзячнасцю. Калі вы шчаслівыя цяпер — беражыце і захоўвайце гэтыя імгненні. Бо няма на свеце больш крохкай субстанцыі, чым тая, якая завецца каханнем...

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

РАШЫ ДЛЯ ДУШЫ

Кандыдат у майстры спорту па практычнай гульні У. Сапяжынскі ў апошні час актывізаваўся як шашачны кампазітар. Сёння ён прапануе чытачам адвесці душу пры рашэнні яго новых эцюдаў. Першы падаецца намі ў якасці задання № 1 бліца-40, другі — па-за конкурсам:



БЕЛЫЯ: damкі a3, a5, b6 (3). ЧОРНЫЯ: d2, h6, дамка e1 (3).



БЕЛЫЯ: d2, e5, дамкі c3, f4 (4). ЧОРНЫЯ: a3, f8, h4, дамка c7 (4).

У іх белыя пачынаюць і выйграюць.

Пераможцаў конкурсу чакаюць сюрпрызы ад нашага шчодрага чытача Анатоля Пярхальскага (Глыбокае) — яго зборнікі звяздоўскай шашачнай рубрыкі №№ 3—5 за 2005—2007 гады ў мастацкім афармленні мясцовага «ФОТА-цэнтра». Свае адказы накіроўвайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

ФЕСТЫВАЛЬ «МІНСК-2008»

Ён праводзіцца па шашках-100 і даўно стаў традыцыйным. Гэтым разам, у 21-м па ліку дамінавалі міжнародныя майстры Арцём Іваноў з Украіны, Андрэй Толчыкаў з Гомеля і міжнародны гросмайстар украінец Юрый Анікееў (гросмайстарскі турнір), міжнародны гросмайстар, майстар ФМЖД у мужчынскім заліку мінчанка Ірына Пашкевіч, майстар ФМЖД расіянін Кірыл Чулкоў і нацыянальны майстар з Мінска Вольга Федаровіч (адкрыты турнір, у якім удзельнічалі 26 ігракоў).

Пазнаёмцеся з вострай сітуацыяй галоўнага турніру:

БЕЛЫЯ (І. Міхальчанка, Ваўкавыск): 24, 27, 29, 32, 33, 36, 37, 38, 39, 42, 44, 45 (12). ЧОРНЫЯ (А. Іваноў): 2, 3, 6, 8, 9, 13, 15, 16, 18, 20, 21, 26 (12). Белыя славяліся на шасціхадовую камбінацыю: 1. ... 26-31! 2. ... 8-12 3. ... 18-22 4. ... 9-13 5. ... 3x43 6. ... 20x47+.

Паведаміў карэспандэнт нашай рубрыкі Вільям Астрынскі — кандыдат у майстры спорту.

ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Лаўрэатамі конкурсу «Пагода ў доме»-4 сталі пенсіянер-настаўнік Леанід Вітошкін (Гомель), токар-універсал магілёўскага завода «Тэхнапрыбор» Дзмітрый Камчыцкі, механік АТУП-9 Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), кінамеханік Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна) і аператар тэхналагічнай установкі ААТ «Нафтан» Пётр Шклудаў (Наваполацк). Яны набралі максімальную колькасць ачкоў (13) і будуць прэміяваны. Адзначаюцца таксама суддзя конкурсу Мікалай Грушэўскі і каардынатар спаборніцтваў Яўген Ляхаў.

Усяго на 0,5 ачка адсталі Іван Астроўскі (Мінск), Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), Іван Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), Канстанцін Козел (в. Ласосна Гродзенскага раёна), Сяргей Нячаеў (Баранавічы), Іван Працюк (Паставы), Андрэй Раманюк, Віктар Сіўругін і Аляксандр Янчук (Камянец), Аляксандр Яўсееў (Бялынічы).

Далей у конкурснай табліцы размясціліся: В. Жукоўскі (г. Барань Аршанскага раёна), Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), А. Кіслы (Узда), В. Краўчук (Баранавічы), А. Перавознікаў (Рагачоў), Р. Сідарчук і У. Сямашка (Брэст), В. Ціханенка з Гомеля (па 12 ачкоў).

Астатнія ўдзельнікі запісалі на свой рахунак меншую колькасць ачкоў: А. Мікуліч (10), А. Агіевіч, В. Гаўрыш (па 9,5), А. Белы, В. Белы, М. Трухан (па 9), А. Пярхальскі (7), В. Голас, І. Калтовіч, Марыя Лічко, В. Логвінаў, А. Нячаеў (па 6), П. Акуліч, А. Коўчан, К. Найдовіч (па 5), А. і І. Ашыхміны, П. Леўчык, І. Мацкевіч, У. Ціханаў (па 3), Я. Казлоў, Ц. Каркенаў, Анжэліка Кашкан, Д. Мамедаў, Д. Семянюк, А. і А. Яраховічы (па 2).

Пераможцы конкурсу пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў. Норма ж другога спартыўнага разраду па шашках склала 12 ачкоў. Дадзеная публікацыя з'яўляецца падставай для прысвоўвання звяздоўскім канкурсантам адпаведных разрадаў.

Сярод жанчын заахвочваецца А. Камінская.

Мы вельмі ўдзячныя чытачам за актыўны ўдзел у конкурсе, а калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч Барэль) — за прызы.

Жывая зямля

НА КРЫЛО!

Літаральна апошнімі днямі на Беларусі развіваліся са сваімі гнёздамі драпежныя птушкі — арланы, беркуты, вялікія і малыя арляцы, луні, каршакі і ястрабы. Атрад арліных — гэта гонар і сімвал захавання нашай прыроды. Мінуў складаны, калі не сказаць цяжкі, этап птушынага жыцця — стварэнне птушынай пары, выбар месца і пабудова гнязда, кладка яек і выседжванне, кармленне птушанят. Але гэта не азначае, што для птушак мінуў час поўнай небяспекі, і таму бацькі-птушкі будуць яшчэ працягваць догляд сваіх нашчадкаў да самага іх адлёту.

«Драпежныя птушкі — гэта вяршыня прыроднай піраміды, значыць на Беларусі захаваны ўсе віды біялагічнай разнастайнасці», — кажа вядомы беларускі арнітолаг, навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка, кандыдат біялагічных навук, рэжысёр-аніматар і цудоўны фатограф жывой прыроды Ігар Бышнёў. Ён папрасіў звярнуць увагу беларускіх паляўнічых (цяпер якраз сезон паляванне на птушак), каб чалавек з ружжом не паднімаў стрэльбу на драпежную птушку.

Мне ўдалося зрабіць фотаздымкі птушаняці малога арляца перад самым адлётам з гнязда. На маіх вачах, можна сказаць, ён рос, я бачыў моманты кармлення птушаняці бацькамі-арламі. Як ні дзіўна, не ў здзічэлых і непраходных мясцінах быў звіты арліны дом — у звычайным асінніку ў Вілейскім раёне, усяго гадзіну язды ад сталіцы. Калі такая птушка не баіцца суседства з чалавекам, значыць, зямля наша сапраўды жывая — у поўным сэнсе гэтага слова.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.



Гультайства — рухавік прагрэсу

Было гэта гадоў з 20 назад. Сужэнцы Ніна з Віктарам журавін увосень назбіралі, а прадаць іх вырашылі не дома, а, як па цяперашнім часе, дык за мяжой — у суседняй Украіне. Там, казалі, на добрыя ягады цэны вышэйшыя. Перабралі яны, значыць, свае, у кампанію кума паклікалі — і ў Львоў.

Прыехалі, на рынку месцы занялі — мужык з жонкай бліжэй да аднаго ўваходу-выхаду, Мікола, кум іх, — да другога. Вось толькі гандаль не дужа ладзіцца — зіма, холад. Убачыў Віктар, што Ніна і адна спраўляецца, і гайда «ў самаволку», да кума — пакурыць, паглядзець, як у яго там бізнэс ідзе.

А той, трэба сказаць, гумарыст, якіх пашукаць яшчэ, — калі за дзень не збрэша чаго, вечарам спаць не ляжа.

Сядзіць, значыць, той, як быццам гандлюе, а заадно — ягады свае перабірае: сапсаваныя (пачарнелыя, жоўтыя) у адзін бок, добрыя, прыгожыя — у другі. Кабета нейкая падыходзіць — вылітая пані, — пытае, па чым журавіны?

— Пяць рублёў, — адказвае Мікола і тут жа давай завіхацца ўзважваць.

Разлічыліся, пані адышлася, але... назад вяртаецца. Пытае:

— А вунь тое, у мяшэчку, у вас што — не насенне?

— Так, так, пані! — аж прагінаецца Мікола, — насенне. Але ж яно каштуе даражэй — па 7 рублёў.

Патаргаваліся, купіла кабета — цэлы мяшэчак. Зноў пайшла. І зноў вярнулася. Пытае:

— А раскажыце ж вы, як гэтыя ягады правільна вырошчваць?

Мікола і вокам не міргнуў — усю агратэхніку ёй выдаў: у якую глебу, якім часам, чым падкарміць... Гаварыў доўга, гаварыў так пераканаўча, што Віктар, які ўсё гэта чуў, усур'ёз задумаўся, а на халеру і нам на балота хадзіць? Там жа гразка... І гадзюкі... І мяшкі далёка цягаць...

— Давай, — кажа куму, калі пані сышла, — на градах журавіны вырошчваць.

— Дык што, і табе насення прадаць? — спытаў Мікалай.

...Па дарозе дамоў разам пасмяяліся, разам пашкадавалі, што ў той пані нумар тэлефона не ўзялі. Можна было б спытаць у яе, як поспехі ў вырошчванні — па тэлефоне ж яна твар не абдзярэ?

Галіна Бабарыка,
в. Мачуль, Столінскі раён

Голас звыш

Паветраных ліній сувязі каля вялікіх гарадоў і мястэчкаў вы ўжо не ўбачыце. А вось у вясковай глыбінцы — яны ёсць, служаць, хоць і не заўсёды так, як хацелася б: то моцны вецер дрэва паваліць — правады парве, то драўляная апора падгніе — зломіцца, то...

На скрыжаванні дзвюх досыць бойкіх дарог нехта з кіроўцаў прычым нейкага досыць загадкавага (вышынёй больш чым 5 метраў) транспартнага сродку ніжнія правады абарваў, а верхнія ад удару заблыталіся. Мне, як электраманцёру, давялося з імі памучыцца, папрацаваць. А для таго, каб замест абарваных новыя павесіць (ды яшчэ над дарогай), нават падмогу паклікаць.

Але ж зрабілі ўсё. Напарніка я адпусціў. Сам на вышыні сяджу, у сэнсе — на слупе — вязку правадоў завяршаю. Пад слупам у мяне машыны снуюць, кружнік стальнога дроту стаіць...

Раптам — гляджу і вачам не веру — спыняецца побач з ім шыкоўная іншамарка, высокавае адтуль стройная, прывабная маладзічка на «шпільках», лёгенька «падбірае» мой кружнік, адчыняе багажнік і...

— Куды-ы?! — раву немым голасам на ўсю лясную акругу.

Дзяўчына падымае да мяне галаву, пунсавее, кідае спачатку дрот, потым мне: «О-о, извините!», садзіцца ў машыну і — па газах.

...Кім я сябе адчуў у гэтыя моманты, чытач здагадаецца. А вось што бачным быў — трохі шкада. Голасам адтуль, зверху заставацца было б цікавей.

Аляксандр Матошка,
в. Янкавічы, Расонскі раён

Але вопыт ёсць

Лічыцца, што аўтамабільныя заторы бываюць толькі ў гарадах. Няправільна лічыцца, бо ў вёсках вы таксама бываюць. Асабліва — калі па вуліцы статак ідзе...

Каровы, трэба сказаць, зараз выхаваныя, прычым у духу тэхнічнага прагрэсу: на машыны — ніякай увагі, ідуць сабеды ідуць па сваіх каровіных занятках, а тут...

Сама назірала — за статкам з дзесятак машын сабралася. Вадзіцелі па-рознаму сябе паводзяць: нехта ззаду паціху сунецца, нехта нервуецца, а адзін маладзён аж са скуры вылузваецца — безупынку сігналіць, у фортку нешта крычыць, каровам з іншамаркай сваёй пад самы азадак лезе (спадзяецца, мусіць, што дарогу саступяць...).

А не тут тое было! Адна з кароваў (з норавам, відаць?) да кіроўцы таго пысу павярнула, на аўто яго паглядзела, а потым запынілася, хвост падняла і... усё, што ёй перапрацавана было, «вылілася» на капот таму нецярплівцу, на лабавое шкло.

Рэакцыю вадзіцеля я апісаць не бяруся. Можаце ўявіць самі — усё будзе праўдай.

...«Ластаўку» сваю адмываў ён, відаць, доўга — белымі ручкамі, у белых шыкоўных штанах. Але ж мо запомніў, што заторы бываюць і ў вёсках, што прадугледжаваць іх трэба. Праязджаць таксама. Пажадана — умеючы.

Ніна Рыбік, *г.п. Астравец*

Каб у хату зайсці, разуцца мала?

Не ведаю, як вы, а я на сваёй пошце досыць часта бываю: то мне трэба на «Звязду» падпісацца, то канвертаў купіць, то пасылачку неяку паслаць, то плёнку здаць у праяўку... Харошыя там дзяўчаты, уважлівыя. У сэнсе, з якой бы патрэбай да іх ні прыйшоў, заўжды дапамогуць альбо хоць параяць... І ўсміхаюцца заўжды.

У той жа раз — нават смяяліся. Пытаюся: «Мусіць, нешта смешнае з'елі?». Кажуць: «Не... З'елі мы — дужа смачнае, але ж прыгатаванае — і сапраўды не без смеху».

А ўсё, значыць так было. Адна з паштарак кабана закал

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПАЧЫНАЕМ НОВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

У конкурсе — 18 заданняў. Адказы на іх ацэньваюцца пэўнай колькасцю ачкоў, як правіла, роўнай колькасці хадоў ва ўмове задачы. Пабочныя рашэнні ацэньваюцца, як і асноўныя. Гэта ж датычыцца і выпадку доказу нерашальнасці задання. За ўказанне хоць бы аднаго падманлівага следу налічваецца ачко, якое ўлічваецца пры размеркаванні месцаў пры роўнай колькасці набраных ачкоў. За правільнае рашэнне эцюда налічваецца 5 ачкоў.

Правілы афармлення рашэнняў традыцыйныя. Толькі ў пісьме-адказе трэба коратка прыводзіць рашэнне папярэдняга задання. Тэрмін прысылкі адказаў на заданні — 12 дзён з дня апублікавання. Запрашаем да ўдзелу ў новым конкурсе!

Пераможцы прэміруюцца літаратурай. У выпадку вялікай колькасці пераможцаў журы конкурсу пакідае за сабой права даць 2 дадатковыя заданні.

Адказы дасылайце на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, «Шахматы».

Заданне № 1.



Мат за 2 хады. (4+3).

Заданне № 2.



Мат за 2 хады. (5+3).

ШАХМАТНАЯ ПЕРЫЁДЫКА

Сярод шахматных часопісаў першае месца па праву займае «64—Шахматное обозрение», які нядаўна адзначыў сваё 40-годдзе. Часопіс разлічаны на шырокае кола чытачоў і таму на яго старонках можна адшукаць матэрыялы па ўсіх пытаннях развіцця шахмат. У ім прысутнічае тэарэтычны аддзел, аддзел кампазіцыі, шмат месца адводзіцца запісу партый, згуляных у буйных спаборніцтвах. Часопіс «64—ШО» распаўсюджваецца па падпісцы.

У Расіі выходзяць таксама часопісы па шахматнай кампазіцыі: «Шахматная композиция», «Задачи и этюды», «Уральский проблемист».

У Беларусі выходзіць часопіс «Шахматы», у якім асвятляецца мясцовае шахматнае жыццё. Ёсць шмат пазнавальнага матэрыялу. На яго прымаецца свабодная падпіска. Але вам на дапамогу можа прыйсці Леанід Уладзіміравіч Шацько. Ваш заказ на часопісы, а таксама на іншую шахматную літаратуру накіроўвайце на адрас: 220016, г. Мінск, а/с 150, Шацько Леаніду Уладзіміравічу.

СКАНВОРД + ЛАБІРЫНТ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Б	Е	Р	В	А	Л	І	А	Р	А	І				
К	А	Р	Я	Н	О	М	Г	М	Д	К				
І	Б	А	С	Я	І	П	П	О	Г	У				
Р	О	Ў	К	Д	Д	Э	Е	К	І	Л				
П	Е	К	Е	А	С	Л	А	П	Н	С				
П	Р	А	Т	Б	Т	Ь	Т	Л	А	Е				
Е	А	К	Л	О	А	Ё	Н	Г	Н	К				
Н	А	Л	А	Л	Д	Ы	Н	А	Н	У				
М	А	Ь	Д	З	Е	Г	Д	Б	Д	А				
А	Р	Ц	І	І	Б	Э	Н	О	Л	М				
Ф	О	Н	А	Н	Т	Р	Е	Р	Р	Е				

ЛАБІРЫНТ. Гэтым разам у лабірынце схаваліся словы на спартыўную тэматыку. У дужках пазначана колькасць літар у загаданых словах. Літары слятаюцца ў словы па гарызанталях (злева направа і справа налева) і па вертыкалях (зверху ўніз і знізу ўверх), але не па дыяганалях. Гэта традыцыйныя правілы. Адно слова ў якасці ўзору пазначана.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (15 ліпеня). Па гарызанталі: Слайд. Вакзал. Дуля. Мазь. Ост. Ігар. Пак. Нуда. Цяга. Пік. Руль. Арабіна. Вар. Якар. Рант. Жаба. Мастак. Пурга. Вандал. Парк. Камета. Гора. Алі. Статар. Гарт. Мараба. Урал. Гданьск. Акарына. **Па вертыкалі:** Лезгінка. Гапак. Адвал. Бур. Арка. Піва. Лоцман. Гліна. Макі. Дуда. Карма. Гарус. Узор. Самба. Арк. Вальс. Рыба. Туя. Ула. Квас. Барс. Яранга. Полька. Дот. Ангара. Былінка. Орт. Ларнетка.

Сканворд (23 ліпеня). Па гарызанталі: Гром. Цымбалы. Лось. Кіпа. Ікс. Край. Паж. Ідал. Здор. Юка. Улан. Арсенал. Аўт. Гало. Іней. Кола. Снягір. Мулат. Этапаж. Ірга. Аналой. Рота. Хан. Статар. Факт. Паркан. Зона. Базальт. Рахунак. **Па вертыкалі:** Мандаліна. Домра. Хамса. Луг. Алах. Юнак. Алупка. Рукаў. Стан. Малі. Алтын. Ферзь. Опій. Ягада. Кот. Цясак. Клан. Суд. Нар. Рэйс. Брук. Гітара. Прапан. Тот. Легата. Банджа. Рой. Жарнавік.

Сканворд (2 жніўня). Па гарызанталі: Барак. Хірург. Драп. Арол. Мяч. Штаб. Гіт. Ейск. Эдэм. Бум. Журы. Тэарэма. Рой. Гума. Аніс. Каса. Шар. Цішка. Акуліст. Рагу. Рапарт. Ёлка. Гуж. Пакт. Клубок. Лато. Тлум. Стаматолаг. **Па вертыкалі:** Тэрапеўт. Мацак. Ісламізм. Сіг. Ашуг. Бэра. Унікум. Трумо. Шарж. Кедр. Майка. Паулс. Ромб. «Рэпка». Бат. Хваля. Квота. Чад. Арат. Ком. Акт. Імжа. Галлё. Гарпун. Іл. Мінск. Педыятр. Час. Таганрог.

1. Комплексныя міжнародныя спаборніцтвы (9). **2.** Гарнальжны від спорту (5). **3.** Гімнастычны снарад; калісьці бум (7). **4.** Тое, што і ручны мяч (7). **5.** Ход 0-0-0 або 0-0 у шахматах (9). **6.** Від спорту для высакарослых (9). **7.** Сталіца сёлетняй Алімпіяды (5). **8.** Звышлёгкі лятальны апарат (10). **9.** Футбольныя вароты: ***, дзве стойкі і сетка (12). **10.** У лёгкай атлетыцы — адметны раздзел (3). **11.** Горад у Грэцыі, адкуль пайшоў бег на звышдалёкія дыстанцыі (7). **12.** Комплекснае спартыўнае збудаванне (7). **13.** Хранометр спартыўнага арбітра (10). **14.** Настаўнік, выхавацель спартсмена, каманды (6). **15.** Неалімпійскі від спорту (7). **16.** Адзіннаццаціметровы штрафны ўдар у футболе (8).

Інфарм-укол

Колькі гадоў у сапраўднасці?

Неабходна адрозніваць храналагічны ўзрост ад біялагічнага. Біялагічны не паказвае працягласці жыцця, а толькі інфармуе аб тым, як арганізм вытрымлівае жыццёвыя праграмы, закладзеныя ў ім генетычна. Праверым сябе.

Узрост скуры можна вызначыць так: вялікім і ўказальным пальцамі вазьміце скуру на тыльным баку далоні і адцягніце яе на 5 секунд. Калі сляды зашчамлення знікнуць за пяць ці меней секунд, то біялагічны ўзрост вашай скуры не перавышае 45 гадоў, за 6—15 — 60 гадоў, за 16—55 — 70. **Узрост вачэй**. Прачытайце газетны тэкст на максімальна блізкай ад вачэй адлегласці і памерайце яе лінейкай. Ва ўзросце 21 года пры адсутнасці паталогіі зроку чалавек можа чытаць газету на адлегласці 10 см ад вачэй, у 34 гады — 14 см, а да 60 гадоў гэта адлегласць павялічваецца да метра. **Хуткасць рэакцыі** правяраем так: станьце, выцягніце руку наперад, пальцы прамыя, далоні ўнутр. Партнёр размяшчае 40-сантыметровую лінейку паралельна вашай далоні на адлегласці 1-2 см, нулявая адзнака знаходзіцца на ўзроўні ніжняга краю далоні. Па камандзе «ўвага» партнёр на працягу 5 секунд павінен апусціць лінейку. Ваша задача як мага хутчэй сцісnуць пальцы ў кулак і затрымаць падзенне лінейкі. Біялагічны ўзрост вызначаецца па месцы перахвату лінейкі. Паказчык 12 см адпавядае ўзросту 20 гадоў, паказчык 25 см — 60. **Раўнавага** (работа вестыбулярнага апарата). Стойце як мага даўжэй басанож на адной назе, рукі ў бакі, вочы заплюшчаны. Калі вы прастаіце звыш 30 секунд, ваш арганізм яшчэ малады, а калі менш за 5 секунд, значыць, пасталеў.

Памятайце, што эмацыянальны фон і фізічны стан цесна звязаныя. Чалавек актыўны, бадзёры і жыццярадасны даўжэй захоўвае добрую фізічную форму. Песіміст, які пастаянна скардзіцца, можа прымусіць свой арганізм пасталець заўчасна. Станоўчыя эмоцыі спрыяльна ўздзейнічаюць на нервовую сістэму, а, значыць, і на арганізм у цэлым.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Вельмі не хочацца вас хваляваць, дарагія мае кулінары, але, калі вы не заўважылі, лета зноў заканчваецца! І так заўсёды — чакаеш яго ўвесь год, а ў жніўні разумееш, што яшчэ нават ні разу не купаўся. Таму давайце закінем усе клопаты і пагрэемся на сонейку дзе-небудзь каля рэчкі. А каля вады, як вядома, заўсёды апетыт з'яўляецца. Таму сёння будзем гатаваць закускі для пікніка.

ЧЫПСЫ ПАХОДНЫЯ

Ведаю, што чыпсы не самы карысны прадукт, таму выбірайце максімальна натуральныя. Дарэчы, глядзела перадачу «Кантрольная закупка», у якой незалежныя эксперты найбольш натуральнымі прызналі чыпсы «Lays».

Нам спатрэбіцца: вялікі пачак чыпсаў, 2 плаўленыя сыркі, 1 бляшанка шпротаў або шпротнага паштэту.

Дома прапусціце праз мясарубку плаўленыя сыркі і шпроты. Добра перамяшайце і атрыманую масу ўпакуйце ў баначку. На прыродзе застанецца толькі адкрыць пакет з чыпсамі і на кожны крючок выкласці па 1 чайнай лыжцы прыгатаванай сумесі. Паспрабуйце — гэта смачна, хутка і сытна!

КУРЫЦА Ў СЫРЫ

Мне прыйшлося гатаваць гэту страву ў 12 ночы, калі нечакана высветлілася, што праз 20 хвілін у нас госці! Атрымалася вельмі хутка і смачна. Па-мойму, вельмі падыдзе для вылазкі на прыроду.

Вазьміце: курынае філе, малако, 2 яйкі, цвёрды сыр, крухмал, паніровачныя сухары, соль і перац на смак.

Курынае філе крыху адбіце, пасаліце, паперчыце. (Я, карыстаючыся рэцэптам, папярэдне абсмажыла курыцу, але потым зразумела, што гэта было лішнім.) Для клеру ў місачцы змяшайце яйкі, цвёрды сыр, малако і дабаўце крухмал. Праўда, у мяне пад рукой не аказалася крухмалу, я замяніла яго мукой, і мая курыца атрымалася смачнай, але не хрумсткай. На патэльні разагрэйце алей. Кускі курыцы абмакніце ў сырнай сумесі, затым абкачайце ў паніровачных сухарах і абсмажце да залацістай скарынкі.

КАБАЧКОВАЯ ПІЦА

Прадоўжым эксперыменты з кабачкамі. Упэўнена, што ад гэтай стравы не застанецца ні аднаго кавалачка — спадабаецца ўсім!

Вазьміце: кабачок, 500 г мяснога фаршу, 200 г сыру, маянэз, соль, перац і зяленіва на смак.

Кабачок трэба ачысціць ад лупіны і нарэзаць нятоўстымі кольцамі. На бляху наліць крыху алею, выкласці кружочкі кабачкоў так, каб не было прасветаў паміж імі. На іх — мясны фарш, затым маянэз, а зверху ўсё пасыпаць дзёртым сырам і зяленівам. Запякаць у духоўцы дзесьці 25 хвілін, да той пары, пакуль кабачкі не стануць мяккімі.

Прыемнага апетыту, мае дарагія. І галоўнае, памятайце, што на прыродзе ўсё ж галоўнае не ежа, а кампанія!

Чытайце ў наступным нумары

«...НЕ ЧУВАЦЬ ТАМ ПРА АНГЛІЙСКІ ПАРЛАМЕНТ...»

Фізічная геаграфія тут выглядае наступным чынам: круглы зямны шар, на адным баку якога знаходзіцца Вестмінстэрскі палац і ўсё, што з ім, а на супрацьлеглым — Расоншчына. Пра гэта пісаў яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя Ян Баршчэўскі: «Калі хто, будучы ў гэтым краі, узышоў на вяршыню Пачаноўскай гары і глядзеў на дзікія ваколіцы, што ляжаць навокал, дык бачыў, як азёры тут і там, нібы люстэркі, адбіваюць дзённы прамень, а над іх берагамі дрэмлюць густыя лясы; ...але не ўбачыш тут нідзе гарадскіх муроў, ні вежаў старога замка. Там чалавек забывае пра спрэчкі французскай палаты ў справе Егіпта і Турцыі, не чуваць там пра англійскі парламент, ...не гамоняць там ні пра чыгункі, ні пра дзівосную вынаходку Дагера. І толькі голас пастушка, стрэл паляўнічага ў лесе або вецер, што гойсае ў вершалінах пушчы, парушаюць на хвіліну цішыню ваколіцы...»

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.38	20.51	15.13
Віцебск —	5.22	20.46	15.24
Магілёў —	5.28	20.41	15.13
Гомель —	5.30	20.32	15.02
Гродна —	5.54	21.06	15.12
Брэст —	6.00	21.01	15.01

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Анфісы, Марфы, Германа, Клімента, Мікалая, Навума, Панцеляймона, Савы.*

К. *Ірыны, Клары, Тэрэзы, Эдзіты, Рамана, Рамуальда.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +20..+22°С	КІЕЎ +24..+26°С	РЫГА +20..+22°С
ВІЛЬНЮС +21..+23°С	МАСКВА +23..+25°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С

Дзве даты

9 жніўня

Сёння — Міжнародны дзень карэнных народаў свету.

1944 год — распачаў працу Мінскі аўтазборачны завод, на базе якога затым быў утвораны Мінскі аўтамабільны завод (МАЗ).

480 год да н.э. — 300 спартанцаў спынілі персідскую армію каля Фермапіл (гэта адлюстравана ў галівудскім фільме «300 спартанцаў»).

Цытата дня:

«Не трэба скардзіцца, што твае мары не збыліся; заслугоўвае жалю толькі той, хто ніколі не марыў».

Марыя Эбнер-Эшэнбах (1830—1916), аўстрыйская пісьменніца.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Пяцірог

У блакітным полі залатая пяцікутная пентаграма (зорка цара Саламона). На ёй — срэбная лілея.

Герб роду Малінскіх.

Лукач

У блакітным полі чырвоны мур, перад ім паўдзіка з двума залатымі каласамі ў пашчы.

Герб роду Лунеўскіх.

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

СУБОТА

Назва гэтага дня паходзіць са старажытнаіудзейскай мовы, у якой sabbat — заканчэнне нейкай справы, працы (шабаш). У Старым запавеце аб гэтым дні сказана, што гэта дзень адпачынку ад розных спраў. Вельмі часта адбываецца блытаніна ў разуменні структуры старажытнаіудзейскага і еўрапейскага хрысціянізаванага тыдня. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што ў славянскім календары тыдзень пачынаўся з нядзелі, таму што субота лічылася днём адпачынку. Насамрэч, у славян з часоў распаўсюджання хрысціянства ролю старазапаветнай суботы выконвала новазапаветная нядзеля — дзень уваскрэшання Ісуса Хрыста.

● Знаёмства са структурай беларускага народнага календара паказвае, што субота была днём незвычайным у плане сакральна-магічнага напаўнення. У гэты дзень нашы продкі быццам бы па спецыяльным інфармацыйным канале дакраналіся да шматлікіх таямніц Сусвету, наладжвалі кантакты з душамі памерлых свякоў, звярталіся да іх з просьбай аб добрым ураджаі ці шчаслівай долі маладых, якія бралі шлюб. З цягам часу ў народным календары на працягу ўсяго года з'явіліся адпаведныя суботы, якія лічацца днямі памяці і ўшанавання продкаў. У беларускім асяродку такія дні сталі звацца «Дзядамі», ці «радзіцельскімі суботамі».

● «Суботні» рытуальны дыялог з продкамі ўплываў на некаторыя абрадавыя кантэксты ў культуры беларусаў. Таму ў «радзіцельскія суботы» не праводзяць вянчанне ў праваслаўных храмах.

● У славянскай народнай традыцыі субота лічыцца жаночым днём, якому адпавядае лік 6. Народная свядомасць ставіцца да яго як да добрага, «лёгкага», спрыяльнага дня, можа, таму, што напярадзе яшчэ адзін дзень адпачынку.

● У суботу звычайна прыбіраюцца ў хаце, на гаспадарчым падворку.

● Субота лічыцца спрыяльным днём для ад'езду ў далёкі шлях.

● У той жа час народная традыцыя папярэджвае: не пачынайце ў суботу адказныя справы, асабліва будаўніцтва — нічога даднага не атрымаецца. У гэты дзень можна было толькі закласці падмурак новай, будучай хаты.

● Калі тканіна была вытката ў суботу, то адзенне з яе шылі толькі для дарослых. Дзіцяці насіць адзенне з яе катэгарычна забаранялася.

● Нашы продкі былі перакананыя: калі дзіця нарадзілася ў суботу, яно будзе лекарам, знахаром, а таксама будзе бачыць з'яўленне духаў сваіх продкаў.

● **Народжаныя ў суботу — меланхалічныя, крыху адасобленыя людзі. А калі злуюцца, дык пасля затухання гневу імкнуцца як мага хутчэй папрасіць прабачэння. Яны не супраць пажыць за чужы кошт, лічаць сябе вельмі разумнымі, і калі дазволяць каму-небудзь даць сабе параду, дык усё роўна яе ніколі не выкарыстаюць. Да сталага веку яны выглядаюць стройнымі, не любяць упрыгожвацца, адрозніваюцца старамодным адзеннем, бо лічаць, што не ў адзенні шчасце.**



Усміхнёмся!

Прадаецца піяніна «Элегія», б/к. На накрыўцы невялікая расколіна ад сякеры.

☺

— Не, усё ж у наш час музыка была больш меладычная...

— Бабуля, гэта міксер!



Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Шалі могуць заняцца філасофіяй, а Авены змяніць месца жыхарства

ВАЕН. Верагодны перамены, якія станоўча паўплываюць на многія галіны вашай дзейнасці. Магчымы нават пераезд на новае месца жыхарства, які будзе выкліканы новымі прафесійнымі абавязацельствамі. У пятніцу добра разабраць непатрэбныя рэчы і выкінуць хлам, які раздражняе. Вы адразу адчуеце сябе лепей. Добры дзень для ачышчэння ад усяго лішняга, таго, што аджыло.

ЦЯЛЕЦ. Не варта выказваць свае прэтэнзіі навакольным. Ваш поспех залежыць, у першую чаргу, ад вашай дыпламатычнасці. Грандыёзныя планы на гэты тыдзень не варта будаваць — яны могуць не здзейсніцца. Аднак праяўляць актыўнасць не толькі не шкодна, але і вельмі пажадана. Блізкія людзі могуць звярнацца да вас па параду. Пастарайцеся быць больш прадбачлівымі — ёсць шанц паўтарыць памылкі, якія ўжо былі аднойчы зроблены.

БЛІЗНЯТЫ. Літаральна з першых дзён тыдня з'явіцца шанц сацыяльнага росту. Зарука поспеху — у выкарыстанні асабістых і дзелавых сувязяў. Гэты час запомніцца мноствам сустрэч і цікавымі знаёмствамі. Не адкладвайце вырашэнне асабістых праблем у доўгую скрыню. У аўторак могуць здзейсніцца самыя смелыя мары, у гэты дзень добра складаць планы і разглядаць шляхі іх рэалізацыі.

РАК. Цудоўны настрой, добрае самаадчуванне і ўпэўненасць у сваіх сілах могуць стаць фонам тыдня. У панядзелак можа падвесці сувязь — і сустрэча адкладзецца на нявызначаны перыяд. У аўторак не хапайцеся за шмат заняткаў адначасова, а лепш выберыце галоўнае і давядзіце да канца. У сераду праявіце кемлівасць у адстойванні свайго меркавання — і тады, як па ўзмаху чароўнай палачкі, з'явіцца ўсё неабходнае для імклівага руху вашага бізнэсу.

ЛЕЎ. У пачатку тыдня пастарайцеся не выступаць з ідэямі і прапановамі. Калі вырашыце выдзеліцца такім чынам, вас могуць няправільна зразумець. Не варта ствараць сабе лішніх праблем. Бліжэй да канца тыдня выказаць свае прэтэнзіі могуць дзеці: і чым яны старэйшыя, тым больш прэтэнзій у іх будзе. Давядзецца перагледзець некаторыя свае прынцыпы і змяніць успрыманне рэчаіснасці.

ДЗЕВА. Давядзецца шмат увагі надаваць навакольным людзям. Калі захочацца вострых адчуванняў, давядзецца пачакаць — гэты тыдзень наўрад ці падыходзіць для такіх эксперыментаў. Цікавыя ініцыятыўныя прапановы могуць зыходзіць ад партнёраў па бізнэсе. У аўторак можна будаваць планы на самую блізкую будучыню. У суботу абавязаны парадаваць сваіх блізкіх, інакш крыўды і раздражненне могуць абрушыцца на вас у нядзелю раніцай.

ШАЛІ. Не варта рабіць лішніх рухаў. Мітусня толькі стоміць, спакой жа дапаможа ў многім разабрацца. Паберажыце здароўе, але не расслабляйцеся зусім. У сераду не здзіўляйцеся думкам філасофскага характару — гэта дзень для роздумаў і духоўнага росту. У пятніцу магчымыя не па вашай віне невялікія праблемы ў адносінах з дзелавымі партнёрамі. Дачакайцеся, пакуль страсці ўлягуцца, і вазьміце ініцыятыву ў свае рукі.

СКАРПІЁН. Пастарайцеся скласці план дзеянняў і арыентуйцеся па ім, інакш патонеце ў шматлікіх занятках і клопатах. У панядзелак праявіце разумную асцярожнасць, не давайце нагоды для плётак зайздросным калегам. У сярэдзіне тыдня давядзецца прысвяціць працы шмат сілаў і часу, нягледзячы на ўнутранае супраціўленне. Памятайце, што перагружаць сябе таксама не варта. У пятніцу давядзіце пачатае да канца — гэта таго варта.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень праляціць нібы ў калейдаскопе. У панядзелак і аўторак збярыцеся з сіламі для новай працы ў сераду. Калі штосьці не будзе атрымлівацца, пастарайцеся не ісці напралом — адкладзіце на некалькі дзён. Чым менш вы будзеце гаварыць пра свае планы і намеры, тым хутчэй яны здзейсняцца. Пастарайцеся не сварыцца з блізкімі з-за дробязяў — гэта не прынясе нічога добрага.

КАЗЯРОГ. Каб дабіцца жаданага выніку, вам неабходна праяўляць ініцыятыву, уносіць творчыя прапановы, захоўваць узаемаразуменне з калегамі. Думкі, што вас недастаткова цэняць, лепш гнаць адразу, перш чым за іх стане соромна. Не адмаўляйцеся ад дапамогі сяброў пры абдумванні планаў на будучыню. У выхадныя дазвольце сабе маленькія слабасці.

ВАДАЛЕЙ. Праца ўвойдзе ў больш спакойны выток, хоць бурныя ўсплёскі мінулага могуць яшчэ напомніць пра сябе. У аўторак давядзецца актыўна адстойваць свае інтарэсы. Праяўляючы сілу волі, з дапамогай мэтанакіраванасці і ўпартасці зможаце даказаць навакольным сваё права на самастойнасць і незалежнасць. У чацвер прытрымайце свае эмоцыі і зменшыце амбіцыі, інакш можаце наламаць дроў.

РЫБЫ. Варта больш давяраць сваім прадчуванням і інтуіцыі. Вырашальнае значэнне для руху наперад, да мэты, адыграе інфармацыя. Толькі абавязкова ўпэўніцеся ў яе праўдзівасці. У аўторак можа ўзнікнуць сітуацыя, калі давядзецца займацца некалькімі заняткамі адначасова. Вынікі гэтых намаганняў адчуеце на наступным тыдні — і яны вас парадуюць. Выкарыстоўвайце кожную магчымасць правесці больш часу дома і зрабіць неабходныя набыткі для сям'і.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4307. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12